Людзьмі звацца! —
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 21 верасня 1990 г. № 38 (3552) ● Цана 10 кап.

У абліччы маэстра — вечная загадка. Загадка творчай асобы. Загадка чалавечага духу, пародненага з Музыкай — вялікім светам, які ўбірае ў сябе і зямную крэўную песню народа, і малітву яго, спевамі ўзнесеную да Бога...

Маэстра Роўду ведаюць далёка за межамі роднага краю. Голас ягонага хору — хору Дзяржтэлерадыё БССР аздабляе і музычныя фестывалі, і вялікія народныя святы, і будзённыя праграмы эфіру. Нядаўна завершана грунтоўная праца — запісана «Анталогія беларускай народнай песні» са збору Рыгора Шырмы. А хор зноў у радыёстудыі: рыхтуюцца новыя запісы шэдэўраў духоўнай музыкі, твораў сусветнай класікі, лепшых навінак беларускіх кампазітараў.

Днямі прафесару Віктару Роўду нададзена званне народнага артыста СССР. Шчыра віншуем маэстра з высокай — і даўно заслужанай! — адзнакай.

Інтэрв'ю ў нумар

Як вядома, на мінулай сесіі Вярхоўнага Савета БССР разам з іншымі пастаяннымі і часовымі парламенцкімі структурамі была ўтворана Канстытуцыйная камісія — для выпрацоўкі новага Асноўнага закона рэспублікі. Зараз вызначаецца агульная канцэпцыя і структура Канстытуцыі. Можна меркаваць, што на разгляд II-й сесіі, якая неўзабаве адкрыецца, будуць вынесены альтэрнатыўныя падыходы, бо на дадзеным этапе з ліку членаў камісіі створаны і самастойна працуюць дзве падкамісіі. Адну ўзначальвае намеснік Старшыні Вярхоўнага Савета Васіль Шаладонаў, другую — дэпутат Віктар Ганчар.

Вось што расказаў В. ГАНЧАР у гутарцы з парламенцкім карэспандэнтам «ЛіМа»:

ХТО ПІША КАНСТЫТУЦЫЮ

— Мы толькі распачалі сваю працу. Дзеля найбольш плённай і эфектыўнай дзейнасці з ліку дэпутатаў — членаў нашай падкамісіі вылучана пастаянная рабочая група. Апрача мяне, у яе ўваходзяць Анатоль Вярцінскі, Яўген Глушкевіч, Валянцін Голубеў, Генадзь Грушавы, Уладзімір Заблоцкі, Леанід Зданевіч, Віктар Какоўка, Мікалай Крыжаноўскі, Аляксандр Лукашэнка, Уладзімір Новік, Зянон Пазняк і Мікалай Тоўсцік. Атрымаўся калектыў аднадумцаў, таму сёння я ўжо магу казаць пра некаторыя асноўныя падыходы, якімі мы будзем кіравацца пры напісанні Канстытуцыі.

Дык вось, мы зыходзім з таго, што новая Канстытуцыя суверэннай рэспублікі павінна быць: па-першае — цалкам дэідэалагізаваная, па-другое — стабільным актам доўгатэрміновага дзеяння, што называецца, на стагоддзі, па-трэцяе — кампактная, вольная ад залішняй канкрэтыкі. Што датычыць пераходнага перыяду, неабходнасць якога абавязкова ўзнікне, то яго забяспечаць уключаныя ў тэкст Канстытуцыі пераходныя і заключныя палажэнні.

— Пытанне ў духу сённяшніх спрэчак. Які грамадскі лад будзе замацоўваць Асноўны закон, над якім вы працуеце?

— Для нас не існуе такога пытання. Мы лічым, што любая канстытуцыя павінна ствараць прававыя асновы такой грамадзянскай супольнасці, дзе былі б поўнасцю забяспечаны правы і інтарэсы асобы. Таму Канстытуцыя ўвогуле не павінна ўтрымліваць указання на характар ладу. Задача гэтага акту — замацаваць асновы дагавору паміж асобай, грамадствам і дзяржавай. Мы ставім перад сабой задачу ўпершыню сцвердзіць суверэнітэт асобы. Гэта — наш вызначальны, канцэптуальны падыход.

— Іншымі словамі, на пытанне пра дзяржаўны лад вы адказваеце — «канстытуцыйны»?

— І толькі так. Увогуле мы мяркуем, што Канстытуцыя, якая гарманізуе адносіны ў ланцугу «асоба — грамадства — дзяржава», паслужыць таксама і асновай для кансалідацыі нашага грамадства, што зараз надзвычай важна.

— У сваёй працы вы грунтуецеся на Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце рэспублікі?

— Безумоўна. Ці не самае галоўнае сёння—пераадолець прававы нігілізм і стварыць трывалыя прававыя асновы для ажыццяўлення ўсіх пераўтварэнняў. Вось чаму мы цвёрда кіруемся палажэннямі Дэкларацыі. Магу, напрыклад, сказаць, што першым раздзелам будучай Канстытуцыі рэспублікі будзе раздзел «Аб суверэнітэце». У прапанаванай намі структуры Асноўнага закона прадугледжваюцца таксама раздзелы «Грамадзянства. Асноўныя правы, свабоды і абавязкі грамадзян», «Асновы дзяржаўнага ладу», «Узброеныя сілы», «Фінансавая сістэма і бюджэт», «Адукацыя і культура», «Адносіны з іншымі дзяржавамі» і іншыя.

— У чым сутнасць пераходнага перыяду і пераходных палажэнняў Канстытуцыі, пра якія вы згадвалі?

— У першую чаргу пераходны перыяд датычыць кардыны-

(Працяг на стар. 2).

РЭПЛІКА

Гадзіннік з зязюляй

Чым адрозніваюцца гадзіннікі «Сэйка» і «Луч»? Тым, апроч усяго іншага, што на японскай фірме няма, а на Мінскім гадзіннікавым заводзе ёсць партком. Ён і вырабляе такую неабходную для айчынных хранометраў дэталь, як газета «Мы и время» — пад дэвізам «Сторонники коммунистического пути, объединяйтесь!» Такім чынам, тэхналагічны працэс плюс яго ідэалагічнае забеспячэнне, а ў выніку атрымліваецца гэткі «гадзіннік з зязюляй», які гучна абвяшчае, што з адзіна правільнага шляху мы збочылі.

Матыў гэты — асноўны на старонках «Мы и время». У прыватнасці, у № 3 штомесячніка «Капіталістычнай Рэстаўрацыяй» чытача палохае дэлегат XXVIII з'езда КПСС В. Чыкін... «Ответственный работник КГБ СССР» — інкогніта, але «по убеждениям — коммунист» — таксама страшыць, у гутарцы з карэспандэнтам газеты зваліўшы ў кучу ізраільскую разведку «Масад», ЦРУ, радыёстанцыю «Свабода», «Московские новости», «ЛіМ» і «отдельные публикации «Чырвонай змены» і «Знамени юности»... Ад старонкі да старонкі (добра, што іх усяго восем) нагнятаецца істэрыя: вось лідэр амерыканскіх камуністаў Гэс Хол выкрывае «палітычнага ашуканца» Барыса Ельцына, вось нехта «Одинец и другие, всего семь подписей» заклікае распачаць кампанію, каб пазбавіць дэпутацкіх паўнамоцтваў Зянона Пазняка... І, нарэшце, лямант: «От имени наших читателей мы обращаемся к народным депутатам Верховного Совета БССР. К тем, в ком жива совесть и честь, патриотизм и любовь к своему народу, кто ещё слышит скорбные звоны Хатыни. З. Позняк, лидер БНФ, и А. Вертинский, редактор «ЛіМа», должны ответить перед народом за надругательство над памятью всех погибших в огне Великой Отечественной войны патриотов, лучших сыновей и дочерей Белоруссии. Фашизм не пройдёт!»

Тут ужо не да ўшчуванняў: маўляў, зусім распераваліся калегі. Вунь куды занесла «сторонников коммунистического пути» з гадзіннікавага завода!

Як на маю думку, дык гэта — агонія.

А. ГАНЧАРОЎ.

ХТО ПІША КАНСТЫТУЦЫЮ?

(Пачатак на стар. 1).

нальнай рэарганізацыі эканамічных адносін, ад цяперашняй эканомікі — да рынкавай. Адпаведна ўзнікае неабходнасць пераходных палажэнняў Канстытуцыі, якія тычыліся б дзяржаўнага ладу. Напрыклад, сёння я не магу адназначна сказаць, будзе ў нас аднапалатны парламент ці двухпалатны, у якім выглядзе будзе існаваць кантрольная ўлада — Канстытуцыйны суд, Канстытуцыйны савет ці Камітэт канстытуцыйнага нагляду, ці будзе ў нас інстытут прэзідэнцкай улады... Але відавочна, што для ўвядзення новых элементаў у структуру дзяржаўнай улады спатрэбіцца пераходны перыяд, вызначаны адпаведнымі палажэннямі закона. І важна на працягу гэтага перыяду забяспечыць значны ўздым культуры насельніцтва, каб адносіны да Канстытуцыі былі святымі. Што, уласна, характарызуе грамадзяніна кожнай цывілізаванай краіны, прававой дзяржавы.

— Наколькі працяглым можа быць гэты пераходны перыяд?

— Наша група не ставіць перад сабой задачу вызначыць яго межы. Гэта і не магчыма. Мы гарантуем толькі стварэнне стабільнага Асноўнага закона і не будзем арыентавацца на палітычныя ці ідэалагічныя ўстаноўкі. Група зыходзіць з прыроды чалавека, замацавання яго натуральных правоў, а таксама з паслядоўнага раздзялення ўлад — заканадаўчай, выканаўчай і судовай. Гэтыя два прынцыпы павінны забяспечыць стабільны характар дзеяння будучай Канстытуцыі. А ўжо з улікам канкрэтных абставін будзе вырашацца пытанне аб тэрмінах дзеяння тых ці іншых пераходных палажэнняў.

— Але ж ці магчыма заканадаўцам захоўваць алімпійскі спакой ва ўмовах абвостранай палітычнай кан'юнктуры і непрадказальнасці развіцця сітуацыі ў грамадстве?

— На гэта я магу адказаць, што ўсе рэальныя канстытуцыі былі створаны менавіта ў надзвычай бурныя часы. Класічны прыклад — Канстытуцыя Злучаных Штатаў Амерыкі. Нам таксама па сілах стварыць стабільны дакумент, каб праз нейкі час не перакройваць яго. Дарэчы будзе сказаць, што намі будзе ўлічаны і наш гістарычны вопыт палітыка-прававой нацыянальнай думкі, у прыватнасці, Статут Вялікага княства Літоўскага.

Мы вельмі абмежаваны ў тэрмінах. Свае зыходныя прынцыпы па стварэнні Канстытуцыі група мяркуе прапанаваць на зацвярджэнне бліжэйшай сесіі Вярхоўнага Савета. Марудзіць нам нельга, бо трэба закласці сістэмную аснову ўсёй заканатворчасці. Без стабільнай прававой базы мы ў сваіх рэформах не рушым наперад ні кроку.

— Магчыма, апошнім сваім пытаннем я забягу, што называецца, паперадзе прагрэсу... Але ўявім, што ў нас ужо ёсць канчатковы тэкст новай беларускай Канстытуцыі. Якім чынам вы мяркуеце ўводзіць яе ў дзеянне?

— Наша група падзяляе ў гэтым пытанні пазіцыю Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета РСФСР і лічыць, што для зацвярджэння новага Асноўнага закона павінна быць склікана спецыяльная Канстытуцыйная асамблея. Альбо другі падыход — распрацаваць закон аб рэферэндуме і вынесці Канстытуцыю на яго.

А. ГАНЧАРОЎ.

КОЛЬКІ КАШТУЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ГОДНАСЦЬ?

Карэспандэнт «ЛіМа» гутарыць з народным дэпутатам Беларускай ССР, намеснікам старшыні пастаяннай Камісіі Вярхоўнага Савета па пытаннях галоснасці, сродкаў масавай інфармацыі і правоў чалавека, членам Канстытуцыйнай камісіі Вярхоўнага Савета Анатолем ВЯРЦІНСКІМ

— Анатоль Ільіч, вось вы і пакінулі «ЛіМ»...

— На жаль... Але толькі як галоўны рэдактар, а не як член рэдакцыйнай калегіі, не як аўтар. Ды і мае новыя службовыя абавязкі будуць звязваць мяне, мяркую, з газетай.

— З якім настроем пакідаеце? З якім пачуццём?

— Са змешаным пачуццём.

— Яно і зразумела... Скончыўся цэлы перыяд у вашым жыцці, як, дарэчы, і жыцці газеты, яе калектыву. Што для вас азначае гэты крок?

— Што датычыць «перыяду», то я мог бы тут прывесці вядомы біблейскі выраз, які ў перафразіраваным выглядзе гучыць так: а за адным перыядам пачынаецца новы перыяд. Наконт «кроку»... На першым, арганізацыйным пасяджэнні нашай дэпутацкай камісіі яе члены — па прапанове Уладзіміра Кавалёнка — выказаліся за тое, каб я быў адным з яе кіраўнікоў, працаваў у ёй на пастаяннай аснове. Яшчэ адным, унутраным, матывам было маё непрыняцце стаўшага ледзь не парадыйным статуснага палажэння: «Дэпутат ажыццяўляе свае паўнамоцтвы, **як правіла,** не парываючы з вытворчай або службовай дзейнасцю». Я — за сапраўдны, рэальны, а не паказны, фіктыўны, «ліпавы» Вярхоўны Савет рэспублікі, за сапраўдны, г. зн. рабочы, дзеяздольны, кампетэнтны нацыянальны парламент. Пра гэта я гаварыў у сваёй перадвыбарчай праграме. Такім чынам, давялося ахвяраваць, так бы мовіць, пасадай галоўнага рэдактара. Прытым гэта той выпадак, калі логіка нашых слоў і рашэнняў супадае з логікай падзей, логікай самога жыцця. Кліча, патрабуе свайго палітыка. А яна — тая кабета, з якой жарты дрэнныя... Як ты думаеш, якія паперы, якая літаратура зараз займаюць мой рабочы стол?

— Паўна, звязаныя з новай працай?

— Па адзін бок — матэрыялы, неабходныя для працы ў камісіі, для яе заканатворчай і кантрольнай дзейнасці. Тут і латвійскі варыянт Закона аб друку (камісіі прадстаіць тэрміновая падрыхтоўка рэспубліканскага Закона аб друку і сродках масавай інфармацыі; магчыма, ён будзе называцца інакш), і экземпляры некаторых нашых новых выданняў з новымі, часам экзатычнымі назвамі («Свабода», «Парадокс», «Ласковый май» і інш.), і старое Палажэнне аб тэлеграфным агенцтве рэспублікі пры Саўміне БССР (БЕЛТА). Па другі бок — тэкст нашай першай Канстытуцыі, прынятай 11 красавіка 1927 г. і падпісанай старшынёй VIII Усебеларускага з'езда Саветаў А. Чарвяковым і сакратаром з'езда З. Чарнушэвічам, ксеракопіі канстытуцый ЗША і шэрагу заходнееўрапейскіх краін, сахараўская канстытуцыя, Усеагульная дэкларацыя правоў чалавека, Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзяніна 1789 г. Справа ў тым, што я яшчэ з'яўляюся членам Канстытуцыйнай камісіі, створанай Вярхоўным Саветам, уваходжу ў склад рабочай групы, якую ўзначальвае вядомы ўжо ў рэспубліцы малады парламентарый, кандыдат юрыдычных навук Віктар Ганчар, і перад якой стаіць задача ў сціслыя тэрміны падрыхтаваць свой праект Асноўнага закона рэспублікі. Адсюль і адпаведная «штудыя», патрэба ў вывучэнні міжнароднага канстытуцыйнага вопыту, розных — для асэнсавання і параўнання — канстытуцыйных ідэй, тэкстаў дэкларацый... Дарэчы, стаўшы сёння ў нас ходкім, папулярным тэзіс «Што не забаронена, тое дазволена» быў сфармуляваны ўпершыню дзвесце гадоў таму назад у артыкуле 5 Дэкларацыі правоў чалавека і грамадзяніна 1789 г. Вось як ён гучыць: «Закон мае права забараняць толькі дзеянні, шкодныя для грамадства. Усё, што не забаронена законам, тое дазволена і ніхто не можа быць прымушаны рабіць тое, што не прадпісана законам»...

— Актуальна гучыць.

— Так. Актуальнымі і павучальнымі з'яўляюцца для нас і многія іншыя артыкулы канстытуцый заходнееўрапейскіх і скандынаўскіх краін, у прыватнасці тыя, якія прысвечаны грамадзянскім правам і свабодам, свабодзе думкі, слова, друку, сумлення.

— Карысна знаёміцца з чужымі канстытуцыямі?

— На паверку, пры бліжэйшым, што называецца, разглядзе, высвятляецца, што не такія яны ўжо і чужыя. Чытаеш іх і пераконваешся ўвачавідкі, што агульначалавечыя каштоўнасці — гэта не выдумкі «абстрактных гуманістаў», не добрыя пажаданні «пацыфістаў», не утопія, а рэальнасць.

Але, прадоўжу, паколькі мы ўжо загаварылі пра канстытуцыі — пра нашу, будучую, і чужыя, — падзялюся яшчэ адным сваім, глыбока вынашаным меркаваннем. Удакладню, што на маім рабочым стале, пасярод яго, занялі месца і «Статут Вялікага княства Літоўскага 1588», і кнігі «Францыск Скарына. Зборнік дакументаў і матэрыялаў», «Францыск Скарына. Творы», і часопіс з публікацыяй «Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя. Яе мэты і задачы», і «Устаўныя Граматы да народаў Беларусі», і «Асновы дзяржаўнасці Беларусі» Доўнар-Запольскага... Як наваспечаны, можа, заканадаўца я лічу — пра гэта гаварылася і на апошнім пасяджэнні рабочай групы, — што ў працэсе стварэння нашага Асноўнага Закона (як, дарэчы, і іншых жыццёва важных законаў) павінны абавязкова ўлічвацца набыткі нашай нацыянальнай палітыка-прававой думкі, традыцыі нашай векавой заканатворчай культуры. Мае рацыю філосаф С. Падокшын, які нядаўна ў сваім артыкуле «Тры ўрокі Скарыны», які быў змешчаны ў газеце «Звязда» і ў якім размова ідзе пра шляхі развіцця і ўсталявання на Беларусі ідэі свабоды, канцэпцыі прававой дзяржавы, — з захапленнем усклікае: «З такімі ідэямі — хоць на бліжэйшую сесію Вярхоўнага Савета Беларускай ССР!»

— Відаць, вы ўзбройваецеся ідэямі, рыхтуючыся да наступнай і другіх сесій Вярхоўнага Савета. І тут узнікае, Анатоль Ільіч, такое пытанне. Калі меркаваць па друку і па размовах, то парламенту рэспублікі дастаецца і «справа» і «злева», і «зверху» і «знізу». На старонках «Советской Белоруссии» разгарнулася аж цэлая дыскусія — на самых відных палосах, з працягам, з заклікам: «Пішыце, маўляў, нам хутчэй і больш, дарагія чытачы! Ёсць аб'ект для вашай крытычнай увагі!»

— Дыскусію распачаў эксміністр фінансаў, заслужаны эканаміст, як ён падпісаўся, Б. І. Шаціла. «Сколько стоит власть?»—так называецца яго артыкул. Наш учарашні фінансіст нумар адзін па пасадзе і заслужаны эканаміст рэспублікі па званні са стараннем і скрупулёзнасцю, вартымі, здаецца, лепшага прымянення, падлічыў літаральна ўсё: колькі каштуюць альтэрнатыўныя выбары, колькі каштуе тэле- і радыётрансляцыя сесіі, колькі каштуе матэрыяльнае забеспячэнне дэпутацкай дзейнасці... Падлічыў і прыйшоў, здаецца, да высновы, якая неяк не стасуецца са статусам нядаўняга члена ўрада: непатрэбныя нам, не вартыя такіх грошай такія (чытай: дэмакратычныя, на альтэрнатыўнай аснове) выбары, непатрэбныя нам, не вартыя такіх выдаткаў дэмакратычна выбраныя Саветы, у прыватнасці, Вярхоўны Савет. Я магу па-свойму зразумець афарбаваную ў настальгічныя таны пазіцыю былога міністра фінансаў. Сапраўды, выбары раней амаль нічога не каштавалі, бо іх, па сутнасці, і не было як такіх (дэпутаты, як вядома, назначаліся). Сесіі збіраліся таксама для праформы, для блізіру, збіраліся ўсяго на якіх-небудзь два-тры дні і аднагалосна «прымалі» падрыхтаваныя апаратам (у тым ліку і Мінфінам) рашэнні і акты, у прыватнасці, дружна, без якіх-небудзь прыдзірак і заўваг зацвярджалі чарговы гадавы бюджэт. Адпаведныя былі і выдаткі — на гасцініцу, на буфет, на сувеніры. А тут... Тут нешта іншае, нязвыклае...

Так, я магу ў нейкім сэнсе зразумець настальгію Баляслава Іосіфавіча. Але ў мяне ўсё ж ёсць да яго пытанні. Першае. Я нешта не памятаю, каб былы міністр фінансаў праяўляў раней, скажам так, габсекаўскія схільнасці і выступаў публічна за эканомію народнай капейкі. Не, ён моўчкі фінансаваў будаўніцтва і ўтрыманне так званых «охотничьих угодий» і «запаведнікаў», існаванне ўсемагчымых «спец», даволі шчодрае забеспячэнне шматлікага, розных рангаў, чыноўніцтва прасторнымі кабінетамі, персанальнымі машынамі і «сталамі заказаў»: ён не шкадаваў грошай для будаўніцтва шыкоўных адміністрацыйных будынкаў, для рэалізацыі малакарысных, а то і шкодных

На Белай дачы спявае «Скарыначка»

У мінулую суботу, апоўдні, зноў было людна ля так званай Белай дачы ў Мінску, дзе знаходзіцца Цэнтр беларускага фальклору. Тут паказвалі сваё майстэрства ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці з калгаса-камбіната імя М. Урыцкага Гомельскага раёна: выступаў фальклорны калектыў «Скарыначка» з вёскі Крупец. «Скарыначка», якой споўнілася ўсяго пяць гадоў, карыстаецца заслужаным поспехам не толькі ў аднавяскоўцаў.

— Мы, — расказвае кіраўнік калектыву **В. Кавалёў,** — выконваем толькі свае песні, што бытуюць у нашых мясцінах. Ходзім па хатах з магнітафонам, запісваем іх ад старых людзей, а потым развучваем. Сёння «Скарыначка» — гэта дваццаць чалавек, улюбёных у беларускую народную творчасць. Выступалі мы ў Маскве на Міжнародным фальклорным фестывалі скандынаўскіх краін, запісваліся на Беларускім і Гомельскім тэлебачанні. На Белай дачы — другі раз. Праўда, гэты раз не проста выязджаем, а выступаем-запрашаем усіх добрых людзей сюды, пад засень дрэў, у гэтую хату, дзе працуюць-шчыруюць знаўцы і зберагальнікі народнага мастацтва.

Менавіта ў суботу 15 верасня Цэнтр беларускага фальклору ўпершыню расчыніў свае дзверы для ўсіх жадаючых. Запрасіў тых, хто хоча пазнаёміцца з вуснапаэтычнай творчасцю народа, з народнымі промысламі, творчасцю выдатных майстроў, традыцыямі, што зберагаюцца і перадаюцца з пакалення ў пакаленне: прапанаваў свае паслугі тым, хто сам жадае паспрабаваць сябе ў пэўным жанры народнай творчасці. Працаваць з імі падахвоціліся супрацоўнікі навукова-даследчай мастацкай эксперыментальнай лабараторыі Міністэрства мясцовай прамысловасці БССР, з якімі Рэспубліканскі навукова-метадычны цэнтр заключыў дагавор.

Аб планах работы на бліжэйшы час нам расказала загадчыца аддзела мастацтвазнаўства лабараторыі **В. Лабачэўская:**

— Праграма па прапагандзе традыцый беларускіх народных рамёстваў будзе ажыццяўляцца намі на дагаворных пачат-

меліярацыйных і іншых ведамасных праграм і праектаў, для рэзкага павышэння зарплаты партыйным і савецкім работнікам (не выказаў абурэння ў дадзеным выпадку наш паважаны Баляслаў Іосіфавіч). Ён не шкадаваў асабліва сродкаў, не пратэставаў... Ну, ды хопіць. Тым больш, што ў адным выпадку шаноўны міністр Шаціла быў усё-такі скупендай, праяўляў прафесійную цвёрдасць. Гэта тады, калі заходзіла размова пра выдаткі на нацыянальную культуру; на рэстаўрацыю помнікаў, на развіццё тэатра і ўмацаванне матэрыяльнай базы рэдакцый і ўстаноў культуры, на стварэнне новых музеяў, на практычную рэалізацыю Закона аб мовах... Тут Баляслаў Іосіфавіч раскашэльваўся вельмі неахвотна, абмяжоўваўся, як вядома, адным няпоўным працэнтам. Даваў, пэўна, аб сабе знаць наш беларускі сіндром, сутнасць якога можна выказаць словамі: нічога не варта яно, усё наша, беларускае, нацыянальнае, а калі і варта, дык хіба што гроша меднага.

Думаю, не памылюся, калі скажу, што гэты сіндром праявіўся і ў артыкуле Б. І. Шаціны, у яго спробе ацэньваць у рублях кошт нацыянальнага парламента.

— Не ўсё рублямі вымяраецца. Калі нават рубель канвертуемы...

— Вось іменна. Ёсць рэчы, важнейшыя за любыя матэрыяльныя выдаткі, за любую валюту. І маё другое пытанне да аўтара артыкула «Сколько стоит власть?» Контрпытанне: а колькі, паважаны Баляслаў Іосіфавіч, каштуе, на вашу думку, безуладдзе? Беззаконне? Законна-прававы нігілізм? Колькі каштавала і каштуе народу адсутнасць сапраўднага заканадаўчага органа, дзеючага на прафесійна-дзелавым грунце нацыянальнага парламента? І яшчэ: як вы з вашым, такім скептычным стаўленнем да матэрыяльнай падтрымкі па-новаму выбраных Саветаў, Вярхоўнага Савета ў тым ліку, уяўляеце ажыццяўленне пераходу ўлады да Саветаў, стварэнне прававой дзяржавы, напаўненне рэальным зместам артыкулаў прынятай нядаўна Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце Беларускай ССР? І далей: нацыянальная годнасць колькі каштуе, па-вашаму? Ці тут, зноў-такі, не так проста з падлікамі-разлікамі? Нават калі звярнуцца да камп'ютэра?..

— І нарэшце, што б вы пажадалі супрацоўнікам «ЛіМа», яго аўтарам і чытачам?

— Калі коратка: утрымліваць занятыя пазіцыі і ісці далей. Падрабязней — на чарговым пасяджэнні рэдакцыйнай калегіі...

Гутарыў Віталь ТАРАС.

ках з РНМЦ. Дагавор заключаны пакуль што на адзін год. Мяркуецца, што будуць працаваць тры студыі, якія ўзначальваюць нашы супрацоўнікі. Студыю саломкапляцення — мастак Святлана Хруцкая, студыю аплікацыі саломкай — мастак Лідзія Малахава, студыю пляцення і ткацтва паясоў — мастацтвазнавец Вера Сілівончык. На заняткі запрашаюцца ўсе жадаючыя — дзеці і бацькі, навучэнцы і студэнты, пенсіянеры...

Практычныя заняткі будуць праводзіцца ў спалучэнні з тэарэтычнымі. Запланавана пятнаццаць заняткаў спецыяльнага лекторыя. Першыя з іх ужо адбыліся. Лекцыю «Беларускі народны касцюм» прачытала В. Лабачэўская. Наступныя будуць прысвечаны беларускай вышыўцы, нацыянальным ручнікам, арнаментам народных вырабаў.

Спявае «Скарыначка»... Задушэўная мелодыя прымушае яшчэ і яшчэ раз прыгадаць, што ў гэтым тлумным свеце першасна ўсё тое, што звязана з вытокамі, трывалымі маральнымі асновамі народнага жыцця.

НАШ КАР.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Многія, напэўна, бачылі і памятаюць плакаты: «Народ стварае хараство», «Адновім помнікі дойлідства!», «Шануйма родную мову!», «Раззбраенне!»... Іх аўтар — Уладзімір Крукоўскі. Разам з іншымі яго вядомымі работамі, прысвечанымі Ф. Скарыне, Я. Купалу, Я. Коласу, Цётцы, М. Багдановічу, К. Каліноўскаму, Я. Драздовічу, плакатамі на тэму захавання спадчыны, экалагічную і антываенную тэмы, яны прадстаўлены на рэтраспектыўнай выстаўцы мастака, што адкрыта цяпер у мінскім кінатэатры «Вільнюс». Усяго тут — 37 работ. (Дарэчы, можна заўважыць наўрад ці выпадковае супадзенне: год нараджэння аўтара — 37-ы!). Многія работы выстаўляліся раней, у тым ліку і на міжнародных выстаўках — у Варшаве, Брно, Осака і г. д. Гэта — толькі частка зробленага амаль за 20 год работы ў галіне плаката. Першы — з радкамі Ясеніна «Звераня́т, нібы братоў малодшых, біць не дазваляй па галаве» — пазначаны 72-м годам, адзін з апошніх, прысвечаны В. Цяпінскаму, выйшаў з друку сёлета.

Тут, на выстаўцы, карэспандэнт «ЛіМа» пагутарыў з мастаком.

Выбарчы клуб «ЛіМа»

«НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ — ГЭТА СТАН ДУШЫ»

Гутарка з кандыдатам у народныя дэпутаты БССР мастаком Уладзімірам КРУКОЎСКІМ

— Уладзімір Якаўлевіч, відаць, не будзе перабольшваннем сказаць, што ў вашых работах пэўным чынам выяўлена і ваша палітычная праграма кандыдата ў дэпутаты?

— Сапраўды, з усіх відаў мастацтва плакат, бадай, найбольш блізкі да палітыкі. Плакатысту, як нікому, трэба ўвесь час трымаць руку на пульсе часу, ведаць, чым жыве грамадства, разбірацца ў сацыяльных, эканамічных, нацыянальных і многіх іншых праблемах. Ну і, безумоўна, ведаць гісторыю свайго народа, гісторыю матэрыяльнай і духоўнай культуры.

— Вядома, што фактычна да пачатку 70-х у беларускім сучасным мастацтве заставалася, так бы мовіць, незапоўненая «экалагічная ніша». Я маю на ўвазе плакат на нацыянальна-патрыятычную тэму. Пачынаць запаўняць тую «нішу» вам, наколькі я магу меркаваць, давялося практычна аднаму...

— Цяпер у секцыі плаката Саюза мастакоў Беларусі, якой я пэўны час кіраваў, плённа працуюць каля трыццаці чалавек, імёны многіх з іх добра вядомыя. Сёння беларускі плакат — гэта ўжо не колішні парадны набор традыцыйных арнаментаў, дзяржаўнага флага і іншай афіцыёзнай сімволікі. Яго прызначэнне, звышзадача — абуджаць свядомасць людзей, іх памяць, актыўную грамадскую пазіцыю.

— Тут, на выстаўцы, з вашымі работамі могуць пазнаёміцца і вашы выбаршчыкі па Каліноўскай выбарчай акрузе № 29...

— Мяне вылучыла кандыдатам у дэпутаты рада Таварыства беларускай мовы Першамайскага раёна. Як член гарадской рады ТБМ я мог бы, у прынцыпе, выбіраць, у якой акрузе вылучацца. У Мінску акруг, дзе 30 верасня адбудуцца новыя выбары, як вы ведаеце, нямала. Але я пятнаццаць год пражыў у гэтым раёне па вуліцы Каліноўскага, а потым Гамарніка (цяпер жыву ў іншым раёне). Так што акругу з усімі яе праблемамі і асаблівасцямі ведаю выдатна.

Наогул, мне давялося прымаць удзел у сёлетняй выбарчай кампаніі з самага яе пачатку — яшчэ ў лютым. На мяне, як на члена сойма БНФ, была ўскладзена задача каардынаваць работу групы падтрымкі З. Пазняка. Самі ведаеце, у якіх умовах прыйшлося весці агітацыю за лідэра народнага фронту. Пазней, у чарговым туры, і мяне вылучыла кандыдатам у дэпутаты гарадская рада ТБМ. Але ў рэгістрацыі было адмоўлена з-за, кажучы мовай юрыстаў, «расширительного толкования» закона аб выбарах. Пра гэты выпадак, дарэчы, была нататка ў «ЛіМе» — «Яшчэ раз пра дышла». Так што практыка выбарчай барацьбы ў мяне ёсць.

— Спадзяюся, вам не падасца нетактоўным маё наступнае пытанне. Выбарчы марафон у рэспубліцы расцягнуўся больш як на паўгода. Людзі стаміліся. Шмат хто пацярпеў няўдачу толькі з-за таго, што на выбарчыя ўчасткі (часцей за ўсё пры паўторным галасаванні) прыходзіла менш паловы ўсіх выбаршчыкаў акругі. Як вы рашыліся ў такіх амаль безнадзейных умовах змагацца за дэпутацкі мандат?

— Вы сказалі, што людзі стаміліся. Я мяркую, што не проста стаміліся — людзі расчараваліся, зніяверыліся ў магчымасці змен у грамадстве, у сваім жыцці да лепшага. Значная частка выбаршчыкаў пры гэтым была, проста дэзарыентавана праафіцыйнымі сродкамі масавай інфармацыі. Успомніце, колькі маны і бруду было выліта са старонак, скажам, «Вячэрняга Мінска» на такіх кандыдатаў, як Ю. Хадыка, М. Ткачоў, іншых навукоўцаў, пісьменнікаў!

— Я недзе чытаў, што па колькасці дэпутатаў адносна колькасці насельніцтва беларускі парламент — самы вялікі ў Еўропе. А як з эфектыўнасцю яго работы?

— Шчыра кажучы, я не веру што Вярхоўны Савет у цяперашнім складзе праіснуе ўвесь адпушчаны яму тэрмін. Яго работа ў многім блакіруецца так званымі «кнопачнікамі» (а іх — большасць) — тымі, хто паслухмяна націскае кнопкі для галасавання па падказцы партыйнага начальства.

Тым не менш на сесіі былі прыняты некаторыя важныя дакументы і рашэнні. Яны былі прыняты дзякуючы намаганням тых дэпутатаў, якія сапраўды дбаюць пра свой народ, аддаюць сябе справе цалкам. Сярод іх ёсць і мае сябры, мае аднадумцы. Не буду крывіць душою — мне хацелася б быць побач з імі, дзяліць з імі цяжар адказнасці за лёс маёй радзімы.

— Вы маеце на ўвазе парламенцкую апазіцыю?

— Ведаеце, для таго, каб разабрацца, што да чаго ў Вярхоўным Савеце, трэба, відаць, спачатку там папрацаваць, акунуцца ў яго атмасферу. Не пра ўсё можна меркаваць на падставе знешніх уражанняў. Але мае сімпатыі на баку левага крыла — гэта адназначна.

— Як бы вы сфармулявалі сваю ўласную палітычную праграму?

— Калі гаварыць зусім коратка, дык яе можна выказаць адным словам: «Незалежнасць». Незалежнасць ва ўсіх яе аспектах—дзяржаўна-праўным, сацыяльна-эканамічным, вайсковым і нават, калі хочаце, псіхалагічным. Так-так, незалежнасць — гэта не толькі юрыдычны статус, але, перш за ўсё, стан душы. У маім разуменні ідэя незалежнасці зусім неабавязкова нацыянальная. Незалежнасць — гэта свайго роду нефармальны стан грамадства, у якім забяспечваюцца правы чалавека і максімальна выяўляюцца магчымасці асобы. Незалежны чалавек у незалежнай дзяржаве (а толькі такой і можа быць дзяржава) — чалавек, пазбаўлены рабскай псіхалогіі.

А наша камандна-адміністрацыйная сістэма літаральна прасякнута рабскай псіхалогіяй. Не магу тут не ўспомніць адзін выпадак. У 86-м годзе (заўважце — ужо пачалася перабудова) намеснік міністра культуры БССР У. Гілеп загадаў зняць з рэспубліканскай выстаўкі мой плакат «Шануйма родную мову!» Маўляў — «очернительство», выклікае сумныя асацыяцыі і г. д. Раней ён жа забараніў выстаўляць мой плакат «120 гадоў «Мужыцкай праўдзе» «з-за таго, што ў тэксце Каліноўскага сустракаецца слова «маскаль». Могуць сказаць — гэта ўжо мінулае, навошта яго ўспамінаць? Але справа не ў адным нейкім канкрэтным выпадку. Піраміда ўлады, пабудаваная на хлусні, строгай чыноўніцкай іерархіі і татальнай безадказнасці, засталася некранутай. І калі заўтра памяняюцца «ўстаноўкі» зверху, дзе гарантыя, што старыя і новыя чыноўнікі адразу не «перабудуюцца» на адваротны лад?

У падмурку піраміды, пра якую ідзе гаворка,—асноўная частка грамадства, як мы кажам — простыя людзі: рабочы, селянін, настаўнік, інжынер, медык. На жаль, большасць людзей сёння знаходзіцца ў стане апатыі. Нават перад тварам такой страшэннай бяды, як Чарнобыль, мы ўсё яшчэ застаёмся пасіўнымі, абыякавымі, не можам згуртавацца дзеля ўратавання сваіх дзяцей, сваёй будучыні.

Уся надзея — на маладую беларускую інтэлігенцыю, смелую і адукаваную, энергічную, нонканфармісцкую. Бо калі мы не набяром за бліжэйшыя 20 гадоў «крытычнай масы» інтэлігенцыі і інтэлігентнасці — нам, як нацыі, канец.

У рэшце рэшт, я думаю, працэсы дэмакратызацыі і гуманізацыі, культурнага адраджэння, якія ахапілі краіны Усходняй Еўропы, прыйдуць і да нас. Яны ўжо адбываюцца. Толькі не так хутка, як хацелася б. Безумоўна, я супраць штучнага іх прыспешвання. Лічу, што грамадства павінна развівацца выключна эвалюцыйным шляхам. Барані Божа, не трэба нам «румынскага варыянта»! І ўсё ж веру, што нашы дзеці будуць жыць у грамадстве, годным чалавека, калі мы, сённяшнія, зробім для гэтага ўсё, што ад нас залежыць.

— Уладзімір Якаўлевіч, наколькі я ведаю, разам з вамі па Каліноўскай акрузе балаціруюцца генерал-маёр — намеснік камандуючага ЧБВА і пракурор раёна. Не баіцеся такіх грозных сапернікаў?

— Усё залежыць ад саміх выбаршчыкаў. Думаю, высокія пасады сёння ўжо нікога не гіпнатызуюць. Галоўнае, каб людзі, пераадолеўшы інертнасць, прыйшлі на выбарчыя ўчасткі.

— Што ж, жадаем поспехаў.

Віншуем!

За высокія творчыя дасягненні і вялікі ўклад у развіццё беларускага опернага мастацтва салісту ДАВТа БССР Уладзіміру ЭКНАДЗІЕСАВУ нададзена ганаровае званне народнага артыста Беларускай ССР.

Фестываль маладзёжных праграм

З 17 па 21 верасня Мінск прымаў IX Усесаюзны фестываль маладзёжных тэлевізійных праграм. На ім было прадстаўлена 70 праграм самых розных тэм, жанраў і форм. Фестывальнае журы ўзначальваў Аляксей Дударав.

НАШ КАР.

Дапамога з-за акіяна

Рэдакцыя «ЛіМа» атрымала ліст, у якім урачы Слаўгарадскай раённай бальніцы выказваюць удзячнасць народнаму дэпутату БССР старшыні камітэта БНФ «Дзеці Чарнобыля» Генадзю Грушавому за перададзеныя медыкаменты і поліві[illegible]міны.

Сродкі набыты ў ЗША на ахвяраванні нашых суайчыннікаў, якія жывуць у Паўночнай Амерыцы. Актыўны ўдзел у зборы ахвяраванняў і аказанні матэрыяльнай дапамогі прынялі сям'я Сурвілаў (Канада), сям'я Рамукоў, Міхась Шапко, Янка Валюкевіч, Марыя Дзямковіч (ЗША).

Гэта — толькі першы крок, за якім неўзабаве адбудуцца больш значныя акцыі дапамогі. У Паўночнай Амерыцы зараз фарміруюцца фонды падтрымкі пацярпеўшых ад Чарнобыля.

Адкрылася царква

Сынковіцкая царква—выдатны архітэктурны помнік Беларусі, які быў пабудаваны яшчэ ў XV—пачатку XVI стагоддзя.

Выгляд царквы з цягам часу застаўся амаль нязменным. Толькі знік купал над сярэдзінай даху, а ў 1891 годзе перад уваходам збудавалі мураваную званіцу.

За пяць стагоддзяў тут пабывалі многія вядомыя і знакамітыя людзі Беларусі. Не выключэнне, што царкву мог бачыць і сам Францыск Скарына, калі ён неаднаразова вяртаўся з заходніх зямель на Полаччыну.

У розныя часы помнік вывучалі даследчыкі архітэктуры, цікавыя замалёўкі храма зрабіў у другой палове XIX стагоддзя беларускі краязнаўца і мастак В. Гразноў.

Помнік у Сынковічах—гэта не толькі царква, але і крэпасць. Шмат стагоддзяў яна засланяла сваіх землякоў ад розных ворагаў, а людзі спяшаліся сюды на святы, каб ад нялёгкай працы адпачыць сэрцам і душою.

Так працягвалася да 1957 года. А пасля перамогу атрымаў атэізм. Пачалася барацьба з рэлігіяй, хоць знішчалі не яе, а такія каштоўныя помнікі, як у Сынковічах, чалавечую духоўнасць і прыгажосць.

Цяжка жылося і Сынковіцкай царкве ў акружэнні калгаснай фермы. Ды і ў самой царкве размяшчаўся склад з ільном. Пачалі асыпацца векавыя сцены, прагніў дах...

Але людзі не далі загінуць царкве: паціху ішлі рэстаўрацыйныя работы, ачышчалася тэрыторыя. А 1 верасня Сынковіцкая царква расчыніла дзверы. Сотні людзей з навакольных вёсак Зэльвенскага і Слонімскага раёнаў прыйшлі на ўрачыстае адкрыццё. І тая служба, якая ў царкве не вялася больш за трыццаць гадоў, запомніцца ім надоўга. Збор добраахвотных ахвяраванняў прыхаджан, выручка ад продажу абрадавых і культавых рэчаў пойдзе ў фонд Сынковіцкай царквы.

С. ЧЫГРЫН.

18 верасня ў Н'ю-Ёрку адкрылася 45-я сесія Генеральнай Асамблеі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Афіцыйную беларускую дэлегацыю ўзначальвае міністр замежных спраў БССР П. КРАЎЧАНКА. У складзе дэлегацыі, упершыню зацверджанай Саветам Міністраў рэспублікі, — пастаянны прадстаўнік Беларускай ССР у ААН Г. БУРАЎКІН, намеснік дырэктара ВА «БелаўтаМАЗ» па знешнеэканамічных сувязях Я. СЕЛІВОНЧЫК, доктар фіпалагічных навук, пісьменнік, загадчык аддзела Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы АН БССР, старшыня аргкамітэта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў А. МАЛЬДЗІС, загадчык аддзела міжнародных эканамічных арганізацый МЗС БССР В. НІКУЛІН.

Напярэдадні ад'езда ў Н'ю-Ёрк у МЗС БССР адбылася прэс-канферэнцыя, на якой П. Краўчанка, у прыватнасці, адзначыў, што наша дэлегацыя бачыць сваю стратэгічную мэту ў тым, каб данесці да міжнароднай грамадскасці праўдзівую і аб'ектыўную інфармацыю аб чарнобыльскай катастрофе і прыняць спецыяльную рэзалюцыю ААН па Чарнобылю. Міністр сказаў таксама, што ў сваёй дзейнасці мы будзем кіравацца прынятай беларускім парламентам Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце, дзе гаворыцца: «сваю свабоду і суверэнітэт Беларуская ССР выкарыстае на выратаванне народа Беларускай ССР ад вынікаў чарнобыльскай катастрофы».

Падрабязныя справаздачы аб прэс-канферэнцыі былі змешчаны ў рэспубліканскім друку. «ЛіМ» сёння прапануе яшчэ адзін дакумент, які пашырае нашы ўяўленні аб захадах, прымаемых беларускай дыпламатыяй. Гэта — выступленне міністра замежных спраў БССР П. Краўчанкі на Канферэнцыі кіраўнікоў урадаў прыбалтыйскіх краін па экалагічнаму адраджэнню Балтыйскага мора.

Канферэнцыя праходзіла 2—3 верасня ў г. Ронебю (Швецыя). У ёй удзельнічалі, апрача Швецыі, ФРГ, Фінляндыя, Данія, Польшча, ГДР, ЧСФР, РСФСР, Латвія, Эстонія, а таксама дэлегацыя БССР у складзе П. Краўчанкі і намесніка начальніка Белгідрамета П. Грука. У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі прадстаўнікі такіх міжнародных арганізацый, як Еўрапейская эканамічная камісія, «Пентаганалія» (Каардынацыйная камісія пяці прыбалтыйскіх краін), Хельсінская камісія, Сусветны банк, Еўрапейскі банк рэканструкцыі і развіцця Ініцыятарамі і састаршынямі канферэнцыі былі прэм'ер-міністр Швецыі І. Карлсан і прэм'ер-міністр Рэспублікі Польшчы Т. Мазавецкі.

Падкрэслім, што Беларусь упершыню была запрошана на такі прадстаўнічы форум прыбалтыйскіх дзяржаў. У рамках канферэнцыі адбыліся перагаворы беларускай дэлегацыі з прэм'ер-міністрам Даніі П. Шлютэрам і выканаўчым сакратаром Еўрапейскай эканамічнай камісіі Г. Хінтэрэгерам.

Такім чынам, друкуем выступленне міністра замежных спраў БССР, якое Пётр Кузьміч перадаў рэдакцыі «ЛіМа» напярэдадні ад'езда ў Н'ю-Ёрк.

Пётр КРАЎЧАНКА:

«Чарнобыль—Галгофа для беларускага народа»

Паважаны пан старшыня!

Паважаны пан намеснік старшыні!

Пані і панове!

Найперш хачу шчыра падзякаваць дзяржавам — арганізатарам Канферэнцыі за запрашэнне Савецкай Беларусі на гэты прадстаўнічы форум. З асаблівым задавальненнем хачу канстатаваць, што ўпершыню за апошнія дзесяцігоддзі Беларусь запрошана на такую прадстаўнічую Канферэнцыю дзяржаў басейна Балтыйскага мора. Існуе думка, што Беларусь з'яўляецца толькі перыферыяй Балтыкі, а не сумежнай тэрыторыяй, якая прылягае да арэалу Балтыйскага мора. Мы звязаны з Балтыкай гістарычна і геаграфічна, гідралагічна і кліматалагічна.

Гістарычна і геаграфічна — дзякуючы вядомым из працягу тысячагадовай даўніны падзеям, звязаным са знакамітым гандлёва-эканамічным шляхам «з варагаў у грэкі».

Гідралагічна — дзякуючы такім жыццёва важным для Балтыкі артэрыям, як рэкі Заходняя Дзвіна, Нёман і іх прытокі рэкі Вілія, Заходні Буг і Мухавец, вытокі якіх знаходзяцца на Беларусі.

Кліматалагічна — дзякуючы ўзаемаўплыву лясных масіваў, якія складаюць больш за трэць плошчы рэспублікі, і біясферных патокаў сумежных рэгіёнаў мора і сушы. У Беларусі ёсць такія унікальныя мясціны, як Белавежская пуща, якая належыць нам і польскім сябрам, а таксама біясферны Бярэзінскі запаведнік, які з'яўляецца, на думку экспертаў ЮНЕСКА, эталонным для еўрапейскага кантынента. Без перабольшвання можна сказаць, што гэта «нырка» не толькі нашай рэспублікі, але і краін балтыйскага рэгіёна. У сваю чаргу паветраны басейн Балтыйскага мора непасрэдна ўплывае на клімат, асноўныя формы жыццядзейнасці нашага народа, урадлівасць шэрагу сельгаскультур.

У апошнія дзесяцігоддзі мы рабілі канкрэтныя захады па паляпшэнні якасных параметраў водных рэсурсаў артэрый Балтыйскага мора. Паводле папярэдніх разлікаў, у бліжэйшае пяцігоддзе мяркуем выдаткаваць на гэтыя мэты 60 млн. рублёў. Арыентуемся на тое, каб завяршыць выкананне мерапрыемстваў па спынненні лакальнага забруджвання Балтыкі да 1993 года.

Аднак разам з аптымістычнымі ноткамі я хацеў бы перадаць усю вастрыню сітуацыі, звязанай з чарнобыльскай трагедыяй. Спачатку заўвагі агульнага парадку. Па-першае, еўрапейская і балтыйская супольнасць павінны зразумець усю глыбіню таго, што здарылася, бо гаворка ідзе не пра **рэгіянальную, нацыянальную** ці **агульнасаюзную** трагедыю, а пра трагічную з'яву універсальнага, планетарнага характару. Па-другое, мы рашуча адкідваем старыя дэфініцыі і вызначэнні. Не **пераадоленне** наследстваў чарнобыльскай трагедыі (гэта і тэарэтычна, і практычна немагчыма), а **мінімізацыя,** змяншэнне яе ўплыву на арганізм чалавека і, асабліва, дзяцей.

Па-трэцяе, мы павінны ўсвядоміць маштабы таго, што здарылася. Мяркуйце самі: агульная тэрыторыя, якая падверглася забруджванню ад 1 да 40 кюры на кв. км., складае каля адной трэці тэрыторыі Беларусі, альбо 70 працэнтаў «чарнобыльскай плямы», якая знаходзіцца на тэрыторыі РСФСР, УССР і БССР. На забруджанай у той ці іншай ступені тэрыторыі Беларусі жыве 2 млн. 200 тыс. чалавек. Толькі ў бліжэйшыя месяцы і гады нам трэба эвакуіраваць больш за 100 тыс. чалавек.

Такім чынам толькі ў бліжэйшае дзесяцігоддзе рэспубліцы неабходна для рашэння ўсяго комплексу чарнобыльскіх праблем не менш за 18 млрд. рублёў.

Гэта—прамыя наступствы катастрофы на Чарнобыльскай АЭС. Але ёсць і другі бок медаля — наступствы другаснага, ускоснага парадку, якія маюць адносіны да праблематыкі гэтай Канферэнцыі. Гаворка ідзе пра раёны паўночна-заходняй Беларусі (Віцебская і часткова Гродзенская вобласці), куды будзе накіравана асноўная маса 100-тысячнай групы мігрантаў з поўдня рэспублікі. Хачу адразу «зняць» магчымае напружанне ў прыбалтыйскіх партнёраў і падкрэсліць, што ў цэлым тэрыторыі, якія мяжуюць з басейнамі рэк Заходняя Дзвіна і Нёман, не забруджаны радыёнуклідамі. Гэтаму рэгіёну пагражае іншая небяспека. Перамяшчэнне сюды вялікай масы насельніцтва прывядзе да ўзмацнення эксплуатацыі водных рэсурсаў, росту памераў меліярацыйных работ і пашырэння пасяўных плошчаў, што не можа не адбіцца на прыбярэжнай акваторыі Балтыйскага мора. Бо менавіта тут трэба будзе ўзнавіць 17 працэнтаў пашы, страчанай на поўдні рэспублікі. Спатрэбяцца значныя рэсурсы, каб зняць напружанне ў многіх сферах жыццядзейнасці, якое ўзнікае, і не дапусціць негатыўных экалагічных наследстваў звычайнага характару. У гэтай сувязі, у цэлым высока ацэньваючы праект падрыхтаванай Дэкларацыі і, безумоўна, падтрымліваючы асноўныя яго палажэнні, уношу прапанову **дапоўніць прэамбулу тэзісам, які ўтрымлівае спасылку на ўскосныя наступствы чарнобыльскай трагедыі для краін балтыйскага рэгіёна ў выніку больш актыўнай гаспадарчай эксплуатацыі паўночна-заходняй часткі Беларусі, а таксама ўнесці канкрэтны пункт у асноўную частку дакумента, скіраваны на пашырэнне міжнароднай фінансавай дапамогі шматпакутнаму народу Беларусі.** З вялікай зацікаўленасцю мы толькі што выслухалі заяву пана прэм'ер-міністра Даніі аб аказанні дапамогі ў экалагічнай сферы шэрагу краін Усходняй Еўропы памерам у 500 млн. крон. У гэтай сувязі ўзнікае пытанне: а ці нельга ў арэал дзяржаў, якія маюць магчымасць атрымаць гэтую дапамогу, уключыць і Беларусь, у якой, як вы бачыце, шмат найскладаных праблем?

Мы ўдзячныя сусветнаму супольніцтву за аказваемую рэспубліцы дапамогу. Карыстаючыся такой выдатнай магчымасцю, як выступленне на прадстаўнічай і аўтарытэтнай Канферэнцыі, хачу перадаць ад імя беларускага народа, урада і парламента рэспублікі шчырую ўдзячнасць дзесяткам пацыфісцкіх, альтруісцкіх і рэлігійных арганізацый Скандынавіі і Заходняй Еўропы і, асабліва, нацыянальным і міжнародным арганізацыям скаўтаў за арганізацыю адпачынку беларускіх дзяцей і іх аздараўленне ў ФРГ, Швецыі, Аўстрыі, Нарвегіі, Францыі, Італіі, Іспаніі, Бельгіі, Даніі і ў многіх іншых краінах. Мы высока ацэньваем і пазіцыю Еўрапейскай эканамічнай камісіі, якая традыцыйна ўважліва ставіцца да патрэб Беларусі і якая, як мы зразумелі пад час прыватнай гутаркі сёння, застаецца ў сіле. Але ў цэлым міжнародную дапамогу, якую аказваюць нам, можна параўнаць са сціплай ручаінай, а не паўнаводнай ракой, як бы хацелася. І галоўная перашкода тут — супярэчнасці ведамаснага характару сярод міжнародных спецыялізаваных арганізацый ААН.

У гэтай сувязі мы плануем ужо ў бліжэйшы час выступіць з шэрагам знешне-палітычных акцый, выкарыстоўваючы ў першую чаргу трыбуну маючай адбыцца Генеральнай Асамблеі ААН. Мы маем намер больш актыўна дзейнічаць па ўсіх напрамках, у тым ліку і ў пытаннях двухбаковага (рэгіянальнага) супрацоўніцтва, зыходзячы з асноўных прынцыпаў прынятай у ліпені г. г. Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце БССР, якую мы разглядаем як дакумент лёсавызначальнага значэння ў гісторыі беларускай нацыі.

Маё выступленне адначасова прасякнута і болем трывогі, і аптымізмам надзеі, верай у дапамогу ўсіх людзей добрай волі. На працягу стагоддзяў нашы землі, якія з'яўляюцца своеасаблівым «скрыжаваннем» Еўропы, не абмінуў, здаецца, ніводзін вал нашэсцяў, паходаў, агрэсій. Не раз у гісторыі наш этнас стаяў на мяжы фізічнага знікнення. Дастаткова сказаць, што ў канцы XVII стагоддзя на кантыненце заставалася ў выніку войнаў і эпідэмій менш за 1 млн. беларусаў. Еўропа ведае, што прынёс нам вогненны смерч 2-ой сусветнай вайны. І вось — Чарнобыль, Галгофа XX стагоддзя для беларускага народа. Многія народы і краіны яшчэ не ведаюць усёй паўнаты праўды пра тое, што здарылася (...).

Мы гаворым пра сувязь экалогіі і палітыкі, экалогіі і маралі, пра сапраўдны альтруізм. Глыбока перакананы, што нікому не дадзена крочыць з чыстым сумленнем у XXI стагоддзе, не вырашыўшы праблему выратавання людзей, якія пацярпелі ад Чарнобыля: рускіх, украінцаў, беларусаў. Праблему выратавання генетычнага фонду беларускай нацыі (...).

З пошты «ЛіМа»

●

З 1 верасня 1990 г. у Беларусі ўступіў у дзеянне Закон «Аб мовах у Беларускай ССР», паводле якога беларуская мова аб'яўлена дзяржаўнай. Закон, прынамсі, прадугледжвае і стварэнне спрыяльных умоў для вывучэння роднай мовы кожным жыхаром Беларусі.

Цяпер пра тое, што нас прымусіла ўзяцца за гэты ліст. Раённыя і аб'яднаныя газеты, якія дагэтуль выходзілі ў рэспубліцы на беларускай мове, з'явіліся і з'яўляюцца, паміж іншага, і сродкам авалодання чытачом, у першую чаргу маладым, нацыянальнай мовай, здабыткамі культуры і гісторыі рэспублікі, тым больш, што ў большасці буйных райцэнтраў ужо не засталося школ на беларускай мове навучання. Здаецца, усё ясна. Але вось што здарылася ў адным з буйнейшых прамысловых і культурных цэнтраў Беларусі — горадзе Барысаве.

Без папярэджання і без узгаднення з думкай працоўных мясцовая газета «Камуністычная праца», тыраж якой 24 тысячы, паведаміла, што з новага года будзе выходзіць на дзвюх мовах — рускай і беларускай. І яшчэ, прыкладна ў той жа дзень, калі ў друку з'явіўся праект Закона аб мовах у Беларусі, у Барысаве выйшаў нумар новага рускамоўнага выдання «Молодежный вестник».

У сувязі з гэтым у нас узнікае шэраг пытанняў: хто, на якім узроўні дазваляе ці дазволіў барысаўскім «ініцыятарам» прымаць такое рашэнне? Трэба прызнаць пры гэтым, што да сённяшняга дня ў Барысаве, які налічвае каля 200 тысяч жыхароў, так і не адкрыта ніводнай школы з беларускай мовай навучання. Хацелася б ведаць, якія захады прынялі барысаўскія ўлады (горкам партыі, гарвыканком, гарком камсамола) для канкрэтнага ажыццяўлення Закона «Аб мовах у Беларускай ССР», для паляпшэння справы з вывучэннем беларускай мовы, як мовы дзяржаўнай?

Васіль **ГІГЕВІЧ,** Генрых **ДАЛІДОВІЧ,** Віктар **ГАРДЗЕЙ,** Алесь **КАМАРОЎСКІ** — пісьменнікі, Юры **СТАНКЕВІЧ** — журналіст, Уладзімір **ВОЛКАЎ,** Алесь **АЛІСІЕВІЧ,** Сяргей **КАЛЕНІК** — рабочыя Барысаўскага завода «Аўтагідраўзмацняльнік», Валеры **ЗАХАРАЎ** — старшыня Барысаўскага гарадскога ТБМ, Таццяна **ЗІНЕНКА,** Алена **МАЕЎСКАЯ** — настаўніцы і інш., усяго 23 подпісы.

●

Мы, удзельнікі мітынгу ў вёсцы Сенніца Мінскага раёна, які адбыўся 16 верасня г.г., патрабуем ад Вярхоўнага Савета БССР і Цэнтральнай выбарчай камісіі спынення паўнамоцтваў народнага дэпутата БССР па выбарчай акрузе № 72 Піскарова В. А.

1. У сувязі з парушэннямі законнасці ў ходзе выбараў (па дакументах Мінскай міжраённай пракуратуры).

2. Дзеянні дэпутата Піскарова В. А. не адпавядаюць яго абяцанням і перадвыбарчай платформе. Барацьба са злачыннасцю, што з'яўляецца яго найпершым клопатам, фактычна спынена, асабліва ў эканамічнай сферы. Актыўная сувязь з выбаршчыкамі адсутнічае.

3. Назіраючы за працай дэпутатаў у Вярхоўным Савеце БССР, звяртаючы асаблівую ўвагу на вынікі пайменнага галасавання, адзначаем, што дэпутат Піскароў сваім мандатам не садзейнічае развіццю дэмакратыі, іншы раз праяўляе абыякавасць і зусім не галасуе па прынцыповых пытаннях. У сувязі з гэтым мы выказваем яму свой недавер.

4. Піскароў В. А. як былы міністр МУС павінен несці юрыдычную і маральную адказнасць за рэпрэсіўныя дзеянні атрадаў міліцыі і ўнутраных войск супраць мірнага шэсця мінчан 30 кастрычніка 1988 г., прысвечанага дню памяці продкаў «Дзяды». Лічым, што гэта не сумяшчальна з абраннем генерала Піскарова старшынёй Камісіі па рэабілітацыі рэпрэсіраваных, і выказваем у сувязі з гэтым свой пратэст.

Вядучыя мітынгу ў в. Сенніца
А. МЯЛЬГУЙ, У. ЛІПСКІ
сакратар раённай рады БНФ
М. БЕЛЬМАЧ.

Мінскі раён.

З трэцяга па дзесятае мая ў Заходнім Берліне праходзіў «Тыдзень Беларусі». Праводзіла яго добра вядомая і ў рэспубліцы і ў Саюзе дабрачынная акцыя «Выкупленне». Без лішняга шуму, па-дзелавому строга і з той дакладнай пунктуальнасцю, на якую здольны дзелавыя немцы.

Гаспадарам належала не толькі ідэя правядзення «Тыдня». Яны ўзялі на сябе і ўсе арганізацыйныя і матэрыяльныя выдаткі.

Час быў выбраны нібы і не самы лепшы: сорак пяць гадоў пасля заканчэння вайны, для нас, савецкіх, як быццам юбілей перамогі, для іх, немцаў, як быццам напамінак пра паражэнне. Перамога і паражэнне.

Пад націскам новых міжнародных вятроў звалена сумна вядомая ўсяму свету берлінская сцяна, тая сцяна, што воляй ідэалагічнага ідыятызму рассякала жывы, вякамі выпешчаны арганізм аднаго са старэйшых гарадоў Еўропы на Усходні і Заходні. Рассякала горад, краіну, свет.

Час, калі ўвесь нямецкі народ у радасным патрыятычным узрушэнні: вось-вось наступіць дзень доўгачаканага свята. Гістарычны момант, калі, адпаведна справядлівасці, немцы могуць у поўны голас сказаць: «З намі Бог».

Нарэшце, праз дзесяцігоддзі канфліктаў і чакання — адна зямля, адна дзяржава, адзін народ. Адна справядлівасць на ўсіх.

Сваіх пытанняў і праблем у немцаў пад самую завязку, але знайшлася добрая воля, каб правесці «Тыдзень Беларусі». Добрая воля і мудрасць, у аснове якіх ляжыць рашучая актыўнасць членаў акцыі «Выкупленне» і ў вялікай долі аднаго з яе падзвіжнікаў пісьменніка Хрыстафа Хойбнера.

Беларусам гэта мерапрыемства было патрэбна больш, чым каму. Чарнобыльская бяда прымушае крыкам крычаць, і ўсякі інтарэс да нашай горкай зямлі — надзея на спачуванне, а, магчыма, і на дапамогу.

Пісьменнік і час

Анатоль КУДРАВЕЦ

ПЕРАМОЖАНЫЯ ПЕРАМОЖЦЫ

...Выстаўка маладога беларускага мастацкага авангарду, сямейная выстаўка Арлена Кашкурэвіча і сыноў Фёдара і Ігара, выступленне фальклорнага ансамбля, пісьменніцкія сустрэчы і аўтарскія чытанні Васіля Быкава і аўтара гэтых запісак...

Прадугледжвала праграма «Тыдня» шматлікія сустрэчы берлінцаў з загадчыцай дзіцячага гематалагічнага цэнтра Мінска Вольгай Алейнікавай — чалавекам ярка актыўным і энергічным. Менавіта на яе плечы рэспубліканскае Міністэрства аховы здароўя ўзваліла адзін з самых цяжкіх клопатаў — адчайную барацьбу з дзіцячымі лейкозамі,— відаць самым страшным, што прынёс Чарнобыль. Пішу «адчайную», бо рэспубліка была не гатова (ды і сёння не гатова) паспяхова супрацьстаяць гэтаму страшнаму захворванню. 10—15 працэнтаў вылечаных дзяцей у параўнанні з 80—85 працэнтамі, што вылечваюць у клініках Захаду,— хіба не паказчык ледзь не нулявога ўзроўню і нашай медыцыны, і нашай чалавечай годнасці.

Дзіцячае гематалагічнае аддзяленне, а ні адпаведнага памяшкання, ні патрэбных лякарстваў, ні неабходнай колькасці спецыялістаў... І гэта ў Мінску, у сталіцы! Некалькі пакояў на пяцьдзесят-шэсцьдзесят хворых дзяцей, кожнае з якіх павінна знаходзіцца ў асобным, стэрыльным боксе. Ні пакоя для гульняў (дзеці!), ні пакоя для маці (дзеці!)... Два ўрачы, два практыканты з інтэрнатуры Мінскага медінстытута, а ўсё астатняе зноў на плечы Алейнікавай.

Як чаўнок, снуе яна па Заходняй Еўропе... Германія, Аўстрыя, Швейцарыя, сама — адна і ўрач, і заказчык, і дыпламат.

Зусім заканамерна, што чарнобыльская ідэя стала галоўнай ідэяй «Тыдня». Прыцягнуць увагу нямецкай грамадскасці да страшнай праўды: трагедыя цэлага народа, генацыд часоў перабудовы. Прыцягнуць увагу і прасіць дапамогі — медыцынскім абсталяваннем, лекамі, методыкамі, кансультацыямі, а, можа, калі надта пашанцуе, валютай ці стацыянарным лячэннем, запрашэннем на адпачынак ці аздараўленне, няхай гэта будзе датычыць аднаго дзіцяці, двух, дзесяці...

Горка хадзіць па свеце з працягнутай рукой, але бяда прымушае.

На прэс-канферэнцыі ў офісе Агенцтва друку навіны, дзе прысутнічалі прадстаўнікі заходнеберлінскіх газет і радыё, інтарэс да чарнобыльскай трагедыі быў калі не дзяжурны, то даволі вялы. Можа, таму, што ўжо не было сенсацыйнасці падзеі, узрыўной навізны. Людзі да ўсяго прывыкаюць хутка.

На долю Васіля Быкава выпаў асноўны цяжар адказаў, і па заканчэнні ён зрабіў такое рэзюме:

— Ім надакучылі нашы скаргі і просьбы.— «Ім» —гэта значыць, усім, каго мы просім.

Можа, яно і так. Відаць, так. Бо ва ўсіх нашых просьбах (нават калі яны не былі выказаны адкрыта) праглядала нешта ганебна жабрацкае. Як у пагарэльцаў.

І невыпадкова ледзь не на кожнай сустрэчы—і большай, і меншай — мы чулі пытанні: «А што зрабіў і што робіць саюзны ўрад? А што зрабіў і што робіць беларускі ўрад?»

Нам было цяжка і сорамна адказваць на гэтыя пытанні. Хай бы на іх адказалі Гарбачоў і Рыжкоў.

Хай бы на іх адказалі Сакалоў і Кавалёў (Кебіч тады яшчэ не быў кіраўніком урада).

Мы дык добра ведалі, што рабілася і што робіцца.

Чатыры гады, што мінулі пасля катастрофы, паказалі, што гуманнасць «самага перадавога» грамадства існуе толькі на паперы. Што гуманнасць гэта не можа быць большай, чым тая, якую дазваляюць партыйныя вярхі. А ім некалі, яны занятыя барацьбой за ўладу, Што там нейкая Беларусь, беларускі народ, беларускія дзеці!

Чатыры гады паказалі яшчэ, што ўлады нашай ад самай высокай і ніжэй амаль нічога (апрача голых дэкларацый) не зрабілі для таго, каб нейтралізаваць развіццё трагедыі. Скажам болей, рабілася ўсё для таго, каб заглушыць крыкі ахвяр, закалыхаць сусветную грамадскасць.

Добра ведалі гэта і многія берлінцы, але не маглі зразумець аднаго: як гэта можна кінуць народ у такой бядзе? Перакласці дзяржаўную справу яго выратавання на плечы адзіночак, добраахвотнікаў-энтузіястаў?

Не маглі зразумець але стараліся дапамагчы, чым маглі. Хаця і самі, пры ўсім парадку ў краіне, павінны лічыць грошы. Бо яны не з неба сыплюцца. Яны зарабляюцца ўсё тым жа чалавечым потам, стараннем, талентам.

Дзеці. У чарнобыльскіх дзяцей ёсць свой нязменны пашпарт — вочы. Гэта вочы касмічных прышэльцаў. Яны пранізваюць наскрозь — сваёй безабароннасцю, сваёй трагічнай адлучанасцю ад простых зямных радасцей. Яны глядзяць у душу нібы з халоднага космасу адчаю.

Яны гавораць і пытаюцца, Гавораць пра трагедыю, маштаб якой не ведаюць. Пытаюцца...

Пра што можа пытацца дзіця чатырох — пяці — сямі гадоў, на чыю долю выпалі пакуты, перанесці якія не пад сілу і даросламу?.. Шэсць — восем уколаў у дзень, два-тры пераліванні крыві, пункцыі, кропельніцы... І гэта з дня ў дзень, на працягу бясконцых месяцаў... І гэта толькі пачатак... Пачатак лячэння, разлічанага на гады, у канцы якіх так рэдка стаіць запаветнае вылечванне.

Кажу пра лейкозы, хоць кожная хвароба кожнага дзіцяці страшная. Кажу пра тых, у каго «белая кроўка», белыя твары і лысенькія галоўкі ад абпраменьвання...

Немагчыма глядзець у гэтыя вочы.

Быццам гэта ты арганізаваў Чарнобыль. Быццам не акадэмік Аляксандраў, а ты прыдумаў і спраектаваў тыя смяртэльныя рэактары, добра разумеючы, што гэта такое.

Быццам не Слюнькоў і меншага рангу слюньковы, а ты — даваў каманду праводзіць паказальныя «маёўкі» пад лозунгам «не сеяць панікі» ў страшным маі 1986 года і пазней.

Быццам не маскоўскія вярхоўныя партыйныя і дзяржаўныя мужы часоў Галоснасці, а ты даваў каманду засакрэціць праўду аб памерах катастрофы аб маштабах «ціхай смерці».

Шмат набіраецца гэтых «быццам», якія завязала ў чорны вузел чарнобыльская трагедыя і на якія трэба шукаць адказы і тых, хто павінен адказваць. А пакуль трэба ратавацца.

Можна толькі радавацца, што чалавецтва не такое чэрствае, як нам часам здавалася, і што традыцыі сапраўднага гуманізму маюць глыбокае карэнне. І ў сусветным супольніцтве, і ў нямецкім народзе. Сапраўдны гуманізм вышэй за ўсякія ідэалагічныя прыярытэты, бо ён думае пра чалавека.

...Два савецкія пісьменнікі ў Заходнім Берліне. У горадзе, які яшчэ нядаўна савецкая афіцыйная прапаганда з адценнем іроніі называла «вітрынай Захаду». У гэта паняцце ўкладваўся чыста савецкі падыход: маўляў, жыццё там дурней дурнога, і хіба што вітрыны, па-нашаму, паказуху, яны ўмеюць арганізаваць. Усё, што на вітрыне, — гэта фальш і няпраўда. Глядзіце і кумекайце, што да чаго... Вас, дурняў, купіць хочуць...

Разбазарыўшы ці знішчыўшы сваё, хаваючыся за прымітыўна варварскі марксісцкі лозунг «рабуй нарабаванае», айчынны сацыялізм не супраць разбазарыць і чужое. Мы «такія», дык няхай і ўвесь свет будзе «такі». А яшчэ лепей, калі будзе дурнейшы.

Свет жыў сваімі законамі. Ён не хацеў быць дурнейшым. Ён хацеў быць лепшым.

І ці трэба жахацца ці нават здзіўляцца той паспешлівасці, з якой яшчэ ўчора «адзіны і маналітны» сацыялістычны лагер адмовіўся ад навязанага яму «сацыялістычнага выбару»? Ад усяго, што было звязана з гэтым «выбарам»? А перш за ўсё ад камуністычнай ідэі.

Ён адмовіўся, як толькі ўбачыў, што савецкія танкі не пойдуць высякаць сваімі гусеніцамі іскры на бруку іхніх гарадоў, не пасмеюць трушчыць косці іхніх насельнікаў. Ён ведаў: варта скінуць з сацыялізму павуціну ідэалагічнай апаткі, і ўвесь свет убачыць, што «кароль голы».

Мы сядзім за адным са столікаў, вынесеных з рэстарана на тратуар фешэнебельнай Курфюрстэндам. Гаворым. А калі і маўчым, то ўсё роўна думаем — пра дом, пра літаратуру, пра жыццё, што засталося ў Мінску, у Беларусі.

Ад гэтага жыцця не ўцячы, яно сядзіць у крыві, яно з табой усюды. Няхай бы яно было галоднае, няхай бы беднае, але каб не такое дзікае?! Каб не такое беспрасветнае?! А то і галоднае, і беднае, і — такое дзікае.

Ім бы, гэтым пісьменнікам, радавацца, што знаходзяцца ў вольным горадзе, што сядзяць за чыстым столікам, што дыхаюць чыстым паветрам, што п'юць ахалоджанае цудоўнае нямецкае піва і што падае яго добразычлівы паслужлівы афіцыянт...

Ім бы адчуць сябе раскавана, адрынуўшы хоць на нейкі час клопаты і трывогі, вось так хацяў б, як гэтыя пажылыя турысты з Англіі, ці, можа, з Канады, ці з Францыі, а яны...

На адной з сустрэч з творчай інтэлігенцыяй у гэтым жа Берліне нехта жартам спытаў у Васіля Быкава: «Як адчуваюць сябе савецкія людзі за мяжой?»

Ён зусім сур'ёзна адказаў: «Савецкія людзі за мяжой увесь час пазіраюць у зямлю і ўздымаюць вочы ўгору толькі тады, калі едуць дамоў. Пазіраюць у зямлю, бо ім сорамна глядзець на ўсё гэта дабро, сорамна адчуваць сваю непаўнацэннасць».

І мы зацята пазіраем у высокія адпацелыя куфлі з півам, і гаворым літаральна такое:

«Як добра, што нашы жанчыны не бачаць усяго гэтага». «Усяго гэтага»... Перш за ўсё багатых магазінаў, у якіх ёсць усё і на ўсякі густ — ад іголкі да аўтамабіля.

Як добра, што не бачаць гэтай культуры — ва ўсім: у адносінах чалавека да чалавека, у адносінах да працы, да свайго і да чужога дабра.

Ужо ў сем гадзін раніцы каля магазінаў пачынаецца актыўнае жыццё: чысцяцца, мыюцца вітрыны, прылаўкі. Потым даходзіць чарга да падлогі, потым да тратуара перад магазінам. І ўсё гэта — са шчоткамі, мылам, з шампунню!..

Будаўнічая фірма рамантуе пяціпавярховы дом, і каб не лянцеў пыл, занавешвае яго ад вуліцы суцэльным — на ўсю вышыню і шырыню дома — цэлафанавым занавесам. Блакітным, з прыгожымі малюнкамі-рэкламай. Смецце ж і будаўнічы друз спускаецца ўніз праз шырокі рукаў-трубаправод.

Як добра, што нашы жанчыны гэтага не бачаць. Жанчыны, бо ў іх слабейшае сэрца. Ці вытрымала б?

Як добра, што не бачаць харчовых аддзелаў магазінаў, дзе ўсё выстаўлена, запакавана, а калі вам трэба зважыць кілбасы ці сыру, ці яшчэ чаго, — у вас пяць разоў перапытаюць, чаго, якога і колькі. Перапытаюць, пакажуць, зробяць.

Як добра, што не бачаць гэтых цудоўных, магутных японскіх матацыклаў, гэта дзікае звяр'ё, што з сілай гарматнага снарада зрываецца з месца і нясе свайго ездака па вуліцах горада, гэтыя шэдэўры прыгажосці, густу, тэхнічнай думкі і дызайну.

Як добра...

Гаворыцца гэта з сумнай зайздрасцю, хоць гэта не зайздрасць гультаёў: «суседавы куры заўсёды большыя яйкі нясуць» ці «багатаму чорт дзяцей калыша». Роздум, горкі роздум.

У нас любяць гаварыць пра агітацыю. Ствараюцца цэлыя ўстановы, распрацоўваюцца сістэмы, выпускаюцца сотні кніг і брашур, абараняюцца кандыдацкія і доктарскія дысертацыі... і ўсё ўпустую...

Капіталізм жа нібыта і не агітуе за сябе. Лепшая агітацыя — само жыццё. Тыя ж самыя вуліцы Заходняга Берліна. Тыя ж самыя вітрыны магазінаў і самі магазіны, строгім гаспадарскім вокам дагледжаныя дамы, непадобныя адзін на адзін, як непадобны дзеці розных бацькоў. Тут цяжка знайсці не толькі аднолькавыя дзверы, а дзве аднолькавыя ручкі на дзвярах.

На вуліцах нанач прыпаркоўваюцца аўтамабілі — разнаколерны канвеер прыціснутых адна да другой машын. Тут таксама цяжка знайсці дзве аднолькавыя маркі — такая вялізная гама мадэляў распрацавана ў свеце, і многія з іх сабраны тут, як на выстаўцы.

Непатрэбна ніякая агітацыя супраць сацыялізму. Яго страшэнная беднасць, наплывізм на чалавека і яго памкненні, дзікае варварства ва ўсім — найлепшы агітатар супраць яго.

З усяго сказанага было б няправільна зрабіць вывад, быццам над усёй Германіяй, ці над усім заходнім светам стаіць бяс. хмарнае неба, а калі і ідуць дажджы, то залатыя. Хапае клопатаў і ў іх — і меншых, і большых. Але чалавек. Чалавек — перш за ўсё!

Не хочацца ўспамінаць, а ўспамінаецца...

Успамінаецца дарога сюды ў цягніку «Масква — Берлін». Яшчэ нядаўна, да перабудовы, да барацьбы з алкагалізмам,— нармальны чысты цягнік, калі не з максімумам, то з неабходным мінімумам даброт для пасажыраў. А сёння — без цяпла: яго паспяшаліся адключыць, без буфета — шклянку мінеральнай вады не знойдзеш, калі не ўзяў з сабой, кавалка хлеба не знойдзеш, калі зноў жа не паклаў у чамадан, з мокрымі — хоць выкручвай — прасцінамі, коўдрамі. А ў Быкава і ў Кашкурэвіча хворыя бронхі, ім і пры нармальным цяпле цяжка дыхаецца. Таму ўсе спалі не распранаючыся. Як салдаты на вайне.

Не хочацца ўспамінаць, але... Нікому з удзельнікаў «Тыдня» не абмянялі ні рубля на замежную валюту. Пра гэтыя «неабмяняныя» рублі прыкра гаварыць, і не гаварыў бы, калі б...

Вольга Вітальеўна Алейнікава разам з яшчэ адным доктарам павезлі на самалёце двух цяжка хворых (усё той жа лейкоз!) дзяцей з іх мацяркамі ў клініку універсітэта імя Гётэ ў Франкфурце-на-Майне. Ні дактарам, ні маці наш чуллівы рэспубліканскі ўрад і наша Міністэрства аховы здароўя не знайшлі магчымасці абмяняць ні капейкі. Калі клініка універсітэта, калі доктар Гарайн узяліся лячыць дзяцей, то хай бяруць на сябе і ўсе астатнія клопаты!

І гэта яшчэ не ўсё. Аднаму дзіцяці ў самалёце стала дрэнна. Клініка ўжо нічога не магла зрабіць, дзіця памерла. І вось: няўцешная маці над мёртвым дзіцем. У чужой краіне. Не ведаючы мовы. Без капейкі грошай (нашы грошы — не грошы). Пазванілі ў савецкае консульства. Адтуль сказалі, што сёння ніхто прыехаць не можа. Прыедуць толькі заўтра пасля абеду! Заўтра была субота, і да гэтага заўтра было яшчэ болей, чым суткі!..

Нармальныя людзі разумеюць гора. Работнікі клінікі сабралі грошы для маці, клініка ўзяла на сябе выдаткі на труну і на перавозку цела дадому...

І сёння яшчэ многія з партыйных апаратчыкаў з настойлівай упартасцю балабоняць пра вернасць сацыялістычнаму выбару. Якому сацыялізму? Сацыялізму партапарату? Сацыялізму генацыду трыццатых гадоў? Сацыялізму Чарнобыля?

(Працяг на стар. 12).

Кніганіс

Лунинец

М. КАЛІНКОВІЧ. Лунінец. Гісторыка-эканамічны нарыс. На рускай мове. Мінск, «Полымя», 1990.

Гэта апошняя яго кніга, якую паспеў патрымаць у руках Мікола Калінковіч. Сталася так, што па роду службы ён вымушаны быў жыць далёка ад роднай Беларусі — спачатку ў Ашхабадзе, потым у Маскве, а апошнія дні свайго кароткага веку ў Тбілісі. Але дзе б ні знаходзіўся, у творах сваіх расказваў пра беларусаў, якія гэтаксама, як і ён сам, жылі ў іншых рэгіёнах краіны. Да ўсяго М. Калінковіч падрабязна даследаваў учарашні дзень роднага яму кута. Вынікам гэтага сталі кнігі «Палескія дарогі Блока» і «Лунінец». Апошняя раней выходзіла ў выдавецтве «Беларусь». Цяпер жа пабачыла свет у значна дапоўненым і дапрацаваным выглядзе.

Э. КАРПАЧОЎ. Гарачыя каскі. Аповесць і апавяданні. На рускай мове. Бібліятэчка часопіса «Пограничник», 1989, №5.

Эдуард Карпачоў — родам з Беларусі, першую сваю кнігу выдаў у Мінску. Цяпер жыве ў Маскве, але ў творах сваіх паранейшаму звяртаецца да родных мясцін. Кніга «Гарачыя каскі» — у гэтым сэнсе не выключэнне. У аповесці «Доўгае чаканне ў Цытадэлі» расказваецца пра тых, хто нясе службу на заходняй граніцы. Тэматычна з гэтым творам звязаны і апавяданні «Гарачыя каскі» і «Саша ці не Саша».

Леанід Прокша
УРОК ЛЮБВІ І НЯНАВІСЦІ

Л. ПРОКША. Урок любві і нянавісці. Раман. Мінск. «Мастацкая літаратура», 1990.

Новы раман Леаніда Прокшы напісаны востра, займальна, мае прыгодніцкі характар. Пісьменнік праўдзіва адлюстраваў складаны пасляваенны час, калі вялася вострая барацьба за сацыяльнае і нацыянальнае разняволенне. Сярод герояў — маёр Савецкай Арміі Павел Корнеў, паручык Войска Польскага Стэфан Гронскі, медыцынская сястра Кася Зарэмба і іншыя. Прадстаўнікі розных народаў, яны задумваюцца над няпростымі працэсамі ў тагачасным жыцці, разумеюць, што небяспечна, калі адзін народ адасобліцца ад другога, палічыць сябе выключным.

Час мяняць «традыцыю»!

У 7-ым нумары «Народнай асветы» за сёлетні год змешчаны артыкул Е. Чапко з Масквы «Особенности преподавания русской литературы в условиях Белоруссии». Я як беларус і філолаг-русіст, уважліва пазнаёміўся з ім.

Скажу шчыра, артыкул гэты мне падаўся псеўданавуковым, і вельмі прыкра, што з'явіўся ён у навукова-педагагічным часопісе. Чаму? Мяркуйце самі. Е. Чапко піша: «Можно утверждать, что именно курс русской литературы лежит в основе литературного образования в средних школах республики. В качестве доказательства предлагаем результаты анкетирования студентов первого курса филологического факультета БГУ им. Ленина»... Аўтарка артыкула падае табліцу, якая «красамоўна» выдае «на-гара» яе сцвярджэнне таго, што менавіта курс рускай літаратуры ляжыць у аснове літаратурнай адукацыі ў сярэдніх школах Беларусі. У табліцы ў працэнтах паказана, як на гэтых першакурснікаў пад час вучобы ў сярэдняй школе «аказвалі ўплыў на іх літаратурную адукацыю» ўрокі беларускай і рускай літаратур. Вынікі анкеты не на карысць беларускай літаратуры. Толькі на 17% апытаных першакурснікаў станоўча паўплывалі на іх літаратурную адукацыю ўрокі беларускай літаратуры. А вось урокі рускай — аж на 31%, амаль удвая болей.

А чаму так здарылася? Ці задумалася аўтарка артыкула? Дастакова зірнуць на колькасць гадзін па абедзвюх літаратурах, каб пераканацца, што на рускую літаратуру адведзена 18 гадзін, а на беларускую — толькі 13,5. Вось вам і адказ, дзе «сабака закапаны», адкуль бярэцца той 31%.

Сёння, на мой погляд, трэба кардынальна мяняць «традыцыю» вывучэння рускай і беларускай літаратур у школах Беларусі. Рэспубліка ж аб'явіла сябе суверэннай дзяржавай, якая абавязваецца ў дэкларацыі (Артыкул I) гарантаваць «неад'емнае права на самавызначэнне дзяржаўнасці беларускай мовы, вяршэнства народа ў вызначэнні свайго лёсу...»

1 верасня ўступіў у сілу Закон «Аб мовах у Беларускай ССР». Але калі мы зазірнём у вучэбныя планы сярэдняй

Ці ж брацкі падзел?

Што б ні гаварылі, як бы ні іранізіравалі з так званых «макулатурных» выданняў, аднак жа бясспрэчна, што яны карыстаюцца ў чытачоў велізарнай папулярнасцю. Зрэшты, будзем справядлівымі — не ўсё, што распаўсюджваецца праз макулатурныя талоны, адносіцца да разраду «Анжэліка і кароль». Сустракаюцца тут і кнігі, якія вытрымліваюць самыя строгія крытэрыі.

«Литературные сказки народов СССР» — адна з такіх. Выдавецтва «Правда» расшчодрылася і выдзеліла паперы ажно на мільён экземпляраў гэтай кнігі. Калі ўлічыць, што аб'ём яе амаль 42 улікова-выдавецкія аркушы, няцяжка ўявіць, колькі паперы затрачана, альбо, інакш, колькі лесу ўратавана: «макулатурныя» кнігі друкуюцца, як вядома, на паперы, атрыманай шляхам пераапрацоўкі макулатуры.

І ўсё было б добра, калі б не адна акалічнасць, калі б не тая самая лыжка (а ды і не адна!) дзёгцю...

Складальнік тома (ён жа аўтар уступнага артыкула і заўваг) В. Калугін, дае высокую ацэнку літаратурным казкам. Што праўда, то праўда. Цудоўныя казкі створаны талентам прадстаўнікоў многіх літаратур СССР, у тым ліку і беларускімі літаратарамі. Чаго варты, скажам, неўміручыя «Казкі жыцця» Якуба Коласа! Яны належаць да лепшых старонак творчасці нашага песняра.

Натуральна, што пачаў гартаць кнігу, шукаючы коласаўскія казкі (хоць адну). Ды дзе там!

Вельмі ж мудра распарадзіўся складальнік плошчай тома, адвёўшы большую палову яго... рускім пісьменнікам. Ніхто, зразумела, нічога не мае супраць цудоўных казак М. Гогаля, У. Даля, Л. Талстога, М. Горкага, І. Буніна і іншых. Але ж ёсць у іх і дастойныя «сапернікі» ў іншых літаратурах народаў СССР.

Падзел, сапраўды, «брацкі». Старэйшы брат прадстаўлены 70-ю творамі, а ўсе іншыя толькі 49-ю. Прапорцыя па імёнах тая ж, па сутнасці: 20 — рускіх пісьменнікаў і 19 — нацыяналаў, літаратараў Украіны, Малдавіі, Казахстана, Арменіі, Грузіі, Азербайджана, Беларусі, Латвіі, Літвы, а таксама некаторых аўтаномных рэспублік і нацыянальных акруг. Пры такім падзеле беларусам яшчэ пашанцавала: надрукавана адна казка З. Бядулі і дзве — У. Караткевіча (пераклад на рускую мову Б. Якаўлева і В. Шчадрыной).

І яшчэ адзін штрых. В. Калу-

Чытаючы часопісы

З ВІХУРЫ «КРУЧАНЫХ ДЗЁН»

Як і папярэднія, багаты на змястоўныя матэрыялы чарговы, восьмы нумар часопіса «Полымя». Аднак, бадай, не памылюся, калі скажу, што пераважная большасць чытачоў пачне знаёмства з публікацыямі з раздзела «З літаратурнай спадчыны». Так ужо сталася, што дзякуючы Яўгену Лецку мы мелі магчымасць пазнаёміцца са шмат якімі творамі аднаго з ахвяр сталінізму Лукаша Калюгі. У тым ліку з незавершанымі аповесцямі «Дзе косці мелюць» і «Утрапенне», якія прыйшлі з небыцця на старонкі «Маладосці» (1989, №12).

Аднак у той час, калі яго, як і многіх, абвінавачвалі ў «контррэвалюцыйнай дзейнасці», Л. Калюга працаваў і над раманам «Пустадомкі». Гэты твор таксама ўдалося адшукаць Я. Лецку. Яго і публікуе «Полымя». Адразу звяртаеш увагу на час і месца напісання рамана, што пазначана ў канцы: «Красавік 1933 — ліпень 1935 г., сутарэнне ў Менску — у Ірбіце на выгнанні».

Падумаць толькі: арышт, які прыпаў менавіта на гэты перыяд, допыты, няўпэўненасць у далейшым лёсе, а пісьменнік жыве новымі задумамі! Мо таму, што яму тады споўнілася ўсяго дваццаць чатыры гады, шмат друкаваўся, карыстаўся папулярнасцю і валодаў, мовячы словамі Кузьмы Чорнага, сказанымі з іншай нагоды, талентам і не абы-якім.

Задаткі гэтага таленту і даюць аб сабе знаць у завершаных старонках рамана, а што ён мусіў працягвацца — сумнення быць не можа. Ёсць у творы і пэўная фрагментарнасць, эскізнасць, заўважаецца свайго роду і пераклічка з тым, што пісалася адначасова. Скажам, адзін з галоўных герояў Марка Чугаеўскі атрымлівае ліст ад свайго брата, маладога пісьменніка Данілы Невядомскага. Скардзіцца на гарадское жыццё-быццё, адначасова задумваецца і над сутнасцю складаных працэсаў, якія адбываліся на Беларусі, ды і па краіне ў цэлым. «Любы браце! — пісаў ён Марку на вёску. — Ты заўважыў, што людзі кручаных дзён сіверынаю чуваць? Як бы ў чыстым полі, дзе адно дзікае лінялае неба было тупа звісшы, раслі й гадаваліся яны».

Але ж падобныя думкі — крыху інакшымі словамі — былі ўжо ў аповесці «Дзе косці мелюць». Там гэтак жа балюча, крыўдліва гучала туга па незваротнасці пройдзеных дзён, калі з імі адышло шмат нерушавага, забыліся многія народныя святы і звычаі. Канешне ж, калі б Л. Калюгу далі час завяршыць гэтыя абодва творы, ён бы пазбавіўся такіх паўтораў, штосьці апусціў бы, нешта канкрэтызаваў. Пакінуў бы толькі найбольш важнае, тое, што найлепшым чынам працавала на выяўленне мастакоўскай задумы.

Задума ж у рамане значная. Л. Калюга адным з першых задумваўся над непрыкаянасцю чалавека, які нарадзіўся і вырас у вёсцы, у чужым для яго горадзе. Нездарма Даніла Невядомскі скардзіцца Марку на свой лёс: «Як пустадомкі, туляемся каля чужых халодных вуглоў. Ды калі й свой па ордэры завядзецца, у ім, не сагрэтым пакаленнямі, пуста і няўтульна, як у ваўкаўні». Гэтае адчуванне, Л. Калюга не сумняваўся, прынесена якраз «кручанымі днямі», што адрывалі людзей ад зямлі, нацыянальнай глебы, шпурлялі ў вір падзей, на жаль, пакуль што неўсвядомленых, а таму да канца і незразумелых.

«Пустадомкавасць» для Л. Калюгі — пэўная сацыяльная з'ява, таму ён так пільна прыглядаецца да асобных носьбітаў яе. Ці не найбольш характэрны сярод іх — Даніла Невядомскі. Нездарма ў народзе пра такіх кажуць: малады ды ранні. Даніла хутка і не надта шкадуючы развітаўся з блізкім, родным асяроддзем, падаўся шукаць славы, друкуецца, рыхтуе кнігі. І ўсё ж, як бы там ні было, гэта звычайнае перакаці-поле. Без трывалых каранёў, без моцнай глебы пад нагамі. Невыпадкова і прозвішча ў Данілы адпаведнае. А прозвішчам гэтым ён ганарыцца. Калі чарговая каханка атрымала ад Данілы запрашальную запіску каб пайсці ў кіно, яна было засумнявалася, ці сапраўднае гэта прозвішча. Нават не схавала свайго здзіўлення: «вельмі благі псеўданім». На што Даніла катэгарычна заявіў: «Вы памыліліся. Хоць такі подпіс і стаяў пад невялічкімі абразкамі з сялянскага жыцця, усё ж ён мае ўласнае прозвішча. Не вельмі ўважаю псеўданімы».

Невядомскі не надта прытрымліваецца маральных прынцыпаў ва ўзаемаадносінах з тымі, на каго кінуў вока. Па сутнасці ў яго такіх прынцыпаў няма і быць не можа. Ці то жартам, ці нахабствам, але свайго абавязкова дамагаецца. Няважна, разведзеная кабеціна гэта ці маладая, рамантычна-наіўная дзяўчына...

У больш прывабным святле абмаляваны паэт Арсень Пакумейка, хоць ён мала ў чым сягае далей Невядомскага. Мімаходзь кінутыя аўтарам словы — «Вы, напэўна, ведаеце такіх малых» — гучаць крыху іранічна. Але Арсень, у адрозненне ад Данілы, яшчэ не такі завершаны пустадомак. Прынамсі, ён здатны на шчырыя ўзаемаадносіны, не разменьваецца ў пачуццях, кахае Любу, з якой некалі вучыўся. І вершы яго не пазбаўлены непасрэднасці, і сам чалавек таварыскі, хоць у асяроддзі, да якога ён належыць, гэта нікому, бадай, непатрэбна: «Было людзям на смех і сабе на глум Пакумейку шчырым быць. Так, прынамсі, яму й Невядомскі раіў, але пераканаць не мог».

Лукаш Калюга ўвогуле ў гэтым рамане, як ні ў адным сваім творы, паказвае літаратурнае, а правільней — калялітаратурнае асяроддзе. І трэба сказаць, у вельмі непрыглядным выглядзе. Чаго варта прозвішча аднаго з крытыкаў — Цытатавіч?! Да ўсяго і «сам вялікі пісьменнік», да якога за парадай даволі часта заходзяць і Даніла Невядомскі, і Арсень Пакумейка, хоць часам і здольны спагадліва паставіцца да творчай моладзі, але грубаваты, самаўпэўнены і сваімі рэзкімі, хоць у нечым і справядлівымі прысудамі можа зняважыць чалавека.

Усяму гарадскому, як на думку Л. Калюгі, чужароднаму, у рамане супрацьстаіць вясковае жыццё. Носьбіт трывалай народнай маралі Марка абмаляваны аўтарам з сімпатыяй, паказаны чалавекам, лучным з прыродай.

Значны падтэкст у творы набывае вобраз сонца. Яно ўвасабляе сабой і жыццё на зямлі, і вечнасць быцця, і кароткасць, імгненнасць чалавечага лёсу. Пастаянна гэтую сувязь з сонцам адчувае Марка, які ў лісце да сябра заўважае: «Я не магу... Не магу, калі надвечар бачу яго на захадзе недзе там над нашым, Шылавіцкім, борам

школін Беларусі на 1990—91 навучальны год, то пабачым, што закон гэты амаль не паўплываў на лёс беларускай літаратуры. Усё тыя ж 13,5 гадзіны! А падручнікі? Усё тыя ж, што і 5, і 10 гадоў таму назад.

Наспеў час, калі не на словах, а на справе трэба павярнуцца тварам да сваёй роднай культуры.

Давайце мяняць «традыцыю» ў літаратурнай адукацыі вучняў сярэдніх школ, калі прыярытэт аддаваўся (і аддаецца дасюль!) няроднай (рускай) літаратуры. І не толькі і не столькі рускай — гаворка павінна весціся аб кардынальных зменах у вывучэнні ў сярэдняй школе літаратуры роднай, бе-ла-рускай!

П. КАПЧЫК,
г. Ізяслаў. **філолаг.**

гін настойліва падкрэслівае, што прадстаўнікі «іншых» літаратур толькі тое і робяць, што вучацца ў рускіх пісьменнікаў, І прыклады прыводзіць адпаведныя: казка А. Туманяна — рыхтык наследаванне А. Пушкіну, П. Цвірка блізкі да апрацовак казачных сюжэтаў К. Ушынскім і А. Талстым...

Міжволі бянтэжышся, чытаючы пасля гэтага заключную выснову складальніка: «шматнацыянальная савецкая літаратура можа грунтавацца толькі на дасягненнях усіх нацыянальных літаратур народаў СССР». Дасягненні ж гэтыя кніга «Литературные сказки народов СССР» шмат у чым, шчыра скажам, праігнаравала...

З. МАРЦІНКЕВІЧ.
г. Мінск.

Маё адкрыццё Ільяшэвіча

Хведар Ільяшэвіч належыць да тых заходнебеларускіх паэтаў, як Наталля Арсеньева, Казімір Сваяк, пра якіх было забаронена пісаць.

Як ні дзіўна, але год яго нараджэння і смерці (1910—1948) даведваемся не з мінскіх выданняў, а з беластоцкай «Нівы». Там жа пералічваюцца кнігі Хведара Ільяшэвіча, якія выйшлі ў даваеннай Вільні: «Веснапесні» (1929), «Зорным шляхам» (1932), «Захварбаваныя вершы» (1936). Вось і ўсе звесткі. Заглянуў у нашы энцыклапедыі — нічога, хоць бы напісалі што-небудзь адмоўнае, але сказалі б, дзе нарадзіўся.

Праўда, не так даўно я атрымаў ліст, у якім праліваецца крыху святла на біяграфію паэта: «Пра Хв. Ільяшэвіча гавораць, што ў вайну ён узначальваў Інспекцыю беларускіх школ на Беласточчыне, прычым працаваў самааддана. Потым пайшоў ад Саветаў на захад і асеў у Германіі. Уваходзіў у мясцовую суполку «Шыпшына». Гады праз 2 пасля вайны загінуў у аўтамабільнай катастрофе».

На шчасце (поруч з «Журавінавым цветам» М. Танка і «З сялянскіх ніў» М. Васілька) захаваліся тры гэтыя Ільяшэвічавы кніжачкі з каляровымі малюнкамі на вокладках.

Зборнікі вершаў вылежаліся на працягу доўгіх гадоў. І вось цяпер як бы нанова дакранаюся да паэзіі гэтага арыгінальнага паэта. Кідаецца ў вочы надзвычайная вобразнасць, часамі з налётам песімізму. Ёсць і бадзёрыя вершы, але, на маю думку, прабіваецца нацягнутасць. Малады аўтар сядзеў у віленскай турме «Лукішкі», пэўна, за рэвалюцыйную дзейнасць. Апісвае турэмныя ўражанні, перажыванні:

Часам праз сцены, з места
Ловім водгук жыцця:
Тады ў нас дзень без зместу —
Даўгі, даўгі без канца...

Купаецца вока глыбока
Там, дзе разліты блакіт,
Далёка, далёка, далёка...

Я шчасліў тады, калі воляй
Напоўніцца родны наш край.

Безумоўна, гэтыя радкі з турэмнага побыту гавораць не толькі аб вастрыні ўспрымання і здольнасці, але і аб палітычнай свядомасці маладога чалавека (тады яму было 17 гадоў):

Калі будзем мы спаць —
Будзе лепей панам...
Хто нам можа што даць?
Мы! Ты сам!

У песнях маіх веснавіста
распеніцца
Адзвон пераможнага бою...

Ад прачытаных зборнікаў складваецца такое ўражанне, што Ільяшэвіч з вёскі трапіў у горад, дзе ўладкаваўся на працу або на вучобу, потым яго пасадзілі ў Лукішскую турму. Працуючы днём, ён мала назіраў гарадское жыццё, а вось увечары меў магчымасць услухоўвацца ў навакольныя гукі, думаць, марыць, пісаць вершы.

Калі знаёмішся са зборнікамі «Веснапесні», «Зорным шляхам» і «Захварбаваныя вершы», кідаюцца ў вочы заклікі, накшталт «Гэй!», характэрныя для паэзіі Заходняй Беларусі. Учытаўшыся, гэтага не заўважаеш. Уражвае сакавітая вобразнасць, мастацкая сцісласць.

Яшчэ аб адной старонцы жыцця нашага земляка можна сказаць некалькі слоў на падставе публікацыі Адама Станкевіча ў другой кніжцы часопіса «Калосе» за 1939 год. У канцы 1938 года выйшла праца на польскай мове маладога беларускага вучонага Хведара Ільяшэвіча «Друкарня Дому Мамонічаў у Вільні (1575—1622)». Гэта была праца на атрыманне навуковага звання пры заканчэнні Універсітэта імя Стэфана Баторыя. Слушна зазначыў аўтар артыкула: «Падбор тэмы дужа ўдалы, можа быць узорам беларускім студэнтам, якія часта выбіраюць тэмы, над якімі працаваць шкода часу».

На жаль, тое ж можна сказаць і пра многіх сучасных нашых студэнтаў.

Анатоль ІВЕРС.
г. Слонім.

«ЛіМ» ПАВЕДАМЛЯЕ

Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны

За выдатныя даследаванні гісторыі Беларусі, дасягненні ў галіне нацыянальнай мовы, літаратуры, культурна-асветнай дзейнасці медалём Францыска Скарыны ўзнагароджаны — настаўнік беларускай мовы і літаратуры, загадчык музейнага комплексу ў в. Гудзевічы Мастоўскага раёна БЕЛАКОЗ Алесь Мікалаевіч; пісьменнік, старшыня рэспубліканскай рады Таварыства беларускай мовы імя Францыска Скарыны ГІЛЕВІЧ Ніл Сямёнавіч; гісторык, член Саюза пісьменнікаў БССР ЕРМАЛОВІЧ Мікалай Іванавіч; загадчык рэдакцыі гісторыі БССР выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» ТКАЧОЎ Міхаіл Аляксандравіч.

Знаёмцеся: «Баявы таварыш»!

Са студзеня 1991 года пачне выдавацца яшчэ адзін усесаюзны камсамольска-маладзёжны часопіс — «Баявы таварыш», які будзе выходзіць як дадатак да «Советского воина». Мы не памыліліся, напісаўшы менавіта так — «Баявы таварыш», а не «Боевой товарищ» (з апошнім падпісчыкі знаёмы амаль год). У адпаведных ваенных інстанцыях нарэшце зразумелі, наколькі ўзрастае сёння нацыянальная самасвядомасць воінаў, як хочацца ім, нярэдка за тысячы кіламетраў ад роднага дому, чытаць выданні на роднай мове. Таму і вырашана «Боевой товарищ» выпускаць на некалькіх мовах народаў СССР, у тым ліку і на беларускай.

Што ж будзе ўяўляць сабой новае беларускамоўнае выданне? «Баявы таварыш» у першую чаргу адрасуецца армейскай і дапрызыўнай моладзі. Адна з важнейшых яго задач — выхаванне пачуцця патрыятызму, адданасці сваёй зямлі. Адпаведны будзе і змест «Баявога таварыша». Рэдакцыя мае намер таксама звярнуць увагу на праўдзівы паказ сучаснага армейскага жыцця, не абыходзіць самых вострых вуглоў яго. Будуць тут і публікацыі, прысвечаныя гістарычнаму мінуламу беларускага народа, яго барацьбе за сваё нацыянальнае і сацыяльнае разняволенне. На старонках дадатка чытач знойдзе матэрыялы аб так званых «белых плямах» гісторыі, звесткі з архіваў КДБ і іншых арганізацый і ведамстваў, якія дагэтуль не так часта траплялі ў друк.

«Баявы таварыш» раскажа пра беларускія нацыянальныя святы і абрады, вядомыя прафесійныя і самадзейныя калектывы, пра выдатных сыноў нашага народа.

Знойдзецца месца і апавяданням, у тым ліку пісьменнікаў-фантастаў, вершам, гумарэскам. Часопіс будзе з густам афармлены, маляўніча люстраваны.

Думаецца, многія нашы чытачы падпішуцца на новае штомесячнае выданне. Падпісны індэкс «Баявога таварыша» — 71186. Кошт аднаго нумара — 40 капеек. У розніцу дадатак паступаць не будзе.

свеціць нашай зямлі, нашаму народу...» Заўважае: «куды там што проці бацькаўшчыны?!»

Ці мог здагадвацца Л. Калюга, што чакае яго наперадзе? Мо прадчуваў: гэты твор па ўсім відаць будзе незавершаны. Інакш як растлумачыць заключныя радкі: «Новы — куды цікавейшы, непараўнальна сюжэтны пачынаўся раман. І месца дзеяння небывалае — адваротны свет. Толькі пра гэта бадай што ніколі ад мяне не будзе працягу».

Гэтаксама намаганнямі Я. Лецкі вяртаюцца з небыцця і творы Андрэя Мрыя — раман «Запіскі Самсона Самасуя», асобныя апавяданні. У гэтым жа нумары «Полымя» Андрэй Шашалевіч сустракаецца з чытачом пад сваім сапраўдным прозвішчам і ў крыху нечаканай ролі — нарысіста, краязнаўцы. Так падпісваў ён свае нарысы, замалёўкі, артыкулы, нататкі, што змяшчаў на старонках часопіса «Наш край» і газеты «Савецкая Беларусь», адкуль яны і перадрукоўваюцца.

Пазнаёміцца з гэтымі матэрыяламі важна не толькі таму, што яны пашыраюць уяўленне аб такім самабытным пісьменніку, якім быў А. Мрый. Ёсць да ўсяго яшчэ адна акалічнасць, на яе звяртае ўвагу Я. Лецка: «Сярод мноства сфабрыкаваных спраў была і такая, паводле якой Цэнтральнае бюро краязнаўства аб'яўлялася асіным гняздом контррэвалюцыі і нацыяналізму. Па гэтай справе ўзялі і Андрэя Шашалевіча, хоць па ходу «расследавання» панавешвалі і шмат іншых абвінавачванняў...»

Так што, перачытваючы краязнаўчыя матэрыялы, разумееш, наколькі значным творчым дарам валодаў пісьменнік і адначасова ў чарговы раз пераконваешся, наколькі беспадстаўнымі былі ўсе абвінавачванні. Аб аб'ектыўнасці А. Мрыя як творцы добра сведчыць супастаўленне, скажам, «Запісак Самсона Самасуя» і нарысаў. У першым выпадку шаржыраванае ўспрыманне бюракратычных асноў савецкага грамадства, якія на той час толькі закладваліся, фарміраваліся. У другім — апяванне рэчаіснасці з яе лепшага боку. Але гэта не значыць, што пісьменнік прывык да нейкіх адных фарбаў — чорных альбо белых. Ніколі ён не адыходзіў ад праўды, заўсёды прытрымліваўся ўбачанага.

У правільнасці такога меркавання пераконвае гэты ўрывак з краязнаўчых нататкаў «Па Дзвіне ў Сураж»:

«—У нас (у саўгасе) работа восем часоў, у суботу ў абед звонюць, шабаш... А ў нядзелю выхаднэй дзень. Сена ляжыць. Панядзелкам дож пайшоў, сена й паплуло! Якая гэта правіла?... Не, з зямлёю трэба так: з пеўнямі ўставай, з курамі кладзіся! Во як трэба ў нашым жыцці! Ніхто етага ні перакруціць».

Пісьменнік рашуча выступаў супраць таго, што вяло да дэнацыяналізацыі. Абураўся, калі хтосьці адмаўляўся ад свайго, кроўнага. У нататках «Па Дзвіне ў Сураж» ён паведамляе, як нейкі разумнік прапаноўваў «перамяніць назву гэтага горада на больш сучасную». Праўда, мясцовае краязнаўчае таварыства «падкрэсліла немэтазгоднасць перамены». Бачыце, адкуль гэты пачатак — усё старое нішчыць, назвы замяняць, гістарычнай памяці пазбаўляць? Каб паступова ператварыць беларусаў у манкуртаў. Каб зрабіць з іх нешта аморфнае, што называецца ў нас «савецкі народ».

Андрэй Мрый і ўзнімаў свой голас — пісьменніка, грамадзяніна, проста сумленнага чалавека — у абарону беларускасці. З павагай ставіўся да даўніны і не прамінаў выпадку, каб сказаць добрае слова пра Беларусь новую, абуджаную. Тэма, якая ўзнімаецца ў нататках «Кааператары гандлююць!», і для сённяшняга дня актуальная. «Малюнкі з кааператыўнага жыцця», як пазначаны іх жанр, ухвала новага, але гэта не лозунгавае ўслаўленне. Змены падаюцца праз сялянскі побыт, праз народную стыхію — «Чаму нам не пець, чаму не гудзець?!», «Кірмаш у Паповай горцы», «Кірмаш у Прапойску». Свайго роду замалёўкі, якія і асобна чытаюцца, а разам узятыя — штрыхі, пераканаўчыя, выразныя — новых традыцый, што ўспрымаюцца як працяг спаконвечнага.

Замалёвачны характар маюць нататкі «Цар Максіміліян» у вёсцы» і «Статуя Леніна», але напісаны яны пяром чалавека неабыякавага да змен у жыцці. Расказвае, як сяляне ў нардоме паставілі вядомы фальклорны твор, і не хавае захаплення — у духу часу: «Асабліва спадабалася, як мужык пасля забойства Максіміліяна ўзабраўся на трон і магутным голасам закрычаў:

— Пралетарыят перамог! Няма больш цароў!»

Як бачым, восьмы нумар «Полымя» пакідае прыемнае ўражанне.

Раім зазірнуць і ў восьмы нумар часопіса «Беларусь». Зноў дзякуючы Я. Лецку тут ёсць мажлівасць пазнаёміцца з жыццём і творчасцю вядомага беларускага культурнага дзеяча Язэпа Лёсіка, імя якога пасля доўгага замоўчвання пачало згадвацца толькі некалькі гадоў назад. «Беларусь» прадстаўляе Я. Лёсіка ў падборцы «Анталогія беларускага апавядання 20-х гадоў». Менавіта пра Я. Лёсіка ў свой час М. Гарэцкі пісаў: «Гэтага слаўнага пісьменніка чакаець яшчэ слаўнейшая будучыня». На жаль, класік нацыянальнай літаратуры тут памыліўся. Не ў сэнсе, канешне, вартасці твораў Я. Лёсіка — у гэтых адносінах яго мастакоўскі густ быў бездакорны. Проста М. Гарэцкі і падумаць не мог, што неўзабаве жыццё падрыхтуе Я. Лёсіку — а хутка і яму самому — такія варункі.

Язэп Лёсік быў арыштаваны яшчэ ў 1930 годзе і высланы ў Саратаўскую вобласць. Яму нават дазволілі працаваць выкладчыкам у мясцовым інстытуце. Тут хутчэй за ўсё сказалася хадайніцтва Якуба Коласа: «...мала хто ведае, што Лёсік даводзіцца народнаму песняру дзядзькам па матчыным радаводзе, што паміж імі была не толькі чыста сваяцкая, але і духоўная роднасць, шчырае сяброўства і яны ўплывалі адзін на аднаго ў пару станаўлення». Праўда, калі ў 1938 годзе на Я. Лёсіка данёс адзін са студэнтаў, лёс гэтага сейбіта на нацыянальнай ніве быў прадвызначаны. З Саратаўскай турмы ён ужо не вызваліўся, калі памёр і дзе пахаваны — невядома.

Наколькі дазваляюць факты, Я. Лецка прасочвае асноўныя перыпетыі біяграфіі Я. Лёсіка. Яго лёс тыповы для кожнага, хто ў складаны час сацыяльных пераўтварэнняў не хацеў жыць і дзейнічаць па чыёйсьці ўказцы, а прымаў заўсёды самастойныя рашэнні. Гэтая самастойнасць часам прыводзіла і да памылак, хістанняў, палітычнай пераарыентацыі. Я. Лёсік быў сярод тых, хто абвяшчаў Беларускую народную рэспубліку (БНР), прымаў удзел у фарміраванні яе праграмных дэкларацый. Але ён жа ўваходзіў у склад Рады ў час кайзераўскай акупацыі Беларусі, калі ж прыйшлі белапалякі супрацоўнічаў у газетах «Звон» і «Беларусь». Апошнюю з 1920 года і рэдагаваў. Разам з тым менавіта Я. Лёсік, а ніхто іншы пераклаў на беларускую мову «Маніфест Камуністычнай партыі». Ён жа адным з першых далучыўся да пераўтварэнняў, якія праходзілі ў Савецкай Беларусі, вёў вялікую культурную, навуковую дзейнасць. Нададзенае яму званне акадэміка Акадэміі навук БССР вернута толькі нядаўна.

Чакае свайго вяртання да чытача публіцыстычная спадчына Я. Лёсіка, прасякнутая пафасам нацыянальнага адраджэння, абуджэння народа, яго барацьбы за нацыянальнае і сацыяльнае разняволенне. Уяўленне ж пра Я. Лёсіка-празаіка можна атрымаць па творах, прадстаўленых у «Беларусі».

Вернута да жыцця яшчэ адна частка забытага з віхуры «кручаных дзён». Увайшло ў літаратурны ўжытак тое, што зноў і зноў пераконвае: «куды там што проці бацькаўшчыны».

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

Уладзімір СКАРЫНКІН

Расіі рук

Як быццам ёсць на свеце дзве Расіі —
Расія духу і Расія рук.

Я. ЕЎТУШЭНКА.

У сны мае
прыходзяць з рускіх казак
Мікула Селянінавіч з Ляўшой.
З дзяцінства
адчуваю абавязак
Расію рук я зразумець душой.

Не тую,
што махае кулакамі,
Гатовая прыбраць усё да рук.
Расію з працавітымі рукамі
Імкнуся я спасцігнуць без прынук.

Вялі хрыстапрадаўцы,
лжэмесіі
Расію рук «наперад» за сабой.
Ды гэтыя паходы для Расіі
Звычайна завяршаліся бядой.

Расію ратавалі не асілкі.
Расія рук,
рыззя і лахманоў
Крывёй і потам
сплачвала памылкі
Ілжэпрарокаў і балбатуноў.

Нялёгка скінуць з плеч
бяду-прыдуху.
Не хопіць духу —
і сагнешся ў крук.
Адначасова і Расіяй духу
Ва ўсе часы была Расія рук.

Яна не толькі свой хамут цягнула...
На Пскоўшчыне
пад скогат завірух
Расія рук
у Пушкіна ўдыхнула
Свой рускі —
горды і нязломны —
дух.

А як прыгожа некалі спявалі
Яе сарвігаловы-малайцы!
Настойліва дух рускі выбівалі
З яе духоўныя ілжэайцы.

Нахабны ашуканец і злачынец —
Мярзотны хам,
чыя душа з душком,
У дзікай
і пакутлівай краіне
Сябе нярэдка адчуваў бажком.

Расія рук!
Няўжо не хопіць духу
Табе ўсе крыўды
выказаць услых,
Рашуча скінуць,
як бяду-прыдуху,
З магутных плеч
нахлебнікаў усіх?

Настальгія

Данчык выконвае «Зорку Венеру».
Як пуцяводная зорка,
яна
Ззяла над ім і ўмацоўвала веру,
Што ў чалавека радзіма адна.

Там,
дзе народжаны песні матулі,
Там,
дзе гняздзяцца ягоныя сны.
Бліснулі слёзы ў спадарыні Юлі.
Хочацца верыць —
ад шчасця яны.

Дайце,
гітарныя струны тугія,
Нераўнадушнаму сэрцу адказ:
Вы адчуваеце,
што настальгія
Пальцамі Данчыка кратае вас?

Хочацца пець у хвіліны такія.
Толькі чамусь авалодала мной
Неспадзявана зусім настальгія
Па Беларусі цнатлівай,
лясной.

Па Беларусі,
дзе, быццам нявеста,
Родная мова сядзіць на куце,
Дзе ад сівога Мсціслава
да Брэста
Папараць-кветка ў дубровах цвіце.

Прышэсце Антыхрыста

Прыйшоў Антыхрыст на Зямлю
Са світаю сваёю.
Сказаў:
— Я ўсю зямлю залью
Слязамі і крывёю.
Затое Хам,
што гандляром
Быць можа толькі ў краме,
Адразу стане святаром
У праваслаўным храме.
Затое адпраўляць імшу
Зноў будуць душагубы,
Што маюць подлую душу,
Пагардлівыя губы.
І што з таго,
што нож крывы
Зноў у пашане будзе?
Бо што датычыцца крыві,
Дык гэта ж дробязь,
людзі!
На вашай збэшчанай зямлі
Не ўпершыню ёй ліцца...

І людзі дружна пачалі
На вылюдка маліцца.

Калыханка для ўнучкі Насці

Ёсць за сінімі лясамі
Горад казачны,
які
Паднялі нядаўна самі
Нашы, Насця, землякі.

Там цагляных веліканаў
Села ў полі чарада.
Там з вадаправодных кранаў
Льецца мёртвая вада.

Пад бярэзіну крывую
Там ужо каторы год
Ездзіць па ваду жывую
Дружна з бутлямі народ.

Выпаўзлі на бераг ракі,
Там з забруджанай ракі.
Там галубкі-небаракі
Чорныя,
нібы гракі.

Кожны дзень у горад новы
Прылятае шматгаловы,
Ненажэрны,
страшны цмок,
Што мянушку мае Смог.

Ад яго ўцякла ты ўчора
З надыходам цемнаты.
Спі спакойна:
ў гэты горад
Доўга не паедзеш ты.

Ветах у зеніце

Ноч выдалася светлай —
на зачын.
Сказаць уголас хочацца:
— Зірніце,
Як ярка ветах свеціцца ў зеніце
Сярод пушыстых,
лёгкіх аблачын.

Я ледзьве не астыў
і не патух...
І гэты
з маладым запалам ветах,
І зоры набрынялыя
ў прасветах
Высока, веру
узнясуць мой дух.

Дурманіць пах сузор'яў галаву,
Апухлую ад крыку і гаворак.
І вось ужо
сярод маўклівых зорак
Я сам, здаецца,
ветахам плыву.

Цяпер сагрэць не здолее мяне
З-пад ног натоўпам выбітая глеба.
Закон прыроды:
хто бліжэй да неба,
Гаму абавязкова халадней.

Ноч выдалася светлай —
на зачын.
Сказаць уголас хочацца:
— Зірніце,
Як ярка ветах свеціцца ў зеніце
Сярод пушыстых,
лёгкіх аблачын.

Іван НАВУМЕНКА

Несмяротныя людзі

АПАВЯДАННЕ

I

ДЗЕНЬ, відаць, будзе сонечны.

Пахаджваючы па пляцоўцы станцыі, Пархімовіч чакае рэйсавы аўтобус, які ходзіць у два самыя паўднёвыя гарадкі, размешчаныя ў небяспечнай пасля чарнобыльскай катастрофы мясцовасці. Раней мала каму вядомыя, цяпер гэтыя гарадкі маюць сумную славутасць. Адзін з іх, па чутках, збіраліся высяляць, але пакуль што абмежаваліся так званай дэзактывацыяй: вывезлі з вуліц, двароў верхні пласт зямлі, памылі, пафарбавалі парканы, сцены дамоў, з некаторых хацін, хлявоў знялі старыя, гонтавыя і саламяныя стрэхі, зарослыя зялёным мохам, замяніўшы шыфернымі.

З абодвух гарадкоў — мястэчак па-ранейшаму — у абласны горад ходзяць аўтобусы. Людзі прыязджаюць і ад'язджаюць. Але гэта тубыльцы мясцін, якія крануў чорным крылом Чарнобыль. Іншыя, не лічачы службовых асоб, у паўднёвыя раёны ездзіць баяцца. Дзіва няма: адтуль паўцякалі многія настаўнікі, урачы, аграномы, іншы службовы люд.

У самім абласным горадзе, дзе цяпер жыве Пархімовіч, неспакойна. Тут таксама ёсць радыяцыя, хоць і невысокая, і па гэтай прычыне часта ўзнікаюць у горадзе мітынгі, нават забастоўкі. Гараджане патрабуюць чыстых ад нуклідаў прадуктаў, лепшага медыцынскага абслугоўвання. Па чутках, лік захворванняў, асабліва горла, бронхаў, шчытавідных залоз, расце. Ад радыяцыі гэтыя хваробы ці проста ад страху — невядома. Вучоныя пакуль што спрачаюцца.

Кажуць, што гараджанам хутка будуць плаціць па пятнаццаць рублёў на чалавека ў месяц — так званыя «грабавыя».

Каля аўтастанцыі Пархімовіч нечакана спатыкае настаўніка Белаконя, які выкладаў гісторыю і геаграфію ў суседняй з ягонай школай васьмігодцы. Белаконь драбнаваты ростам, паставай і вельмі задзірысты. Адзін час ён працаваў у той жа, што і Пархімовіч, дзесяцігодцы, размешчанай у вялікім бязлесным сяле, дзе былі сякія-такія выгоды: паштовае аддзяленне, камбінат бытавога абслугоўвання, клуб, у якім амаль штодзень паказвалі кіно, дый да чыгункі было бліжэй.

Чарнобыль зраўняў вялікае, падобнае на стэпавае Пархімовічава сяло і суседнюю, атуленую хмызамі Белаконеву вёску. Абодва паселішчы трапілі за дрот мёртвай зоны, а людзей, у тым ліку і настаўнікаў, выселілі.

— Дзе ты цяпер? — як бы нават насцярожана пытаецца Белаконь.

— Ды вось тут, у горадзе.

— Каб ты ды не дабіўся! Жыў у сяле і адразу ў абласны цэнтр пралез. А я з паскуднай дзіркі трапіў у яшчэ горшую. Пасёлак у балоце: ад камароў, заедзі спасу няма. Печ дымціць. Галоўнае: зямля і на новым месцы заражоная. Чатыры кюры. Па цэзію. Хто ведае, колькі па стронцыю, плутонію...

— У горадзе таксама чатыры кюры, — адказвае Пархімовіч.

Белаконь нібы не чуе.

— Кватэра вялікая?

— Трохпакаёвая. З-за дзяцей далі. Дачка і сын працавалі ў горадзе, стаялі на чарзе. Дачка нядаўна замуж выйшла. Аддзялілася...

— Шчаслівы ты.

У Белаконя новы, чырвонага колеру «Масквіч». Пархімовічу раптам штосьці цюкнула.

— Ты куды сабраўся?

— Мала куды. Хацеў бы ў рай, ды грахі не пускаюць.

— Ведаю твае грахі. Хочаш у зону. Мабыць, усе бэбахі не перавалок. Давай прабірацца разам...

Белаконь з хвіліну разважае.

— Думаеш, знойдзеш тое, што пакінуў? Чакай Пятра. Розных тарбахватаў хапае. Шастаюць па зоне, нікога не баючыся. Вопратку, тэлевізары, радыёпрыёмнікі, веласіпеды даўно вынеслі. Добра, што я свой матацыкл закапаў у хляве, у сене...

Нарэшце Белаконь адчыняе дзверцы «Масквіча».

— Садзіся. Да зоны давязу. Пяцёрку на бензін дасі?

— Дам.

І вось яны едуць.

Ніколі не ездзіў па гэтай дарозе Пархімовіч, хоць пражыў у Прыдняпроўі ўсё жыццё. Дый у абласным горадзе, у якім цяпер жыве, бываў не часта. Разы тры-чатыры, калі чыгункай вяртаўся з Мінска, з завочнай сесіі. Скончыўшы настаўніцкі інстытут, ён ужо немаладым чалавекам давяршаў адукацыю ў Мінску.

З абласнога горада ён звычайна кіраваў на Чарнігаў, рабіў яшчэ адну перасядку і злазіў на станцыі, размешчанай не гэтак далёка ад ягонага сяла. Найчасцей самалётам лятаў да Мазыра, а далей — аўтобусам.

Даўно тое было.

Шаша добрая, пакрытая гудронам. Краявіды звычайныя: гладкая, як талерка, раўніна, на ёй вялікія сёлы, за якімі ўдалечыні сінеюць лясы. Пара жытнёвая, жыта паспела амаль паўсюдна, хоць чырвоныя жукі-камбайны паўзуць па полі толькі ў асобных мясцінах.

Нарэшце дасягнулі прыдняпроўскіх ваколіц, і малюнак паступова змяняецца: болей лясоў, хвойных і лісцвяных, трапляюцца нават дубровы, а поле прабліскваe толькі невялікімі масівамі. Днепр, шукаючы сабе лепшага логвішча, нарабіў мноства старыц, зарослых па берагах асакой, чаротам, лазняком, алешнікам. Між старыц, на ўсім бачным вадзяным прасторы, зялёнымі астраўкамі размяшчаюцца кавалачкі сушы. На некаторых астравах стаяць копкі, стажкі сена.

Пасля лазы, альхі, чарналесся зноў вынырваюць дубы. Пархімовіч радуецца: значыць, яшчэ засталіся дубовыя гаі. Не ўсё вынішчана.

Нарэшце ад гудронавай шашы аддзяляецца замошчаная брусчаткай, а то і проста дзікім каменем шасейка. Гэта дарога ў размешчаныя ў небяспечнай зоне гарадкі.

Белаконь аберуч трымаецца руля. Глядзіць толькі на дарогу. Адчуваец-

ца напружанасць, натуга, з якой вядзе ён машыну.

Яшчэ вёрст праз дзесяць шасейка бяжыць між суцэльных сасоннікаў. Прыгожыя выраслі бары. Дрэвы пасаджаны, відаць, яшчэ да вайны. Роўныя, меднаствольныя сосны. Поўдзень, над лесам свеціць гарачае сонца. Яго промні прабіваюцца праз хвойную навісь, асвятляюць дарогу. Малюнак прыгожы, ідылічны.

Шаша роўная, як страла. Пракладзена нібы пад лінейку: абмінае вёскі, паселішчы. Ніводнага не трапілася на ўсім прасцягу. Толькі на афарбаваных у жоўты колер дошках указальнікаў можна прачытаць здаўна знаёмыя назвы вёсак.

Раптам Пархімовіч ловіць сябе на няпэўным пачуцці трывогі. Не ведае, адкуль трывога ідзе.

Белаконь па-ранейшаму маўкліва сядзіць, нахмурыўшы някідкі вострабароды твар, аберуч учапіўшыся за руль. Трымае сябе напружана: відаць, не часта яму прыходзіцца ездзіць.

Недзе на палавіне гэтай прыгожай дарогі Пархімовіч нарэшце здагадваецца, што яго трывожыць. Адзінота і цішыня. За ўсю дарогу не трапілася ніводнай стрэчнай машыны. Нібы вымерлі прасекі, узбочыны лесу, сама шаша. Прыходзіць думка: відаць, такой вось была дагістарычная эпоха, калі на зямлі яшчэ не паявіўся чалавек. Поўзалі вялізныя яшчары, у паветры ляталі дзіўныя істоты — птэрадактылі. Тым часам ні яшчараў, ні птэрадактыляў, ні нават звычайных птушак не відаць.

Вось і першае мястэчка. Многа разоў, пачынаючы з дзён маладосці, бываў тут Пархімовіч. Шукаў якога-небудзь транспарту, каб даехаць да размешчанага сярод суцэльных, нібы ўкраінскі стэп, палёў гарадскога пасёлка, а ўжо адтуль дабірацца ў сваё сяло.

Да першага мястэчка, або гарпасёлка, як пазней яго сталі называць, вядзе чыгунка-аднапутка. Цягнік сюды, на канечную станцыю, прыбываў ледзь не апоўначы, і заўсёды на станцыі некалькі шафёраў чакалі сваіх начальнікаў, якіх мусілі дастаўляць у палявы гарадок. Калі былі паўтаратонкі, Пархімовічу ўдавалася ўладкавацца ў кузаў якой-небудзь, а калі толькі «Пабеды» ці нават «казла», то, здаецца, ніколі.

Ён брыў тады сярод начы ў прылеглы да чыгункі гарпасёлак, з міжвольнымі дрыжыкамі мінаў зарослы соснамі курган могільніка і вёсачку, якая амаль злілася з мястэчкам.

Да мястэчка прылягалі аж дзве такія вёсачкі з някідкімі, абымшэлымі хаткамі, хлявамі, гумнамі — з паўднёвага і заходняга боку. Ноччу тут залівіста брахалі сабакі і кукарэкалі пеўні.

Іншы раз удавалася ўладкавацца ў гасцініцу, драўляную, падобную на шырокую каробку, але найчасцей брыў Пархімовіч да бліжэйшай з дзвюх дзесяцігодак, таксама драўлянай, з нейкім адмысловым завостраным дахам, грукаў ботамі ў дзверы, і глухаваты вартаўнік пускаў яго перабыць рэшту ночы ў якім-небудзь класным пакоі.

Нічога асаблівага не ўяўляла сабой драўлянае мястэчка. Хоць мела ў тутэйшай балотна-лясной і палявой мясцовасці пэўную вагу: вясной і восенню збірала вялікія кірмашы. Летам яно зелянела, прыгажэла, бо таполі, акацыі, мнагалікія сады як бы хавалі шэрую паныласць дамкоў, абшарпаных мураванак, гаспадарчых будынкаў.

Мястэчка цяпер зусім не тое, якое памятаў Пархімовіч. Чалавек, які не быў тут гадоў дваццаць, гарадка бадай што не пазнае. Дамкі, катэджыкі каменныя, размаляваныя ў белы, зялёны, жоўты колеры. Яны стаяць між дрэў і як бы нагадваюць курортнае месца.

Зрэшты, дзіва няма. Мясцовыя землі давалі неблагі ўраджай, і тутэйшыя людзі мелі кавалак хлеба нават тады, калі астатняя пясчана-балотная Беларусь галадала. Чарнобыль нанёс агромністую, нечуваную страту Беларусі: адабраў яе лепшыя землі. Бо паўднёвыя яе раёны — нібы пшанічная Украіна. Бязлесая раўніна нагадвае шырокі стэп, вялікія, атуленыя зялёнымі прысадамі сёлы, што вылучаюцца нібы астравы сярод жытнёвага, пшанічнага прастору, нагадваюць украінскія ці кубанскія.

Жыве гарадок. І твары ягоных жыхароў, нягледзячы на блізкі Чарнобыль, здаецца весялейшыя, чым у вёсках пад горадам, у якім жыве Пархімовіч. Можа, таму, што тут бойка гандлююць крамы, магазіны і, мяркуючы па першым уражанні, у іх сёе-тое ёсць. З магазінаў выходзяць жанчыны, дзяўчаты ў пярэстых летніх сукенках, з кошыкамі, поліэтыленавымі мяшэчкамі ў руках, мужчыны з закасанымі рукавамі, таропка, на хаду запіхваюць у кішэні пачкі цыгарэт, бутэлькі з трункамі.

— Можа, пачакаеш хвілінку? — пытае Пархімовіч. — Збегаю ў райвыканком. Папрашу пропуск.

— У тым мястэчку папросіш, — з'едліва адказвае Белаконь. — Там лепшае начальства. — Палагаднеўшы, працягвае: — Не дадуць ні тут, ні там. Я спрабаваў. Нават слухаць не хочуць.

Усё ж Пархімовіч выходзіць з машыны, заглядвае ў невялікі, чамусьці пафарбаваны ў сіне-белыя палосы, магазінчык. Па цяперашнім часе ён зусім не пусты. Можна нават сказаць — багаты. Ёсць мяса, масла, малако, каўбасы, нават трункі, якія ў абласным горадзе даюць па талонах.

Пархімовіч бярэ пару бутэлек, сёе-тое з закускі. Ужо далёка за поўдзень, варта падумаць пра абед дый Белаконя аддзячыць.

Белаконь ад абеду рацуча адмаўляецца.

— У тым мястэчку спынімся, — гаворыць. — Ды далей і не пусцяць.

Здаецца, яшчэ ніколі не бачыў Пархімовіч больш запамінальнай карціны, чым тая, якая адкрылася яго вачам па дарозе з аднаго палявога гарадка ў другі. Неяк злавесна свеціць ужо нізкаватае — хіліцца на спад — сонца. З гэтых мясцін многія вёскі таксама выселены, бо забруджаныя нуклідамі зямельныя плошчы размяшчаюцца нераўнамерна: адна вёска бязлюдная, суседняя — не, жыве, сее жыта, пшаніцу, доіць кароў. Хоць малака не п'е: збірае смятану, масла топіць.

Перад позіркам заліты сонечнымі праменнямі бясконцы пшанічны прастор. Аж да далёкага на далягляддзе паселішча. Можа, атамы цэзію ці стронцыю спрыяюць ураджаю: пшаніца высокая, колас важкі, сцябліна, бадай, у рост чалавека. Ледзь прыкметна гайдаецца пад павевамі ветру пшанічнае мора. І зноў нідзе ні машыны на дарозе, ні камбайна на полі. Багаты, але нібы выкляты богам край...

Пархімовіч проста ўзрадаваўся, калі ўскрай поля ўбачыў дзяўчыну на веласіпедзе. Белая ў палоску сукенка шчыльна аблягае паўнаваты стан, русявыя валасы спушчаны на плечы.

Дзяўчына толькі левай рукой трымае руль. Правай падносіць да рота яблык. Жывуць, значыць, людзі ў гэтым краі. І калі мець на ўвазе гэтую дзяўчыну, не надта думаюць пра небяспеку.

Пшаніца і пшаніца. Да самага палявога гарадка. Дзякуй богу, праехалі тры ці чатыры сустрэчныя машыны. Паблізу гарадка па полі плывуць два камбайны. І грузавікі паціху едуць услед за камбайнамі.

Вось нарэшце размешчаны сярод палёў, атулены лавамі жыта, пшаніцы гарадок. Пархімовіч ведае яго лепей, чым той, што стаіць недалёка ад чыгункі. Бо пасля скасавання самага паўднёвага, прылеглага да Прыпяці раёна, Пархімовіч як дырэктар школы бываў тут сама мала два разы на месяц.

Перамены ў гарадку відавочныя. Вабяць позірк новыя, пафарбаваныя парканы, шыферныя дахі, і наогул гарадок як бы падцягнуўся, стаў ва фрунт перад нябачным начальнікам.

Пархімовіч ведае: гарадок нібы выпрабавальны палігон. Выжыве народ ці не выжыве. Колькасць кюры тут высокая, і людзям у такім месцы заставацца нельга. Ён чуў: першыя два гады дзяцей у час перапынкаў не выпускалі на школьны двор, трымалі ў класах. Адабранае дзяцінства...

Чаму ж не выселілі гарадок? Пакуль што толькі абяцаюць выселіць. Трэба на гэтую справу дзесяткі мільёнаў рублёў. Дый дзе, на якой зямлі можна заснаваць другі такі самы гарадок, які пад вятрамі, снягамі, дажджамі стаіць болей за тысячу гадоў. Няма другой такой зямлі, як няма другой Беларусі. Такі лёс гэтага краю. Хто яго толькі ні вынішчаў! Татары і іншыя дзікія качэўнікі, шведы, французы, немцы, якія прыходзілі сюды двойчы. У апошнюю вайну большая частка раёна была спалена фашыстамі.

Мылі, чысцілі, дэзактывавалі гарадок пасля Чарнобыля. Аблівалі будынкі спецыяльным растворам. З двароў, вуліц, агародаў вывезлі верхні пласт зямлі. Але Чарнобыль нібыта і цяпер час ад часу выпускае са свайго смертаноснага чэрава цяжкія, атрутныя выкіды. А як карміць народ? Хіба навозішся чыстага ад прымешку нуклідаў хлеба, малака, мяса і таго, што спрадвеку тут расце: бульбы, морквы, капусты, буракоў, агуркоў...

Перад будынкам райвыканкома Белаконь спыняе машыну.

— Ідзі прасі пропуск, — гаворыць і, скрывіўшы ва ўедлівай усмешцы губы, дабаўляе: — На мяне таксама бяры. Прозвішча ведаеш...

Па калідорах райвыканкома ходзяць вайскоўцы. Пархімовіч паткнуўся да старшыні — кабінет зачынены, да намесніка — тое самае. У наступным пакоі за сталом сядзіць маёр са стомленым няголеным тварам.

— Прапускоў не выдаём, — тлумачыць Пархімовічу. — За сваю маёмасць вы грошы атрымалі. Поўнасцю і нават з дадаткам.

— Дакументы забыў, — тлумачыць Пархімовіч. — Вельмі для мяне важныя. Фатаграфіі бацькі, маткі.

— Нічым не магу дапамагчы, — маёр устае, паказваючы, што размова закончана.

— Атрымаў пропуск? — выскаляецца, паказваючы рэдкія жоўтыя зубкі, Белаконь. — Дзірку ад абаранка. Тут, брат, і без прапускоў такія дзялы дзелаюцца...

II

Калі на зямлю лёг шэры начны змрок, Пархімовіч з Белаконем рушылі ў дарогу. Белаконь паперадзе, за ім — Пархімовіч. Белаконь у правай руцэ нясе каністру з бензінам. Заправіць матацыкл. Географ ужо два разы пабываў у адселенай зоне. Выкапаў матацыкл, схаваў у хляве, у саломе.

— Зямля дзічэе адразу, — тлумачыць Пархімовічу. — Па дварах, на дарогах, на полі быльнік вырас па грудзі. Заглушыў пасевы. З-за дзікай травы нішто з зямлі не вытыркаецца. Ні бульба, ні пшаніца, ні жыта. Як бы нічога не было і не патраціў чалавек тысячы гадоў, каб вывесці культурныя расліны. Усюды нібы першабытная зямля.

Ісці да зоны, да загароды кіламетраў трыццаць. Але і па-за зонай, дзе калючага дроту няма, шмат вёсак, дзе насельніцтва выселена. Мясцовасць ахоўваюць ваенныя, і каб не трапіць ім на вочы, вёскі лепей абмінаць. Таму Белаконь вядзе па вядомых яму сцежках, а Пархімовіч дыбае следам.

Нейкія асаблівыя пачуцці агортваюць душу Пархімовіча. Атручаная зямля дыхае смерцю. І яшчэ будзе дыхаць сотню ці болей гадоў. Дзе, калі здаралася такое? Пархімовіч быў на фронце, ведае, што чалавек вельмі проста памірае. Не думае пра смерць. І бываюць часіны, калі нават лёгка ахвяруе жыццём. Але тут штосьці іншае.

Зорнае неба над галавой. Празрыстыя зоркі мільёны гадоў глядзяць на зямлю. Што такое зоркі? Бясконцыя сонцы, невядома кім запаленыя. І невядома для чаго. Астываючы, змяншаючыся ў памерах, яны, магчыма, робяцца планетамі, падобнымі на зямлю. Але і зямля, як у выпадку з Чарнобылем, здольна выбухнуць той самай смертаноснай сілай, якая тоіцца ў глыбінях зорак-сонцаў. Значыць, не ўсялякае рэчыва мае надзейную ўстойлівасць, такую, напрыклад, як золата. Уран чамусьці такой устойлівасці не мае, ён не ўзят у цвёрдыя, надзейныя абцугі сваёй унутранай будовы. Распадаецца і сее смерць...

Але жылі людзі і жывуць цяпер на землях, у глыбінях якіх залягае смертаносны уран, і не выключана, што, распадаючыся, уран выпраменьвае часцінкі гэтага самага цэзію, стронцыю на паверхню. А людзі жывуць. Як гэта можна? Божа, хоць бы кропля надзеі для роднага, спустошанага краю...

Змоўшчыкі ідуць. Шэры змрок навокал. То справа, то злева цьмяна бачацца неакрэсленыя цёмныя купы. Пэўна, прысады пакінутых вёсак. Нідзе ні агеньчыка, ні зыку, ні шораху. Толькі далёка-далёка як бы чуецца сабачы брэх. Дзе сабака, там чалавек. Тут, па чутках, гэта неабавязкова. Сабакі нібыта здзічэлі і абыходзяцца без чалавека. Хоць на чалавека яшчэ не нападаюць. Жывуць і множацца ў выселенай зоне вераб'і, сініцы, шчыглы, шпакі, якія селяцца заўсёды непадалёк ад чалавечага жытла. Чалавек, аказваецца, не гэтак ім і патрэбен. А вось свойская жывёла жыць без чалавека не можа. Не чуваць, каб перажылі хоць першую зіму пасля высялення людзей каровы, коні, свінні, куры.

Дый ахвотнікаў на свойскую жывёлу, вядома, хапала. Розныя тарбахваты палявалі за ёй тады, калі людзей ужо вывезлі з вёсак і паселішч. Рэзалі жывёлу і мяса прадавалі ў далёкіх ад гэтых мясцін гарадах: можа, нават у самай Маскве.

У той дзень, калі выбухнуў Чарнобыль, Пархімовіч корпаўся ў агародзе. Падгроб сухую траву, апалае лісце, вычысціў лазеньку, паветку, хлеў. Запаліў касцёр і, апрача травы, апалага лісця, кінуў у агонь непатрэбныя скураты, старую збуцвелую вопратку, іншыя бэбахі.

На двары і ў агародзе кошкаўся Пархімовіч з раніцы і да гадзін трох-чатырох дня. Стаміўся так, як ніколі да гэтага не стамляўся. Проста знямогся. Не сеў ні абедаць, ні вячэраць, лёг у ложак і заснуў. Жонка сама адчула неверагодную стому і не стала яго трывожыць.

Відаць, у той першы дзень да іх ушчыльную падступіў Чарнобыль. Дзіва няма: калі на карце акрэслілі трыццацікіламетровы круг вакол Чарнобыля — зону, жыхары якой падлягалі неадкладнаму высяленню, то лінія гэтага круга якраз прайшла праз сяло Пархімовіча. Ён чуў: ягоны двор аказаўся каля самага дроту...

Яны з Белаконем ідуць і ідуць. Маўчаць. Гаворку можа пачуць патруль або які-небудзь ліхі чалавек. Мабыць, ужо дзве ці тры гадзіны ночы. Але змрок не толькі не рассейваецца, а як бы нават гусцее. Тут толькі Пархімовіч заўважае, што зорак на небе не відаць, яно паступова зацягнулася воблакамі. Дальні край неба паласуюць пісягі маланак. І трава сухая, сухія калашыны штаноў, хоць яны з Белаконем прастуюць часам па высокай траве. Можа быць навальніца. Толькі гэтага ім не хапала...

Чуецца раптам прыглушаны голас Белаконя:

— Лажыся!

Пархімовіч валіцца на зарослую травой прасёлкавую дарогу і ад нечаканасці ў першую хвіліну нічога не чуе і не бачыць. Паступова да яго даносіцца нейкі шорах. Хтосьці, цяжка ступаючы, прыбліжаецца. З шэрага змроку нарэшце вымалёўваецца цёмная постаць.

— Стой! Хто ідзе? — выгуквае Белаконь і ягоны спалоханы голас нясе ў сабе выразнае адценне піску.

Постаць няўхільна прыбліжаецца. Ідзе, мабыць, стары чалавек, бо цяжка дыхае і шкрэбае гучна па зямлі абуткам, проста цягне ногі.

Прысаромленыя вандроўнікі пахапкам падхопліваюцца.

— Дабранач, — падышоўшы, вітаецца глухаватым голасам бабуля. — За плячамі ў яе нейкі мяшок. — З саўгаса іду. Саўгас высяляюць, але хлеб яшчэ прывозяць. А вы не бандзіты? Я была спужалася. Хоць адбіраць у мяне нечага. Нясу чатыры буханкі хлеба. Сваю магу аддаць...

Толькі цяпер Пархімовіч заўважае, што абапал прасёлка не палын, не быльнёг, як у другіх мясцінах, а пшаніца. Цяжкая, з налітым коласам лава пасеваў хіліцца на дарогу.

— З якой вы вёскі? — пытаецца Пархімовіч і, пачуўшы адказ, уздрыгвае ад узбуджэння: вёска, якую назвала старая, усяго вёрст за дзесяць ад ягонага сяла.

Ён зноў пытаецца, не тоячы радасці:

— Дык што, там яшчэ людзі жывуць?

— Жывуць. Я і яшчэ дзве сям'і. Усяго чатыры чалавекі. Вярнуліся з етай самай эвакуацыі. Мне дык ва ўсім свеце няма прапіскі. Толькі ў маім сяле...

Пачынае святлець. Непрыкметна хмары сплылі і відаць, як на дальнім канцы неба паступова блякнуць зоркі. Ціха вее перадранішні вецер. На старой зношаная ватоўка, з-пад якой выглядае шэрая мультавая кофта ў кветачкі, цёмная спадніца, а за спіной зусім яшчэ новы салдацкі рукзак. Бабулін твар з высокім ілбом зусім без маршчын і цэлыя трохі рэдкаватыя зубы.

З несхаванай падазронасцю бабуля ўглядаецца ў Белаконя, які стаіць, трымаючы ў руках каністру.

— Ты не з етых самых падпальшчыкаў? — насцярожана пытаецца. — Каторыя хаты паляць. Прыходзілі да мяне на тым тыдні. Вёскі паляць, а попел зграбаюць і закапваюць бульдозерам. Я сказала: закапайце мяне разам з сялом... Пасаромеліся. Дзе жывуць людзі, тых сёл яшчэ не чапаюць.

Белаконь ахрыплым голасам пытае, ці не спалілі ягоную вёску.

— Хто яе ведае, — адказвае бабуля. — Людзей мала. Няма ад каго пачуць...

(Працяг на стар. 10—11).

Праз боль сучаснага чалавека

«ЭМІГРАНТЫ» С. Мрожака ў Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы

НА АДКРЫТАЙ з усіх бакоў сцэнічнай пляцоўцы, так што бачны каркас сцэны, стаяць жалезныя ложкі, разбіты ўмывальнік, стары стол са стракатымі бляшанкамі з-пад кансерваў. З адчыненых дзвярэй вышэйшага паверха нясуцца гукі рэстаранай музыкі, выходзяць людзі і выліваюць вядро з памыямі проста ўніз. Вада аблівае пана Х.Х., які вяртаецца з вакзала... Так, амаль з клаунады, пачынаецца спектакль у пастаноўцы Мікалая Пінігіна.

Зверху яшчэ колькі разоў даляціць да нас танцавальная мелодыя, пачуецца звон бутэлек, абрыўкі балбатні...

...Гісторыя двух людзей, абагульненая да формулы сучаснага быцця чалавека. Звыклыя для пастановак гэтай п'есы Мрожака—антураж задушнага склепа ці другая сцэнаграфічна сціснутая, абмежаваная прастора, адведзеная для выціснутых з жыцця эмігрантаў,— у беларускім спектаклі адсутнічаюць. Рэчы не ўшчыльняюць, не ажыўляюць сцэну-склеп. Аголеная, нібыта пазбаўленая рэчаў сцэнічная прастора «ўцягвае» ў сябе і глядзельную залу: склеп утварае і сцэна, і глядзельная зала — разам. Але слуп з металічнай сеткай шахты, размешчаны ў сярэдзіне пляцоўкі, разрывае замкнёнасць самога сцэнічнага карабка. Ягоная рухомая вертыкаль дае магчымасць меркаваць пра існаванне іншай сістэмы жыццёвых каардынат, недаступных безыменным персанажам, дый безыменным людзям з партэра (мастак — Уладзімір Ждана ў).

Гэты спектакль — не пра людзей-ізгояў, што не знайшлі сябе ў жыцці, не пра эмігрантаў і нават не пра нашае штодзённае існаванне, з ягоным трагізмам, кімсьці ўсвядомленым, а кімсьці неўсвядомленым; існаванне, якое сілкуецца ілюзіямі ці гэтыя ілюзіі топча...

Сучасны свет рассечаны на дзве часткі: Захад — Усход, капіталізм — сацыялізм, белыя — чорныя, арыйцы — неарыйцы... і нашае мысленне, мабыць, такое самае плоскаснае,—арыентуецца на нейкія ўмоўныя полюсы. Мы часам і не здагадваемся пра існаванне іншых сувязей, іншага жыцця, недаступных сучаснаму ідэалагізаванаму воку...

Свет спектакля, таксама як і п'есы, распадаецца на розныя часткі, на процілегласці: верх — ніз, сутарэнне — паветра, рабства — свабода, інтэлігент — хам. Але полюсы гэтыя часцей аказваюцца ўяўнымі. (Праўда, рэжысёр нічога канчаткова не сцвярджае.) Спектакль ні на чым не настойвае, усё ставіць пад сумненне. Рабскай псіхалогіяй валодае не толькі рабацяга Х. Х. у выкананні А. Дзянісава, але і рэфлексуючы інтэлігент А. А. Г. Маляўскага; а на душэўную неўрастэнію ў гэтым спектаклі хварэе прыціснуты чорнарабочы, а не літаратар А. А.

З першай сцэны А. Дзянісаў, худзенькі, малы, які не выклікае асацыяцый з фізічным здароўем, іграе Х. Х., рабацягу, што тупее ад работы, чалавекам нервовым, узвінчаным, які раз-пораз хапаецца за сякеру або стукае па стале. Гэты хам не наіўны і не прастадушны, хоць і спрабуе іграць гэткую ролю травесці перад сваім інтэлектуальным суседам па ложку. Партнёр Х. Х.— А. А., прымаючы ўмовы гульні, схільны да «тэатральнай» позы і «тэатральнага» жэсту.

Дзеянне спектакля рухаецца рыўкамі, амаль сутаргамі псіхалагічных выбухаў. Інтэлігент кожны раз разбурае вартыя жалю жабрацкія ілюзіі, якімі жыве і якія выдумляе бядотнік Х. Х. Так адбылося з ягонымі вакзальнымі забавамі, што скончыліся ананізмам у грамадскай прыбіральні, і з таннымі мяснымі кансервамі — яны аказаліся харчам для сабак. Інтэлігент адкрыта правакуе Х. Х. на бунт, псіхалагічны выбух. Але пасля хвіліны прасвятлення ў Х. Х. наступае прыступ агрэсіі.

Са знікненнем ілюзій перапыняюцца і «тэатральныя» дачыненні персанажаў, робяцца больш жорсткімі, грубейшымі, больш драматычнымі. Моманты яднання герояў — ва ўсведамленні яшчэ адной бездані ці беспрасветнасці жыцця; гэтыя моманты выбухаюць яшчэ больш рэзкай сінкопай нянавісці персанажаў адно да аднаго, яшчэ больш падкрэсленаю антаганістычнасцю.

Ці так ужо неабходна спазнаваць цынічныя ісціны рэальнага сучаснага жыцця?— вось пра што з пункту гледжання гуманізму сведчыць спектакль. Ён — пра страту ілюзій і пра немагчымасць іх пазбыцца: праўда вызваляе чалавека ці чалавецтва ад ілюзій, але што застаецца замест іх? Цынізм? Мёртвая душа? Праўда смяротная для чалавека. Пасля імгненняў самаўсведамлення ў Х. Х. А. Дзянісава — выбух бунту і прыступ агрэсіі. Калі ў Х. Х. аднята апошняя і галоўная ілюзія — спадзяванне вярнуцца дадому,— ён спрабуе павесіцца. З шаленствам ірве папяровыя грошы, назапашаныя пякельнай працай, ды хутка, як прахапіўшыся ад сну, усведамляе ўвесь адчай, што наследуе хвіліне вольнасці.

Спектакль Мікалая Пінігіна даследуе жыццё ў некалькіх вымярэннях. Мастацкая прырода яго не плоскасная, не алегарычная. Пра яго нельга сказаць: ён — пра ўзаемаадносіны інтэлігенцыі і народа, ці пра эміграцыю, ці — пра дабрату і цынізм, хоць усё гэта ў ім ёсць. Калі ў першай частцы спектакля героі аб'яднаны агульным лёсам, іх энергія накіравана на дачыненні з уяўным знешнім светам (успаміны, мары, рэальнасць), то ў другім акце душэўная энергетычная прастора звужана: я і ты, навошта мы разам? Ва ўнутраныя, глыбінныя сферы чалавечага існавання пераносіцца акцэнт спектакля. Людзей, якіх мы бачым на сцэне, аб'ядноўвае не толькі агульны лёс, вострая цікавасць і неадольнае прыцягненне поцілеглых натур, але яны і вымушаны існаваць пад адным дахам, у адным сутарэнні, у адной краіне, у адным часе, у адной культуры. Гэта ўжо іншае вымярэнне спектакля — не псіхалагічнае, не сацыяльнае, а экзістэнцыяльнае.

...У поўнай цішыні стаіць Х. Х. А. Дзянісава на стале, з вяроўкай на шыі... Разумны герой Г. Маляўскага асцярожна,

Клетка ў клетцы

Пяцёра мужчын-будаўнікоў, каб неяк адбыць рабочы час, пацяшаюцца: то грошы ў гульні разыграюць, то пагушкаюць у паветры клетку-бытоўку са сваім маладым калегам. Ёсць нават свой спецыяліст па пацехах, майстар на выдумку Косцік. Але юнак Алесь — нейкі «не от мира сего» — імкнецца звесці на нішто эфект гэтых забаў...

Вось амаль і ўся фабула новага тэлеспектакля «Клетка з папугаем» (аўтар сцэнарыя і рэжысёр А. Астравух, аператар І. Скорынаў, мастак А. Шкаева).

Здаецца, адбылася досыць значная падзея: на авансцэну беларускага тэлетэатра ступіў малады станоўчы герой-сучаснік, якога так доўга выклікалі тэатральныя дзеячы яшчэ 7—8 гадоў таму. Алесь (А. Сідорчык) — дзіця свайго часу? Маўклівы прыгонны закратаванага «савецкага царства»? Процістаіць уціску «шэрай гвардыі» атачэння і ўсяму бязрадаснаму наваколлю? Відавочна, малады чалавек здольны да маўклівага маральнага супраціўлення. Бездапаможны ў звычайнай будзённай справе («Абедзве рукі левыя»)? Так, але ён прагне свабоднага палёту. Палёт — сэнс ягонага ўнутранага жыцця, яго галоўная мара, дзеля якой Алесь крочыць шляхам усёдаравання.

Спіс падобных пытанняў можна доўжыць, але яны ўсё адно застануцца агульнымі, як і адказы, што не дадаюць ніводнай фарбы да характару персанажа. Ад змены месца складаемых, вядома, сума не змяняецца. Цяжка сказаць, якіх схільнасцей у гэтага маладога станоўчага героя больш: ці Дон Кіхота, ці князя Мышкіна, напрыклад. А мо лепей пагадзіцца з характарыстыкай, якую даў Алесю майстар па забавах будаўнічай пляцоўкі Косцік,— «Ісусік цукровы»?

Вобраз Алеся ў маім успрыманні асацыіруецца з «партрэтам», які выканаў... фотаробат. Ёсць толькі тое, што бачыць вока, — халодны злепак. Няма Асобы і няма «клопатаў» стварыць яе ні ў выканаўцы А. Сідорчыка, ні ў аўтара А. Астравуха, мастацкія намаганні якога «прыкладаюцца» да іншых задач. Пастаноўшчык актыўна ўзбуйняе вобраз... клеткі ў тэлеспектаклі. Тут можна ўбачыць звычайную клетку з папугаем, можна распазнаць бытоўку-клетку (нават з інвентарным нумарам «тры»), а пры жаданні (калі таго надта хацелі аўтары тэлеспектакля) — уявіць гіганцкую клетку праз дэталі будаўнічага «шкілета». Гэтыя клеткі па аб'ёме значна адрозніваюцца, што вельмі добра, бо зручна ўштукоўваюцца адна ў адну (як матрункі). Праз такі «частакол» жыццё чалавека іншым свеце ўбачыш. І няма розніцы, якога ты палёту «птушка». Адны добра прыжываюцца ў клетцы, як Залеўскі-«стукач» (трэба адзначыць яркую, прыкметную міміку артыста А. Мілаванава, які выконвае гэтую ролю). Другія — Юзік (А. Корчыкаў), Косцік (В. Бандарэнка), Зэк (У. Кін-Камінскі)— проста звыкліся і бавяць час. Толькі некаторыя, як Алесь, прагнуць выбрацца. Але

Несмяротныя людзі

(Пачатак на стар. 8—9).

Нічога не сказаўшы Пархімовічу, не выпускаючы з рук каністры з бензінам, Белаконь кідаецца прэч. Амаль што бяжыць па высокай траве.

— Нейкі як памешаны, — заўважае старая. — Ды яшчэ з каністрай.

— Ён матацыкл схаваў, — тлумачыць Пархімовіч. — Хоча заправіць бензінам. Выехаць з зоны...

— Матацыкл, — паўтарае бабуля. — І ты па матацыкл ідзеш?..

— Не. Па фотакарткі. Бацькі, маці, таварышаў. Многіх няма на свеце. Няхай хоць фотакартачкі будуць...

— Добра, што ідзеш. Забываць бацьку і маці не трэба. Дый паглядзіш, як жывём...

Хоць бабуля пярэчыла, ён узяў ад яе мяшок, перакінуў сабе за плечы. Бабуля, відаць, не намнога старэй за яго: на два ці тры гады. Адно пакаленне. Пархімовіч нарадзіўся ў мястэчку, падобным на гарадкі, у якія яны днём заязджалі, але жыццё пражыў на вёсцы. Толькі дзве вёскі памяняў за жыццё. У гэтай самай мясцовасці. Спачатку працаваў у васьмігодцы, а як падраслі дзеці, перабраўся ў сяло з дзесяцігодкай. Першую хату пабудаваў сам (у бязлесай мясцовасці, бярвенне вазілі з лесу, які знаходзіўся за шэсцьдзесят вёрст), другую хату купіў.

Ужо зусім вывіднела. Дождж нават не пакрапаў. Пабліскала на небе, і хмара сышла недзе бокам.

— Некаторыя ад смерці ўцякаюць, а я смерці не баюся, — гаворыць старая. — Перасялілі нас, дайжа асобную хату далі. Ды дзіка мне на новым месцы. Нішто не міла. Ніякай радасці няма. То ўзяла казу на вяровачку, у каробку пасадзіла двух курэй, певуна для разводу і на другое лета вярнулася сюды. Вот ужо два гады тут. Мае суседзі яшчэ раней вярнуліся. Уцяклі адразу, як іх вывезлі...

— Нясуцца куры? — чамусьці спытаў Пархімовіч.

— Нясуцца. Чаму ж не. Толькі як бы адзічэлі. Яйкі ў траве пакідаюць. Трэба збіраць. І выводзяцца без мяне. Самапасам. Я дайжа не ведаю, колькі ў мяне цяпер курэй. Дванаццаць ці пятнаццаць. Каб абкладалі падаткам, то невядома, колькі плаціць грошай. Другі раз цэлы таз яек назбіраю. Салдатам даю. Адны бяруць, другія— баяцца. Жыву добра. Каза малако дае. Салдаты кансервы прыносяць, часам хлеб. Вот цяпер парсючка завяла. Бульбу саджу. Сотак дзесяць. На большае няма змогі. Трошкі агуркоў, буракоў...

— Не страшна вам? Адной...

— Чаму страшна? Я ж сказала: не адна я. У нашым сяле дзве бабы. Другая з мужыком, маладая. І яшчэ адзінокі інвалід ёсць, без нагі. Каня дзержыць. Харошы конь. І каламажка ў таго мужыка добрая. На гумавых колах...

— Можа, і дзеці ў каго-небудзь ёсць?

— Не, дзяцей няма. За дзяцей людзі баяцца. Вот у зоне, за дротам ёсць, кажуць, цэлае сяло, якое нікуды не выязджала. Адтуль Чарнобыль відаць. Дык вот там і дзеці разам з бацькамі жывуць. Малако на зямлю выліваюць, не ядуць свайго ні сала, ні мяса, а жывуць.

І вось яны ў вёсцы, дзе жыве бабуля. Пустэча і запусценне. Двары забіла высокая, ледзь не ў рост чалавека, трава, непамерна разрасліся дрэвы ў садах, палісадніках, схаваўшы ў сваім зялёным спляценні абрысы хат і хлявоў, астатніх будынкаў. Як бы назусім пакінулі гэтую зямлю людзі.

Аднак не пакінулі.

— Кірылаўна, каго прывяла? — чуецца з вуліцы мужчынскі, як бы трохі надтрэснуты голас. — Можа, прымака сабе...

— Аге ж, прымака...

Каля двара спыняецца фурманка на гумавых колах, запрэжаная ўкормленым гнядым канём. У двор, апіраючыся на выструганую таўставатую палку, заходзіць высокі, у паношаным шэрым касцюме, насунутай на самыя вочы кепцы чалавек. Касцюм на ім старамодны, з шырокімі калашынамі. На лацкане пінжака ў чалавека нават нейкі значок. Твар паголены, валасы падстрыжаны. Відаць, той самы інвалід, пра якога гаварыла старая, думае Пархімовіч. Яна між тым вымае з рукзака буханку хлеба і аддае чалавеку.

— На два дні хопіць. А там, можа, Насця збегае ў саўгас. Ці салдаты прынясуць...

Чалавек пільна ўглядаецца ў твар Пархімовіча, як бы хочучы нешта спытаць.

— Настаўнік, — тлумачыць Кірылаўна. — Яго хата за дротам. Ідзе забраць фатаграфіі. Маткі, бацькі...

— Панятна, — коратка адказвае інвалід, клыпаючы да варот, на вуліцу.

Услед за інвалідам яшчэ даволі маладыя мужык з жонкай завітваюць у двор Кірылаўны і бяруць дзве буханкі хлеба. Дзіўна: адгароджаныя ад свету, яны як бы зусім не цікавяцца, што на гэтым свеце дзеецца.

Двор Кірылаўны не надта зарос. На штыкеціне парканчыка вісіць закопчаны кацялок, сушыцца саматканая ў сінія і чырвоныя палосы дзяружка. Пры парканчыку лаўка, на ёй два тазы, вядро. Стаяць некалькі кошыкаў, поўныя сакавітых яблыкаў-наліваў.

— Пасядзіце, я бульбы звару, — гаворыць Кірылаўна.

Чакаць бульбы Пархімовіч не хоча. На душы цяжка, самотна.

— Хоць яблычкаў вазьміце. Схрумаеце па дарозе. Не бойцеся—яны чыстыя, памытыя.

Пархімовіч бярэ пару яблыкаў, развітваецца, выходзіць на вуліцу. Яна таксама не надта зарасла: як бы яшчэ адчувае вуліца дух і прысутнасць чалавека.

Пархімовіч ідзе да загароды. Яму трохі вусцішна. Свеціць сонца, навакол разлягаецца шырокі прастор і нічога, акрамя высокай травы, наперадзе не відаць.

Толькі ў адным месцы высіцца купа дрэў і як бы нейкі будынак. Пархімовіч кіруе туды. Ад нечаканасці ён уздрыгвае. Тут была, відаць, вёсач-

фразамі сіліцца зняць напружанне. Уцягнуўшы натапыранага, напятага як струна Х.Х. у будзённую справу—ліст сваякам перад смерцю напісаць трэба,— даводзіць яго да зрыву — слёз і істэрыкі (і ліста, маўляў, скласці не здолееш!). Урачыстасць смяротнай мінуты не вытрымлівае такой будзённасці і бяздарнасці... Жыццё працягваецца, трагедыя пераходзіць у фарс. Героі і памерці на сцэне не могуць, не дадзена ім гэта, занадта раскошна і патэтычна. Сучаснасць не прымае і тых крох узвышанага, якія ёсць у падобнай «тэатралізаванай» смерці...

Спектакль пакідае гледачоў у роздуме. Мікалай Пінігін шмат ставіць на беларускіх сцэнах заходняй драматургіі, ён адзін з нямногіх, хто ўмее гэта рабіць. Гэты мастак — тонкі псіхолаг і выдатны стыліст, у якога ёсць свае пастаянныя тэмы. У ягоных спектаклях адчуваецца боль сучаснага чалавека, [illegible]зь які ён прапускае тэатр[illegible]ную форму і сэнс прадстаўлення. Таксама як у «Драконе» Я. Шварца, у «Эмігрантах» ён сумняваецца ў магчымасці абуджэння народнай свядомасці, у асэнсаванні імі свайго быцця ў свеце. Але разам з тым ён прымушае гледача ўсумніцца ў звычных антытэзах сучаснага мыслення, паспрабаваць вырвацца з ціскоў аднабокага погляду на свет.

Святлана РАТАБЫЛЬСКАЯ.

куды, куды з такім напружаннем «выломваецца» наш малады герой? Вядома, у прастору... большай клеткі, калі трымацца вобразнай логікі тэлеспектакля.

Калі доўжыць гэтую думку, дык, глядзіш, узаб'ешся на [illegible]-небудзь філасофскую вышыню. Баюся толькі, што тэлеспектакль «Клетка з папугаем» з яе не разгледзіш.

Што ж да творчых здабыткаў у новай пастаноўцы рэжысёра А. Астравуха, дык трэба адзначыць ягоны пераход ад звычайнага шкалярства (маю на ўвазе тэлеспектакль «Катамаран ідэй», 1987 год) да мастацкага вучнёўства.

Наталля АГАФОНАВА.

Музыка

«Ноу проблэм»

На жаль, загаловак не мае ніякага дачынення да нашага становішча ў галіне духавой музыкі, якое складае на працягу ўжо многіх гадоў з абяцанняў, бясконцых чаканняў і ўсяго астатняга, што так добра вядома кожнаму з нас. Усё гэта яшчэ больш востра адчулася пасля канцэртаў у Мінску Прэзідэнцкага аркестра марской пяхоты ЗША. «ЛіМ» пісаў пра тое выступленне, і мне не хацелася б раздражняць чытачоў банальным «а вось у іх!» І, смакуючы чужыя поспехі, расказваць пра ўражанні ад майстэрства калектыву, ад музыкантаў, з якімі мне давялося пазнаёміцца і добра пагутарыць.

Цяжка ўявіць сабе чалавека, які б змог застацца абыякавым на канцэртах амерыканскіх гасцей. Цяжка стрымліваць эмоцыі... І не магу не запытацца, хаця б рытарычна: а чаму ж не павінна гэтак і быць — «ноу проблэм»? Хіба справа ў званні —«Прэзідэнцкі аркестр»? У нас жа гучных назваў таксама хапае, але, на жаль, не заўсёды яны напоўнены адпаведным зместам.

Так, у той вечар людзі выходзілі з канцэртнай залы крыху знямелыя і вельмі ўзрушаныя, іхні стан можна было смела параўнаць з шокам. Вышэйшае прафесійнае майстэрства калектыўнай ігры, прадэманстраванае амерыканцамі, як бы высветліла перад намі карціну ўсіх тых сур'ёзных праблем, якія нам неабходна вырашыць, увесь доўгі шлях, які неабходна нам прайсці ў эвалюцыйным развіцці, і не толькі музычным, бо ўжо даўно не сакрэт, што культура (у тым ліку і музычная) знаходзіцца ў цеснай узаемазалежнасці з эканомікай, палітыкай.

Болем адгукаецца думка пра горкі стан нашага духоўнага здароўя, эстэтычнага выхавання, — тых сацыяльных каштоўнасцяў, без якіх немагчыма падтрымліваць жыццястойкасць нават самых даўніх і лепшых традыцый. Зніжэнне папулярнасці той жа духавой музыкі за апошнія два дзесяцігоддзі і непрыкметна для нас саміх адбілася і на прафесійным выканальніцтве: страчана прэстыжнасць прафесіі музыканта-духавіка, ацэнкі ягонай працы і г.д. Выступленне Прэзідэнцкага аркестра марской пяхоты ЗША, я гэта сцвярджаю, цалкам мяняе нашы ўяўленні пра духавы аркестр і музыку, якая пішацца для яго.

Вядома, ёсць і аркестр Маскоўскага Крамля, які дарэчы хвалілі амерыканскія музыканты, — таксама вельмі моцны калектыў, дый гаворка ў прынцыпе не пра тое, каб усе нашы духавыя аркестры іграл і так, як аркестр Прэзідэнта Амерыкі. Мяне турбуе іншае: ці хутка мы зоймемся вырашэннем сваіх праблем, якія маюць «сіндром снежнага камяка», бо чым далей мы будзем адкладваць ужо даўно ўзнятае пытанне аб стварэнні свайго рэспубліканскага прафесійнага духавога калектыву, тым больш будзе «камяк», тым больш часу нам спатрэбіцца потым, каб «разгрэбсці» нявырашаныя пытанні. Між іншым, аркестр, які нам давялося слухаць, мае 200-гадовую гісторыю, і амерыканцы вельмі берагуць свае традыцыі і спадчыну...

Я ніколі не сімпатызаваў песімістам, аднак жа зараз не вельмі спадзяюся калі-небудзь хаця б нешта падобнае пачуць у выкананні ўзгадаваных сярод нас музыкантаў. Гэта не нігілізм, не нявер'е ў нашы творчыя здольнасці — гэта вынік аналізу рэальнасці, цвярозага роздуму над тым, у якім становішчы мы апынуліся. Мы стаім на пачатку доўгага шляху творчых пошукаў, і гэта датычыць не толькі выключна духавога выканальніцтва. Штатныя адзінкі, нават і з высокімі стаўкамі, — гэта стартавая пляцоўка, а не спосаб поўнага вырашэння праблем развіцця духавой музыкі. Што ў першую чаргу заўважаеш, слухаючы амерыканцаў? Як цяпер прывыклі гаварыць, фірменнае гучанне, прычым як усяго аркестра разам, так і паасобных груп інструментаў, і кожнага саліста, — «ноу проблэм»! Многія, з кім давялося падзяліцца ўражаннямі, казалі: «Слухаючы праграму, нават забываешся, што на сцэне духавы аркестр!» Сапраўды: чароўнае гучанне, аксаміт тэмбраў суладдзя розных інструментаў, майстэрская інструментоўка твораў. Вось што на сённяшні дзень для нас невырашальная праблема. А ўзяць ансаблевыя тонкасці выканання!

Што гэта? Ваенная музыка, дыстыпліна? Ды не... Гэта — **Школа:** ёсць такое паняцце ў музыканцкай навуцы. Гэтае паняцце з'яўляецца асноўным на ўсіх паверхах музычнага прафесійнага выхавання «там». І ў той жа час гэта менавіта тое, чаго няма ў нашай музычна-адукацыйнай сістэме. Пакуль мы гаворым толькі пра маскоўскую ці ленінградскую школы, а вось наша нацыянальная толькі фарміруецца. Між тым у адказ на пытанне, «якая з амерыканскіх школ найлепшая?», мой калега-тубіст назваў адразу некалькі і дадаў, што хутчэй трэба гаварыць пра агульны высокі ўзровень, які ў кожным універсітэце мае свае характэрныя рысы ў залежнасці ад асобы прафесара, які там выкладае.

Ведаю, што існуе многа поглядаў на праблемы духавой музыкі: ад самага абыякавага (маўляў, не да таго цяпер) да, я б сказаў, максімалісцкага, які падзяляю і сам. Коратка максімалісцкую пазіцыю можна сфармуляваць тэзісам аб цэласнасці развіцця культуры, у прыватнасці, музычнай. Дык ці разумна «сартаваць» яе на больш важныя і менш важныя часткі? А такія тэндэнцыі ў развіцці нашай музычнай культуры ёсць і былі раней. А тэндэнцыі, як вядома, маюць асаблівасць пры спрыяльных акалічнасцях пераходзіць у якасна новыя формы — г. зн. тое, што ўчора было толькі ледзь прыкметкай тэндэнцыяй, сёння ўжо заканамернасць, прыхарошаная рысамі аб'ектыўнасці...

Зразумела, што марш «Сцяг ЗША навечна» або «Верныя назаўсёды» (дэвіз марской пяхоты) — гэта служба, абавязак ваеннага музыканта. А як жа Таката, адажыо і фуга До мажор І.-С.Баха, уверцюра з оперы «Руслан і Людміла» М.Глінкі, «Палёт чмяля» М.Рымскага-Корсакава ў выкананні групы кларнетаў? А іншыя творы рускіх класікаў і савецкіх кампазітараў? І пад заслону «Развітанне славянкі»—ды так, што аж зала застагнала. (А ў нас усё скардзяцца: іграць няма чаго, мала пішуць для духавых аркестраў). Думаю не памылюся: гэта і ёсць сапраўднае мастацтва. І «ноу проблэм», — гэта вялікая праца, штодзённая, гэта ўсё, аб чым любім паразважаць-пагаварыць, але — зробленае без лішніх слоў, даведзенае да дасканаласці.

Таму, мне здаецца, было б правільным «завязаць» плаксівыя гаворкі пра «шэрага бычка» і ўсур'ёз заняцца стварэннем дыхтоўных умоў для развіцця музычнай справы. Тут, як мне здаецца, амерыканскі рэцэпт не пашкодзіць: нават да самай маленькай справы трэба ставіцца па-сапраўднаму сур'ёзна, даводзіць да канца ўсё пачатае, не прыпыняцца, не кідацца з боку ў бок і да т.п.

Вядома, добрыя задумкі вымагаюць рэформенных крокаў і ў сістэме адукацыі, і ў адносінах да справы; у адваротным выпадку «хвароба ўсёведання» зробіцца застарэлай. Менавіта яна ўводзіць нас у зман: здаецца, што калі ведаеш, як гэта павінна быць, то так яно і будзе, а можа, нават ужо так яно і ёсць, а калі не атрымліваецца, дык, значыць, вінаватыя ўсе астатнія. Асноўны ж кампанент амерыканскага рэцэпта: можна і не гаварыць пра тое, што неабходна зрабіць, а проста зрабіць, усім разам, кожнаму на сваім месцы. І тады—«ноу проблэм». У нас аднак пакуль больш атрымоваецца... ствараць усё новыя праблемы ды раздаваць абяцанні. У тым ліку і наконт арганізацыі на Беларусі дзяржаўнага духавога аркестра.

Пятро ДУДАРЭНКА,
артыст аркестра ДАВТа БССР.

ка ці хутарок. Яго спалілі, мясціну зраўнялі бульдозерам, чамусьці пакінуўшы толькі печ і рэшткі паркана. Печ вялікая, з чараном і ляжанкай, яна займала, відаць, палавіну сялянскай хаты.

Пажарышча паспела зарасці высокім у рост чалавека быльнягом.

Пархімовіч азіраецца і яшчэ болей дранцвее. Навакол, як кінуць вокам, над лёгкім ветрам калышацца высокая — па грудзі чалавеку — не пшаніца, ні жыта, а дзікая трава, якую звычайна на полі выполваюць. Пырнік, сівец, драсён, быльнёг, палын.

У вайну на Ленінградскім фронце камандзірам давалі папяросы «Тры багатыры». На пачку была адбіта вядомая карціна рускага мастака Васняцова. Лейтэнант Пархімовіч таксама атрымліваў папяросы з намаляванымі ў жалезных шлемах і кальчугах багатырамі, углядваўся ў малюнак, здзіўляючыся, чаму магутныя коні старажытных воінаў ледзь не хаваюцца ў высокай траве.

Толькі цяпер, амаль праз паўвека пасля вайны Пархімовіч здагадаўся: такім быў многія стагоддзі назад дзікі стэп. Толькі тры, самае большае чатыры гады няма на гэтай зямлі чалавека і нарадзіўся той самы дзікі, зарослы высачэннай травой стэп. На далягляддзе яшчэ сям-там бачацца зялёныя прысады вёсак, сёл, але хутка яны знікнуць. Яны ёсць, пакуль жывуць у пакінутых вёсках такія, як Кірылаўна і яе падсуседзі. Але век іх не бясконцы. Рана ці позна агонь і бульдозер зробяць тое, што зрабілі вось тут, каля пакінутай печы. І тады застанецца тут толькі высокае сіняе неба ды дзікі, пярэсты ад красак, кветак стэп. Можа, яшчэ трохі птушак застанецца, такіх вось далікатных шэрых курапатак, якія чародкамі выбягаюць з высокай дзікай травы на зарослую, з ледзь прыкметнай каляінай прасёлкавую дарогу.

Праз пекла ГУЛАГа

Неўзабаве споўніцца два гады, як на лімаўскіх старонках упершыню з'явілася рубрыка «Мартыралог Беларусі». За гэты час нашы чытачы пазнаёміліся з дзесяткамі пісьмаў, успамінаў, дакументаў, якія нельга чытаць без хвалявання, без болю ў сэрцы, бо кожная з публікацый — нібы суровы прысуд сталіншчыне, як народны праклён яе творцам і выканаўцам, а найперш — пільнае папярэджанне нам, сучаснікам, а таксама тым, хто прыйдзе ў жыццё за намі: такое не павінна паўтарыцца.

Амаль ці не кожны тыдзень у рэдакцыю прыходзяць новыя лісты з паметкай на канверце: «Мартыралог Беларусі». Бярэш іх у рукі і міжволі думаеш пра тое, што народная памяць невычэрпная, што яе нельга знішчыць, схаваць у спецхранах КДБ, спаліць або закапаць, як сляды глумленняў, здзеку, забойстваў ні ў чым не вінаватых, безабаронных людзей. На маім пісьмовым стале—тры пажоўклыя ад часу танклявыя кніжачкі, выдадзеныя ў самым пачатку трыццатых гадоў, калі на тытульным лісце, перад годам выдання, вялікімі літарамі пазначалі — МЕНСК. Аўтар гэтых кніжак —Валерыян Ляшэвіч. Напэўна, для большасці сённяшніх лімаўскіх чытачоў імя зусім незнаёмае. Ён адзін з тых, хто прайшоў пякельныя кругі сталінскіх лагераў і новабудоўляў, цудам застаўся жывы і праз трыццаць год пакутлівага выгнання, пад час хрушчоўскай «адлігі», вярнуўся на радзіму.

Вярнуўся жывы, але з паламаным лёсам, з няспраўджанымі надзеямі і памкненнямі. А ён так упэўнена ішоў па абранай у жыцці сцяжыне! У семнаццаць год — карэспандэнт бабруйскай газеты «Камуніст». У 1925 годзе пераязджае ў Менск, паступае вучыцца на гістарычны факультэт Белдзяржуніверсітэта і адначасна працуе ў рэдакцыі газеты «Савецкая Беларусь». У канцы 20-ых—пачатку 30-ых гадоў апавяданні маладога пісьменніка часта друкуюцца ў дзіцячым часопісе «Іскры Ільіча» і «Піянеры Беларусі». Адна за адною выходзяць тры кніжачкі для дзяцей, пра якія я ўжо ўспамінаў. Дарэчы, кніжкі своеасаблівыя, напісаныя ўпэўненаю рукою. Лепшаю з іх, на маю думку,—«Святло з горада». Гэта даволі аб'ёмнае апавяданне пра жыццё і клопаты юных тэхнікаў. Апавяданне мае цікавы сюжэт і насычана рознымі добрымі парадамі, нават схемамі, якія дапамагаюць дзецям пасябраваць з тэхнікай, зазірнуць у яе таямніцы. І як працяг апавядання «Святло з горада»—зборнік «Парады маладому тэхніку», дзе даецца 162 практычныя парады тым, хто самастойна займаецца канструяваннем, а таксама наведвае розныя тэхнічныя гурткі. Сёння, калі мы спрабуем адрадзіць нацыянальную школу, такія кнігі якраз вельмі і вельмі патрэбныя. Падобная літаратура, акрамя чыста практычнага значэння, нясе ў сабе і выхаванне родным словам, узбагачае лексічны слоўнік вучняў. Гэта адзін з перспектыўных шляхоў беларусізацыі навучання ў рэспубліцы. Паглядзіце, якія бедныя нашы кнігарні на выданні-навінкі для дзяцей, асабліва сярэдняга школьнага ўзросту. Яны яшчэ захапляюцца казкамі і разам з тым прагна спасцігаюць навакольны свет. А для большасці з іх, асабліва для гараджан, навакольны свет —гэта перш за ўсё тэхніка, а пасля ўжо прырода. І калі мы не прапануем нашым дзецям патрэбную, займальную для іх кнігу на роднай мове з улікам тэхнічных дасягненняў канца XX стагоддзя,—марныя нашы патугі ў справе духоўнага адраджэння нацыі.

У 1966 годзе ў выдавецтве «Беларусь» выйшла апошняя кніга Валерыяна Ляшэвіча. Як і папярэднія, яна была адрасавана дзецям, і называлася «Крокі ў жыццё». Змест зборніка склалі адрэдагаванае і скарочанае «Святло з горада», а таксама творы, напісаныя значна пазней, ці не пасля вяртання на радзіму. Чытаеш гэтыя рэчы і дзіву даешся: пісьменніка быццам падмянілі. Так і прэса старонак нікому не патрэбная дыдактычнасць. Большасць персанажаў—піянеры-героі. Адзін змагаецца з лясным пажарам, другі прадухіляе аварыю на чыгунцы... Карацей —ва ўсёй красе сацыялістычны рэалізм. Тужліва робіцца на душы, калі ўсё гэта чытаеш. У чалавека, несумненна, было адчуванне слова. Яму было што сказаць, перажыўшы столькі пакут... Варкута, Севераморск, Ісака-Горка... А ён пайшоў з жыцця, адзін з мільёнаў падданых ГУЛАГа, так і не выказаўшы свой боль, сваю праўду, сваё сведчанне на судзе гісторыі. І ці адзін ён? Сістэма, адпусціўшы ўчарашніх вязняў на волю, паклапацілася, каб яны назаўсёды запомнілі жахлівыя універсітэты, каб яны баяліся нават свайго ўласнага ценю.

Памёр Валерыян Гаўрылавіч Ляшэвіч нядаўна, 12 жніўня гэтага года, на 88-ым годзе жыцця.

Ведаю з тэматычнага плана выдавецтва «Мастацкая літаратура»: у наступным годзе павінен выйсці ў свет чарговы даведнік «Пісьменнікі Савецкай Беларусі», складальнікам якога з'яўляецца Аляксей Гардзіцкі. На маю думку, сёння наспела патрэба ў выданні даведніка «Беларускія пісьменнікі», куды павінны ўвайсці жыццёвыя і творчыя біяграфіі не толькі членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі, а таксама літаратараў-эмігрантаў, іншых творцаў, якія па розных прычынах не з'яўляліся членамі творчых саюзаў. Спадзяюся ўбачыць на яго старонках нататку пра жыццё і творчасць Валерыяна Гаўрылавіча Ляшэвіча.

Уладзімір ЯГОЎДЗІК.

Паўлюк ПРАНУЗА

Я — салдат

Боль узяў мяне ў палон трывала.
Урачы з ім уступілі ў бой.
А магу зрабіць яшчэ не мала.
Быць хачу я на перадавой.

Я — салдат з гвардзейскае закваскі,
Замець веку у мой твар мяла.
У жыцця я не вымольваў ласкі,
Крох не браў з ягонага стала.

Лёс каваў і зброяй і адвагай,
Пераможным крочыў бальшаком.
Сорак пяты. На сцяне рэйхстага
Гнеўна распісаўся я штыком.

Разраслася вёска ў гарадок

Разраслася вёска ў гарадок.
Многа ў ёй утульных, светлых вуліц.
Час забыў на дабрабыт удоў —
Газ, вадаправод іх абмінулі.

Сыдуцца, калі дазволіць час,
У гурток на лавачку жанчыны.
— Жыў бы мой Андрэй... Мой Апанас...
Слёзы размываюць іх маршчыны.

Заспяваюць — слухаць іх гатоў.
Прыгадаюць з сумам лёс суровы.
Ні дачок, ні ўнукаў, ні сыноў.
Іх мужы злажылі дзесь галовы.

Свеціцца блакіт у іх вачах.
Праца — іх і радасць і зарніца.
Рукі — у заклёпках-мазалях,—
І бядзе да іх не падступіцца.

●

Гісторыя зваліла Бога,
Хоць быў пад ім трывалы мур.
І поспехі і перамогі
Прыпісваліся ўсе яму.

Ён ля дзяржаўнага быў пульта
У дні ўрачыстасці, нягод.
Драпежнымі вачыма культа
Глядзеў звысоку на народ.

Сляпілі вочы нам партрэты,
Цытаты — з кніг яго радкі.
Струмень жыцця! Хутчэй у Лету
Змый гэты прывід на вякі.

Слова ў нас абясцэнена...

Слова ў нас абясцэнена,
Клятвамі глушым паветра.
Трэба рашуча і ўпэўнена,
Раскарчоўваць застою нетры.

У кожнага ветразь жыццёвы
Павінен быць пругкім, напятым,
Каб кожная думка і слова
Кусціліся справай крылатай.

У Хатыні

Жаўрук азваўся у нябеснай сіні.
А колькі ў песні весняга святла!
Здалося: не было ахвяр Хатыні
І чорнага Чарнобыля крыла.

Слёзы ўдавы

У яе іх было пяцёра.
Як дубы, на падбор сыны.
Атрымалася б болю мора,
Каб сабраць тыя слёзы вайны.

Белыя званочкі ў цішыні

Сыплюцца сняжынкі на далоні.
Я далей не павяду лыжні.
Чую сэрцам, як у лесе звоняць
Белыя званочкі цішыні.

ПЕРАМОЖАНЫЯ ПЕРАМОЖЦЫ

(Пачатак на стар. 5).

Мы семдзесят гадоў будуем «светлае будучае», а зусім недалёка, у той жа Еўропе, і далей — у Амерыцы, у Японіі людзі нічога не будуюць. Яны жывуць. Умеюць працаваць, умеюць адпачываць, умеюць слухаць і паважаць іншых.

Умеюць спачуваць. І дараваць. Дараваць чужыя грахі. Дараваць нам ленінска-сталінска-хрушчоўска-брэжнеўскія амбіцыі, дараваць геапалітычную слепату ў геапалітычным правядзенні няграматнай геапалітыкі, асновай якой было імкненне сілай навязаць свету сваё бачанне перспектыў развіцця чалавецтва.

Уменне дараваць дадзена вышэйшай культуры.

Са страхам думаеш пра тое, як бы паводзілі сябе мы, калі б раптам гісторыя памяняла б нас месцамі, калі б мы апынуліся на месцы «заходніх» немцаў, англічан, амерыканцаў? Пазіраючы на свет праз чырвоныя акуляры марксісцка-ленінскага матэрыялізму, ці працягнулі б мы руку дапамогі, калі б яны папрасілі? Ці знайшлося б у нашай душы месца спачуванню? Ці даравалі б ім грахі іхнія?

Наўрад... Наўрад...

У час адной з сяброўскіх сустрэч у тым жа Заходнім Берліне Васіль Быкаў сказаў:

«Некалі рускі народ створыць сваю акцыю «Выкупленне». Каб ачысціцца ад сваёй віны перад нямецкім народам».

«Відаць, гэта няскора будзе?» — спытаў Хрыстоф Хойбнер, «Ага, відаць, не раней наступнага тысячагоддзя».

Наступнае тысячагоддзе і блізка, і далёка. Патрэбен час, каб дарасці да разумення дабра. Яшчэ большы час патрэбен, каб дарасці да разумення неабходнасці самому рабіць дабро.

На пачатку стагоддзя Ленін з усёй рашучасцю, на якую быў здольны (а чалавек ён быў рашучы), сказаў: «Бальшавікі павінны ўзяць уладу!» І ўладу ўзялі. Аказалася, што ўзяць уладу — не самае цяжкае. Нават утрымаць яе — не самае цяжкае. І гэта бальшавікі змаглі — дзе падманам, дзе тэрорам. Самае цяжкае — распарадзіцца ўладай. Як распарадзіліся ёй бальшавікі, ведаем мы. Ведае ўвесь свет. Праз семдзесят гадоў іх распараджэння людзі засталіся без хлеба, без волі, без солі. Хаця не, няпраўда, соль пакуль што ёсць. І без картачак. Яе сыплюць у гаршчок, нібы сыплюць на раны. А ў гаршку пуста, а раны адкрытыя.

Гісторыя жыве ў памяці, а лепшая памяць — дакумент. Тое, што можна ўбачыць, адчуць, параўнаць. На гэтай жа Курфюрстэндам стаіць старая царква. Некалі велічны будынак з чырвонай цэглы імкнуўся вострымі шпілямі высока ў неба, сабраўшы вакол сябе, як настаўнік дзяцей, пяці-шасціпавярховыя будынкі бліжэйшых вуліц. У 1943 годзе ў час адной з бамбёжак цяжкая бомба, як нажом, па касой лініі зрэзала верх царквы, пакінуўшы стаяць пакалечаны будынак. Знявечаны і ўкарочаны на трэць, ён нагадвае вялізны снарад з разарванай галоўкай, які і цяпер узвышаецца над бліжэйшымі дамамі.

Немцы не захацелі аднаўляць гэту царкву, пакінулі такой, якой зрабіла яе вайна. Адно толькі накрылі яе дахам.

Можна шмат расказваць што такое вайна, і чалавек нічога не зразумее, не адчуе... А можна не гаварыць нічога, толькі прывесці ў гэтую калеку-царкву і паказаць: глядзі, што бывае, што можа быць.

Сам скалечаны будынак... Белы сумны Хрыстос з адбітай асколкам рукой... Чорна-белыя фотаздымкі тых жахлівых гадоў: пропаведзь часоў вайны, шмат людзей, пастар, над разломамі сцен — неба, халоднае шэрае неба. Нешта сімвалічна-трагічнае, страшнае, як калі б чалавек выйшаў у пустыню і там стаў маліцца богу. Чалавек прывык маліцца не касмічнаму — свайму богу, у сваёй хаце, сваёй царкве. А тут — голыя сцены, а замест даху — халоднае шэрае неба.

Побач з гэтай царквой пабудавана новая ў стылі мадэрн. Прасторны, абрэзаны ўгары васьміграннік, сцены — суцэльныя вітражы з цёмна-блакітнага шкла з трывожнымі, ружоважоўтымі плямамі. Нешта халоднае, касмічнае, і там, на вялікай вышыні, у космасе — распяты Хрыстос. Гукі аргана гучаць у прасторы, нібы льюцца з неба, даючы чалавеку час спыніцца, засяродзіцца, супакоіцца.

Зноў вайна, зноў пра вайну. І зноў пытанне: ці патрэбна яна немцам? Ці хочуць яны вайны?

Трэба пабачыць, што яны маюць — дагледжаныя паркі, капітальна-моцныя дамы, багатыя магазіны, трэба пабачыць, як яны па-гаспадарску дбайна, без мітусні і паспешлівасці працуюць, трэба ўбачыць і адчуць шчырасць, адкрытасць і добразычлівасць да ўчарашніх ворагаў (мы ваявалі з імі не толькі ў 1941—1945 гады, а і дзесяцігоддзі пасля!), — каб адназначна пераканацца: не трэба яна ім. Яны ведаюць, што гэта такое.

Сумна і горна: нас, наш народ, нібы прастачкоў, дзесяцігоддзямі дурылі, даказваючы, што ўвесь час мы жывём на мяжы вайны, што Захад толькі і думае, каб заваяваць нас, нашы багацці, нашы прасторы, нашы... ідэалы.

Баронячыся ад таго Захада, мы пабудавалі берлінскую сцяну, хаця, па логіцы, будаваць яе павінны былі яны. Як заслон ад нашай вузкаспажывецкай маралі, ад нашай антыгуманнай ідэалогіі (дзе чалавека і чалавецтва (!) гатовы кінуць на лобнае месца ў імя утапічнай хімеры), ад нашай герастратаўскай пазіцыі: калі не нам, то і нікому.

Нельга пабудаваць што-небудзь трывалае насуперак розуму. Яно рухне.

І сцяна рухнула...

Але перш чым у работу ўключыліся шматтонныя металічныя молаты, яна рухнула ў галовах людзей. Як алагічная антычалавечая канструкцыя, пабудаваная насуперак натуральнаму току крыві.

Мы толькі што вярнуліся з паездкі па горадзе. Мы пабывалі ў Трэптаў-парку, у раёне Брандэнбургскіх варот, ля рэйхстага.

Нам не стала лягчэй пасля гэтай паездкі.

Пра што думаў Быкаў ля будынка рэйхстага — гэтай масіўнай шэрай грамадзіны са светлымі латкамі свежага бетону, якім замазаны сляды ад куль і асколкаў? Пра што?

Мы абыходзім будынак кругом, моўчкі ідзём паўз шматлікія прыступкі галоўнага пад'езда.

«Тут жа на кожнай ступеньцы ляжала па дзесяць-пятнаццаць нашых хлопцаў», — сказаў ён там некальки скупых слоў. Сказаў і замоўк.

У час штурму Берліна загінуў родны брат пісьменніка Мікола. Можа, і ён ляжаў на адной з гэтых прыступак? А можа, па дарозе да яе? Сам Быкаў у гэты час быў таксама на фронце, у недалёкай адсюль Аўстрыі.

Пад сценамі рэйхстага сёння стыхійны кірмаш. Распрадаецца берлінская сцяна. Людзі ахвотна плацяць тры, пяць марак, каб купіць раздробленыя да памераў карабка запалак бетонныя асколкі.

Навошта купляюць? Навошта... Значыць, яна так уелася ў косці, яна была такая ненавісная, што людзям патрэбна матэрыяльнае пацвярджэнне, што яе ўжо няма, а кавалачак шэрага бетону — канкрэтны, асязальны напамін пра тое, што яе няма.

Няма той сцяны, што апраўдвала і ўзаконьвала жалезны занавес, і нашы танкі на вуліцах Берліна, Прагі, Будапешта праз многія гады пасля канца вайны, і нашу беднасць і ідыятызм нашага жыцця.

І ўсё-такі як сумна глядзець на гэты бойкі гандаль пад сценамі рэйхстага. Тут прадаецца не толькі расфарбаваны бетон сцяны, прадаюцца мундзіры, папругі, фуражкі, пілоткі, гузікі, значкі, медалі і ордэны — самыя розныя і самыя высокія, савецкія і гадзэраўскія. Купляйце, купляйце!...

А зусім побач, на крутым беразе Шпрэе на металічнай агароджы-сценцы белыя крыжы. Я налічыў іх пятнаццаць. Яны вісяць як жалобная памяць пра тых нямецкіх юнакоў, што кідаліся ў ваду не шырокай тут ракі, каб, пераплыўшы яе, адолець сцяну і апынуцца ў свабодным свеце. Пагранічнікі расстрэльвалі іх з рачных катэраў, можна сказаць, расстрэльвалі ва ўпор. Свае сваіх.

Пра што думаў тут, на перакрыжаванні вайны і міру пісьменнік і філосаф, якому наканавана было прайсці ўсё вайну ад пачатку да канца? Чалавек, для якога вайна стала лёсам, а лёс — пастаянай вайной. І ў 1941—45-я гады, і ў гады пяцідзесятыя і шасцідзесятыя, і цяпер. Чалавек сусветнай славы і сусветнага інтэлекту, які прычыны і згубнасць сталіншчыны бачыў дзесяцігоддзі таму назад. І слова «сталіншчына», здаецца, ці не ён першы прамовіў уголас.

Пра што думаў...

Наш цягнік ідзе па Польшчы. За вокнамі праплываюць новенькія двух-трохпавярховыя цагляныя катэджы, роўныя, нібы разлінаваныя пад рулетку, засеяныя палі — прыкметы парадку і перспектывы. Перспектывы, прадыктаванай не чужой воляй, чужой камандай, а ўласным інтарэсам, і інтарэсам не з раніцы да вечара, а надоўга наперад, можа, назаўсёды.

«Палякі яшчэ паставяць помнік Герэку за тое, што ён займеў сорак мільярдаў долараў доўгу. Бо ён пусціў гэтыя долары на будаўніцтва, а не на ракеты».

«Наша бяда ў тым, што на працягу ўсіх сямідзесяці гадоў знішчалася прыватная ўласнасць, прыватны інтарэс. Знішчаліся, хаця, дзякаваць богу, не вынішчаны канчаткова. Без трывалага інтарэсу няма будучага. Тапталіся, топчамся і будзем таптацца... Усё ў нас парушана на генным узроўні».

«Найбольш мне шкода нашых інтэлігентаў, нацыянальных падзвіжнікаў. Лёсік, Ластоўскі, Луцкевічы, Арсеньева... Ды і Купала з Коласам. Так яны дружна ўзяліся за нацыянальнае адраджэнне, а іх зламалі, зглумілі, знішчылі. І нават сёння не можам нічога зрабіць, рэабілітаваць іх не можам. Дзе, у якой нацыі гэта магчыма, у якога народа?»

І сапраўды — дзе, у якога народа?

Як паказалі апошнія выбары ў саюзны і рэспубліканскі парламенты, як паказаў ход сесіі парламента Беларусі, ёсць рэальная небяспека, што нізкая культура (і слабасць нацыянальнай самасвядомасці) пад прэсам партыйна-бюракратычнага дыктату можа ператварыць беларускі народ у пятую калону ў барацьбе з нацыянальнымі рухамі іншых народаў нашай краіны, зрабіць з партызанскай рэспублікі рэспубліку паліцэйскую.

І ўсё гэта пасля — пры Чарнобылі!

І ўсё гэта ў час перабудовы.

Вайна была. Вайна не скончылася. Вайна працягваецца.

У ДОБРЫ ЧАС «АЎТАЗАВОДЗЕЦ»

Яшчэ і яшчэ раз хочацца нагадаць і падкрэсліць неаспрэчную ісціну: нацыянальнае Адраджэнне залежыць ад кожнага з нас. Вяртанне беларускай мовы ў паўсядзённы ўжытак — таксама. І ў першую чаргу да тых, хто адказвае за саму прапаганду друкаванага слова. Ад нас, калегі-журналісты.

І прыемна, што большаюць шэрагі рупліўцаў, якія разумеюць: наш маральны, прафесійны і грамадзянскі абавязак — рабіць усё магчымае, каб расла колькасць беларускамоўных выданняў. Прыйшлі да гэтага ўсведамлення і ў рэдакцыі газеты Беларускага аб'яднання па вытворчасці вялікагрузных аўтамабіляў («БелаўтаМАЗ») імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка. Яна — больш чым шматтыражка і сваёй папулярнасцю сярод чытачоў, і змястоўнасцю нумароў, і тым, што распаўсюджваецца не толькі ў Мінску, а і за межамі яго, дзе таксама ёсць прадпрыемствы аб'яднання.

Праўда, пакуль што гэтая газета цалкам па-беларуску не загаварыла (спадзяёмся, што гэта справа часу), але нумар, які выйшаў у пятніцу, 7 верасня, прыемна здзівіў. Нумар гэты, прысвечаны 500-годдзю з дня нараджэння Ф. Скарыны, рэдакцыя выпусціла на беларускай мове.

Атрымаўся ён змястоўны. Тут і зварот народных дэпутатаў БССР Л. Баршчэўскага, Н. Гілевіча, П. Садоўскага, А. Трусава, Я. Цумарава «Учора — ідэя, сёння — закон» (пра тое, што «адраджэнне беларускай мовы закранае ўсе грамадскія пласты жыцця Беларусі — вытворчасць, сацыяльныя сферы, адукацыю, культуру, палітыку»). І зварот старшыні рады ТБМ імя Ф. Скарыны Заводскага раёна г. Мінска Г. Радновай «Да чытачоў» з запрашэннем уступаць у суполкі таварыства, дапамагаць яму матэрыяльна, а галоўнае — прапагандаваць беларускую мову. І артыкул В. Чамярыцкага «З кагорты тытанаў» — пра Ф.Скарыну. І верш Н. Гілевіча «Мара Скарыны»: «Марыў калісьці славуты Скарына, «ціснучы» кнігі на мове бацькоў: простаму люду ў роднай краіне зробіць даступнай ёй мудрасць вякоў».

Прапануецца пачатак публікацыі мемуараў аднаго з найбольш вядомых менеджэраў ЗША Лі Якока «Кар'ера менеджэра». Магчыма, вопыт нечаканага ўзыходжання сына італьянскага эмігранта ад студэнта да кіраўніка буйнейшага ў свеце аўтаканцэрна спатрэбіцца тым, хто ва ўмовах рынку захоча заняцца прадпрымальніцтвам. А каб беларускія менеджэры не толькі мелі поспех у вытворчасці, а і маглі размаўляць на сваёй роднай мове, рэдакцыя друкуе руска-беларускі слоўнік тэрмінаў машынабудавання, які змяшчае 807 лексічных адзінак. Напачатак — назвы асоб па прафесіі.

Нарэшце, і праграма тэлебачання на тыдзень пададзена ў «Аўтазаводцы» па-беларуску.

Беларускі нумар будзе ў далейшым выходзіць кожную пятніцу. Няма сумнення, што паступова прывыкнуць да беларускай мовы нават і тыя чытачы, якія сёння яшчэ крывяцца на беларускае слова.

На заключэнне застаецца сказаць традыцыйнае: «У добры час, «Аўтазаводзец»!». А заадно хочацца загадаць: якая наступная шматтыражная газета правіць гэткую ініцыятыву? «Оптик»? «Рабочее слово»? «На стройках Минска»?

ЛІМАВЕЦ.

Вяртаючыся да надрукаванага

Дзядзечка, дазвольце...

З нагоды сярдзітасці «нейкага Л. Васіна» і рашучасці «дружнай брыгады», пра якіх «ЛіМ» пісаў 3 і 17 жніўня г. г.

«Не встречал белоруса, который не понимал бы по-русски. Для чего в Бресте вывески или аншлаги с названиями улиц на двух языках?» Сапраўды навошта? Дастаткова аднае мовы—беларускае. І справа тут не ў лішніх выдатках на афармленне. І нават не ў тым, што беларускае слова, як і рускае, не лічыцца цяжка даступным для іншамоўных жыхароў рэспублікі. Урэшце, і гаворка не пра расійскую Разань, але—беларускі горад. Якія тут, здавалася б, могуць паўставаць спрэчкі? У Маскве, дзе жыву, усё па-руску, так яно і быць павінна. І ні беларусы, ні ўкраінцы, ні армяне, ні літоўцы, ні людзі многіх іншых нацыянальнасцей—а гэта амаль што кожны дзесяты жыхар рускае сталіцы—не абураюцца, што не бачаць дубляваных шыльдаў, афішаў на сваіх нацыянальных мовах. І не толькі таму, што разумеюць па-руску. Проста шануюць натуральнае, суверэннае права гаспадароў зямлі, горада, сярод якіх пасяліліся. Адпаведна—у Арменіі — па-армянску, у Літве — па-літоўску, што ж тут незвычайнага? Нядаўна і з нашае Бацькаўшчыны пачулася разумнае дзяржаўнае слова: «У Беларусі ўсё беларускае» (гутарка з віцэ-старшынёй Вярхоўнага Савета БССР В.І.Шаладонавым — «Звязда», 1990, 15 жніўня). Добра сказана ды яшчэ не зроблена. А бязглуздыя спрэчкі—быць ці не быць беларускасці ў Беларусі — не толькі не ціхнуць, але набываюць новую вастрыню, агрэсіўнасць і не ў адным Брэсце. У Баранавічах, даведваюся з друку, з беларускімі шыльдамі, афішамі ваюе не абы-хто—сам загадчык мясцовага аддзела культуры, «талковы, граматны спецыяліст» (Жданко В. Ультыматум. — «Звязда», 1990, 17 жніўня). А колькі іх, «талковых, граматных», змагаецца сёння па ўсёй Беларусі з... культурай, мовай беларускай? Безліч.

Так што праблема, выплеснутая на старонкі брэсцкай (ну і слоўца «...сцкае», не, лепш пачалавечы—берасцейскай) «Зарі», далёка не вонкавая, не «шыльдавая», а куды глыбейшая, імя ёй — суверэнітэт Беларусі. Ён жа — цэласны, непадзельны. Мова, культура, ёю створаная — гэта, апрача ўсяго, духоўная мяжа, граніца суверэннасці народа, якая сведчыць і адначасова бароніць яго нацыянальную тоеснасць, як у выпадку палітычна-грамадзянскіх, эканамічных інтарэсаў нацыі чыніць граніца дзяржаўная.

Іншая справа, што з граніцамі суверэннасці беларусаў горш, чым кепска — «ніякага суверэнітэту не было» (згаданая вышэй гутарка з В. І. Шаладонавым). А было тое, што звычайна і бывае з безгранічна-несуверэнным, а дакладней, каланіяльна-падняволным людам. За яго спіной і, часцей, наперакор яму вырашалі, колькі бульбы сеяць, кароў трымаць, колькі напрацаванага дабра пакідаць ці вывозіць з Беларусі, куды, у якія Афганістаны беларускіх сыноў на гарматнае мяса пастаўляць. Аб мове таксама «паклапаціліся»: натаптаўшыся ботамі па «апратцы душы беларускай», адрынулі яе як штосьці анахранічнае, непатрэбнае, узяўшыся цывілізоўваць беларуса ЯЗЫКОМ БОЛЕЕ ПРОСВЕЩЕННЫМ.

Вяртаючыся ж да сумненняў адносна правамоцтваў беларускай мовы, трэба заўважыць: «Заря» і яе аўтары нічога арыгінальнага не вынайшлі. Колькі іх нагаворана, выдрукавана, вердыктаў слову нашаму!.. Вось адзін з такіх, ранейшых: «учение об особом белорусском языке составляется искусственно... Следовало бы положить предел этим тенденциям и злым учениям» («Окраины России», 1912, 21. 04. № 16). Або другі, куды «грунтоўнейшы» разварот: «О белорусском языке собрание высказалось, что это не самостоятельный язык, а только наречие русского языка и решительно нет никакой надобности в развитии его и распространении, тем более, что и само население считает его языком простым, стремится заменить русским литературным языком и обижается даже, когда образованный человек заговорит с ним на этом языке. В то время как общегосударственный русский язык является главным орудием приобщения белорусов к европейской культуре, язык белорусский только закрывал бы ему доступ к прогрессу» (Труды виленского общества «Крестьянин» по выяснению нужд деревни Северо-западного края. Вильна, 1910, с. 5). **«Язык искусственный», «само население не хочет», «общегосударственный русский язык»** (двуязычие па-цяперашняму), **«положить пределы»...** Пазнаеш, шаноўны чытачу? Логіка, тэмперамент, стыль — да чаго ж знаёмыя! Нічога новага пад сонцам. Усё ўжо было. Хіба што фірмы, а дакладней, шыльды на іх зменены: Калісь — «Окраины России», «Северо-западная жизнь»; цяпер — «Заря», «Сельская газета» (згадаўшы «довады» Стряпчего...), «Маяк коммунизма». Сутнасць жа — тады й цяпер — нязменная: акраінна-каланіялісцкая. Але ж Беларусь наша, кажуць, ужо краінаю стала і восьвось у самастойныя, суверэнныя (не толькі дэкларатыўна, але фактычна) выб'ецца. То, можа, досыць выпрабоўваць цярпенне беларускае, панове русіфікатары (ці паланізатары, — бо і тыя апошнім часам голаў уздымаюць з-пад шыльды «польскага» касцёла на Беларусі)?

Што ж атрымліваецца? Памкнуўся беларус абнаўляць сваю патаптаную «апратку душы», мову мацярынскую адраджаць — зноў **окрики.** І не адзінкавыя. У Бярозе ажно брыгадным падрадам рушылі ў наступ, пад скрып знаёмае, заезджанай пласцінкі: **в районе па-белорусски не говорят.** Ну навошта гэтак рашуча, таварышы брыгаднікі? І так, даруйце, не па-джэнтльменску ў адносінах да кабеты, да слаўнае пясняркі Ніны Мацяш, перад чыёй паэзіяй схілялася, зачараванаю, буйнейшая кветка ліры беларускай — Канстанцыя Буйла. Але паколькі бярозаўскія падрадчыкі наважыліся пашырыць аператыўную прастору змагання з беларушчынай на цэлы горад, раён, не зашкодзіла б ім папярэдне задбаць пра сваю гісторыка-філалагічную амуніцыю. Пазірнуць, для пачатку, на гісторыка-этнаграфічную карту М. Доўнара-Запольскага («Асновы дзяржаўнасці Беларусі», 1919) — выразна пазначаны на той мапе спрадвечныя межы беларускага этнасу. Там і Бяроза, і Беласток з Аўгустовам (цяпер—Польшча), Вільня і Свяцяны (Літва), Ілукшта (Латвія), Духаўшчына, Старадуб, Навазыбкаў (Смаленская, Бранская вобласці РСФСР).

Не аб рэвізіі сучасных граніц гаворка. Прыгадваю гісторыка-этнаграфічны факт — толькі і ўсяго. Трэба ж неяк утаймоўваць распаношаных далакопаў беларушчыны. Бо змаўчы сёння выпады з-пад Бярозы, заўтра пачуеш іх у Гародні, Віцебску, Мінску — чыталі ж не так даўно ў расійскім друку пісьмо мінскіх патрыётаў: **«В нашем северо-западном крае Белоруссии...»** Намаўчаліся за сваю гісторыю, мала не захліпнуліся.

Толькі ў XX стагоддзі мову беларускую з яе народам разам моцна пацяснілі, многа дзе закупорылі ёй і нават перацінулі вены. Жах чарнобыльскі радыёнуклідны яшчэ больш падкалечыў нацыянальны арганізм наш. І ўся гэта Каінава работа рабілася і, па інерцыі, йшчэ працягваецца пад літаўры няпрошаных — залётных і сваіх, дамарослых — «прогрессистов-цивилизаторов», звыклых вырашаць за цэлы народ, на якой мове гаварыць яму і дыхаць. Мо пара нарэшце сказаць цвёрдае СТОП заезджанай кружэлцы пра неперспектыўнасць мовы Скарыны—Купалы?

Б'е часіна беларускага Адраджэння. Наслухаліся трэляў ад салаўёў з капытамі («Салавей, чуцён мне стук тваіх капыт» — Генрых Гейнэ). Новыя і забытыя мелодыі нараджаюцца і адраджаюцца з крыніц і сэрцаў беларускіх. То праўда, беларусы ведаюць рускую мову, чым па праву могуць ганарыцца. І па гэтакаму ж праву маглі б разлічваць на веданне ці, прынамсі, на шанаванне іхняе ўласнае мовы. Па-руску мы **понимаем** і **разумеем.** А паколькі **разум имеем,** ад Бога дадзены, стагоддзямі гартаваны, —можа, хопіць прабаўляцца чужацкімі камандамі, павучаннямі, вокрыкамі?

У самы раз задаць самім сабе пытанне: дакуль можна на сваёй уласнай зямлі гібець папіхачамі-папрашайкамі? Дзядзечка, дазвольце шыльду беларускую вывесіць, клас, школу беларускую адкрыць... Дазволь, дзядзечка, пераначаваць мне, гаспадару, у сваёй хаце пад... лаўкаю... Гэтак?!

Ці не лепей, аднак, катораму з гэтых дзядзечкаў, хоць аднаму для пачатку, забурэламу на зневажанні беларускае годнасці, паказаць на дзверы. Хто, урэшце, у хаце гэтай гаспадар? Прошаным канём гаспадаркі не ўправіш. Пара сядлаць свайго буланага.

Ды спярша трэба выпаўзці з-пад лаўкі. З карачак устаць на ногі, выпраміцца. Іншага—такі праўда! — не дадзена.

Аляксей КАЎКА.

г. Масква.

У адным са сваіх жнівеньскіх нумароў газета «Вячэрні Харкаў» адвяла цэлую старонку творчасці Маі Львовіч. Пад рубрыкай «Беларуская муза харкаўчанкі» была змешчана падборка яе вершаў «Астрашыцкі Гарадок». Нізка пададзена па-ўкраінску і па-беларуску. У прысвячэнні ўкраінская паэтэса пазначыла: «Ларысе Лявонцьеўне Кароткай на згадку пра яе сына і майго сябра Варлена Бечыка (1939—1985)».

Мая ЛЬВОВІЧ

АСТРАШЫЦКІ ГАРАДОК

●

Выпадала дарога, выпадала
дарога,
Выпадаў табе шлях і нябліз кі,
І хадзілі далёка, і хадзілі далёка
Да цябе сакавіцкія пісьмы.
Сакавік — нараджэнне,
сакавік — нараджэнне.
Сакавік гэта дзень мацярызны.
І спяшаліся ў дзень твой,
І спяшаліся ў дзень твой,
У твой дзень сакавіцкія пісьмы.
Хто сказаў, што ім хопіць,
хто сказаў, што ім хопіць,
Хто яго ўнёс у вечныя спісы?
Так далёка ці ходзяць,
так далёка ці ходзяць
Нават і сакавіцкія пісьмы?
Але адрас любові, але адрас
любові,
Як — згубіўся той адрас,
згубіўся?
Як — не пішуцца болей,
як — не пішуцца болей,
Як — не йдуць сакавіцкія
пісьмы?
Каб не слёзы, не слёзы, каб не
слёзы салёны,
Каб з гаючай крыніцы напіцца.
Каб прыйшлі табе й сёння,
каб прыйшлі табе й сёння,
Каб знайшлі сакавіцкія пісьмы.

●

Ці і не хлопец мо зусім,
а дрэўца?
Будзіўся перш,
Перш ад нацятае струны —
бярэзіны,
Ад верб.

Цяпла не хапае яму.
Яму не хапае сонца.

●

Была б чараціна... Калі пад
вадою...
Ды ўсе абламай чараты хоць
Па-над ракою! Калі доўга...
Як праз яе дыхаць?!
Чараціна... Самаамана!
Не дапаможа нічым яна.
Лепей сама. Неяк сама я.
Што з яе? Чараціна!
З галавою ды пад вадою!
Ці жыць пад вадою —
прыхамаць?
Мо й чараціна... Калі доўга,
Як без яе дыхаць?
Магчыма, апошняе гэта.
Магчыма,
Апошняе. Дзякуй, што помніш.
Дзякуй табе, мая чараціна,
Тоненькая помач.

●

Яго няма, яго няма на свеце.
А я пішу.
Пішу лісты — пішу яму я
вершы —
І на ягоны даўні адрас шлю.
Там быццам ён, каму пішу,
пішу я
Свой верш, які ўсё кліча і заве,
Там быццам ён... І хтось яшчэ. Я
чую.
Ці там душа адзіная жыве?

Чытае, перачытвае, і знову
Чытае, перачытвае лісты.
Каб адказаць — бы адабрала
мову.
Слоў адшукаць не можа. Гэта ты.
Як у мяне знячэўку мову адбярэ,
Як я не здолею — не толькі
верша...
Ды што б са мной ні
здарылася — вечна,
Удзячна буду помніць я цябе.

Варлен БЕЧЫК. 1972 г.

З'яўляліся перад вярбовым
коцікам
Твае лісты.
Тужыла над труною. Але й потым
Застаўся ты.
Інакш адкуль надзея зноў
бярэцца —
Чакаць ліста —
Зялёнага твайго лісточка,
дрэўца...
Вясна.

●

Зямны паклон ёй, што адзінае
Ад сябе адарвала цяпло дзяцінае
І пайшла, дзе стрэлы, дзе турма,
Дзе смерць сама.
І горай за смерць. Колькі ёй
выпала,
Засталося нявыплаканае
У таго ад грудзей адарванага,
Узгадаванага
Яе малаком, усім, што
выцерплена,
Усім, што аддадзена.
Зямны паклон ёй.

●

Чакала: прысніся ў сне.
Прыйшоў нарэшце ў адведкі.
Ды скарчанелы гэткі,
Пасінеў.
«Прыхініся, харошы!»
І выслізгвае з рук.
Ну, вядома, дарослы.
А ён жа ў мяне хлапчук.
Хлапчук, дзіцянё. Да смерці.
А ён жа ў мяне з вайны,
Жыў у маразы,
З самай вайны мерзне.
Клічу яго ў сон свой
І да грудзей хіну.

●

Чарнобыльская ноч.
У чыстым полі цікуе
Чатыры гады куля,
З цябе не спускае воч.
Гэтак было ўжо. Нас яна
Цікавала й тады.
Цікавала чатыры гады.
Толькі цяпер — нябачна
Толькі цяпер — паволі
Кроў выпівае-п'е,
Цяпер забівае-б'е
Бяззбройнага ў чыстым полі.
Якая на гэтай вайне
Твая палявая пошта?
Чатыры гады трывожнае:
Хай куля цябе абміне!

●

Астрашыцкі Гарадок
І Прылукі.
Твой выток і твой
грудок.
Ад сустрэчы толькі
крок
Да разлукі.
Толькі ясны успамін
Пра світанне.
Каралішчавічы...
Мінск...
Ад спаткання толькі
міг
Да расстання.
Міг ад весняга лістка
На мяжы красавіка —
Мая.
Да асенняга званка.
Толькі міг, бы звон
струмка.
А плыве, плыве рака,
Не мінае.

Палітыка з вуліцы Пёцефі

ВЕНГРЫЯ жыве паводле сярэднееўрапейскага часу, плюс 1 гадзіна. Такім чынам, паміж тамтэйшым часам і нашым беларускім утваралася гадзіна розніцы. Гадзіна розніцы паміж суверэннай савецкай рэспублікай і незалежнай еўрапейскай краінай, якую сябры па лагеры (сацыялістычным) вучылі будаваць сацыялізм. Але час, бывае, ставіць настаўнікаў на месца вучняў-пачаткоўцаў...

Адчуўшы сваю зямную чалавечую эфемернасць перад усемагутнай бессмяротнасцю Часу, я вырашыла... не ганяць па цыферблаце пакорлівыя стрэлкі гадзінніка. Тым больш, што па-мінску яны ішлі на гадзіну ўперад за стрэлкі гадзіннікаў венгерскіх, і гэта стварала пэўныя ілюзіі... (Што я хачу сказаць? Ды нічога асаблівага. Калі, напрыклад, спрасонку глянуўшы на свой фірменны «Луч», які паказваў «восем», я думала пра сняданак, прызначаны на 7.30, ужо ў прошлым часе, дык тут жа высвятлялася, што яшчэ паўгадзіны маю ў запасе!).

Тое, што розніца паміж еўрапейскай Беларуссю ды еўрапейскай Венгрыяй меней за ўсё адчувалася ў часе, тлумачыць, думаю, не трэба.

І ў 60-я гады, калі народна-дэмакратычная Венгрыя амаль не лічылася «заграніцай», тут білася сэрца Еўропы. (Няхай не крыўдуе Літва-суседка, прызнаная яе геаметрычным цэнтрам: сэрца ніколі не атаясамліваецца з цэнтрам, яно заўсёды трошку ўбаку). Сюды, у гэты блаславёны Богам край, абласканы сонцам, расквечаны сінечаю неба, смарагдам лясістых гор, блакітным бляскам рэк, адораны здаровым паветрам ды ўрадліваю зямлёй, ахвотна ехалі на адпачынак «тоўстыя людзі з Захаду». Той жа Балатон яны апаноўвалі не меней як савецкія турысты.

Сёння ўсё новыя і новыя тысячы, мільёны турыстаў паспяваe прыняць маленькая краіна. Як і раней, Балатон — буйны курорт: улетку венгры ў асноўным пакідаюць свае прыазёрныя дачы, здаючы іх багатым замежным гасцям. А вось хто будзе гаспадарыць у піянерскіх лагерах, пакуль незразумела. «Піянерскія лагеры яшчэ ёсць, а саміх піянераў ужо няма...» — задуменна мовіла наша гід Жужа.

Праўда, паблізу і ніводнага краявіду з піянерскім лагерам не было. Вуліца Пёцефі, на якую выходзіў галоўны фасад нашага атэля, нагадвала праспект Булдуру ў Юрмале: з паўночнага боку — пляжы, з паўднёвага — чыгунка. Паміж імі дачы, вілы, паркі, магазіны, рэстараны, кіёскі. Па той бок чыгункі—жылыя кварталы, музей Імрэ Кальмана (кампазітар адпачываў у Шыафоку), універмаг, аптэка, пошта. І, канечне, царква. Даўнейшая, XIX стагоддзя (каталіцкая; прычым, інфармацыя ў ёй пададзена папольску), і новая. Новая — на зялёным узгорку, з імкліва ўзнесеным мядзяным крыжам над чарапічным дахам; уваход аздоблены зашклёнымі «вачамі» і драўлянымі разнымі крыламі; унутры лаўкі са свежага светла-жоўтага дрэва з прыгожа раскіданымі радзімкамі сучкоў. Ад дрэва подых чысціні, святла, спакою, сапраўднасці. Інтэр'ер недароблены пакуль, але службы, відаць, спраўляюцца, і ў алтары стаяць свежыя кветкі.

Ці не круглыя суткі працуе маленькі сельскагаспадарчы рынак: перац, персікі, цыбуля, морква, мытая круглявая ружовая бульба — кожная з добры мужчынскі кулак. А побач—магазін прадметаў рэлігійнага культу. І ў самой краме, і на летніх прылаўках—крыжыкі на ланцужках і на мармуровых падстаўках; свечкі, абразкі; аграмністыя скураныя футаралы для Бібліі, шкатулкі; статуэткі Дзевы Марыі і маляваныя выявы Ісуса Хрыста, іудзейскія сямісвечнікі з зоркаю Давіда; царкоўныя лампадкі; малітоўнікі...

УЖО СТОЛЬКІ расказвала пра сваё падарожжа самым розным людзям, што, напрыклад, нашыя штодзённыя праходкі па Шыафоку зліліся ў рэшце рэшт у памяці ў адну вялікую прагулку...

Мы выходзім з атэля і крочым у бок прычала, абмінаючы кварталы, як цяпер кажуць, фазэндаў, пабудаваных з большай ці меншай архітэктурнай фантазіяй, у межах большых ці меншых сродкаў. З вуліцы не відаць ніякіх гародчыкаў (мо іх і няма?) — толькі сады і кветнікі, а ў іх ружы, мальвы. Сцежкі-гравійкі або дарожкі, высцеленыя пліткай, тэрасы з пласцікавымі дыванкамі, драўляная або плеценая мэбля. Людзі — або з кніжкай, або за бяседай, або занятыя чымкольвечы з лёгкіх спартыўных гульняў.

Дзе людзі — там і транспарт. У зоне адпачынку ён проста казачны. Тут і аўтапоезд «Ліліпут». Тут і брычкі, запрэжаныя парай коней — вупраж лёгкая, без хамута: шлеі, шоры, на баках званочкі. Коні выпеставаныя і пародзістыя. Кіруюць імі мадзьяры з лейцамі ў руках. Каларытныя фігуры: рыжаватыя вусы, чорны капялюш з аздобай, бялюткая кашуля, расшытая цёмная камізэлька, наваксаваныя боты. Побач праязджаюць веласіпеды, веламабілі... А конная паліцыя глядзіцца тут як мо і не зусім сур'ёзны атрыбут гэткай «вулічнай масоўкі з замежнага кіно».

Легкавых машын, канечне, мноства: «Судзукі», «Лада», «Фіят» італьянскі і «Фіят» польскі, «Форд», «Лінкальн», «Паланез», «Рэно», «Мерсэдэс», «Самара», «БМВ», «Шкода», «Паршэ», «Татра», «Опель», «Фольксваген», «Таёта»... Дарэчы, матацыклы «Таёта» і «Ямаха» таксама бачылі, і нашы мужчыны абступалі тое дзіва, як у перадваеннай вёсцы хлапчукі абступалі «кукурузнік».

А наконт машын... Многія з іх пра што можна меркаваць з-за добра-такі запыленых дахаў, стаяць на вуліцы не адзін тыдзень. І ніхто іх не псуе, не разбірае на запчасткі! Гаспадарам аўто, відавочна, і ў галаву не ідзе хоць бы клопат зняць ды схаваць люстэркі, як робяць савецкія ўладальнікі машын, нават прыпыняючыся на колькі хвілін ля ўласнага дома.

І яшчэ адно ў сувязі з машынамі, але з тымі, што на месцы не стаяць.

«Жанчына, якая бяжыць, падобная да курыцы». Забойная іронія гэтага выслоўя чэзне ва ўмовах нашых дарог, дзе жанчына, калі не будзе бегчы, можа апынуцца пад коламі, сапраўды як тая курыца! Мусіць, гэта еўрапейцы прымаўку і выдумалі, бо самі (у тым ліку і жанчыны) праз вуліцу не бегаюць, нават калі на паўдарозе запалілася чырвонае святло. Машына загадзя сцішвае ход і пачціва замірае перад постацю чалавека, пакуль той не пройдзе. Пешаход пры гэтым не мітусіцца і крочыць з хуткасцю звычайнай сваёй хады.

Гэта не тое, што ў родным Мінску, дзе пешаходу ой як трэба пільнавацца нават у сваім двары і ўцякаць ад машын. А па сутнасці, уцякаць ад людзей, якія праз элементарную сваю нявыхаванасць могуць учыніць вялікае зло. Ды ў той жа Венгрыі з пародзістага рахманага звера машына вокамгненна ператварылася б у шалёнага сабаку, калі б не сядзеў за рулём чалавек, уважлівы да людзей пешых.

ВУЛІЦА — гэта вітрыны. Ну хіба скажаш коратка пра вітрыны Шыафока?

У латках румяняцца персікі, жаўцеюць бананы, пунсавеюць таматы; ружавеюць зацягнутыя поліэтыленавай плёнкай палавінкі арбузаў; у акуратных цэлафанавых пакуначках раскладзена макавае зерне, кукуруза, лушчаны грэцкі арэх; па сценках буданчыкаў спускаюцца пляцёнкі палымянага перцу і лілова-белага чышчанага часнаку. У скрынках на асфальце стракацяць цэтлікамі вялізныя — не менш як на літр — бутэлькі колы, сітро. У віна-лікёра-гарэлачных барах, як шулы ў добрым парканe, стаяць размаітыя ёмістасці з таямнічымі напоямі...

Сям-там без аніякай чаргі людзі (па-нашаму, мабыць, курортныя «дзікуны») бяруць праз акенца кіёска гарачыя стравы ў аднаразовай пластмасавай пасудзіне, сілкуюцца за высокімі столікамі тут жа на тратуары. Потым купляюць непадалёк рознакаляровыя шарыкі марожанага. (Але нешта не магу даўмецца, пабачыўшы сярод шарыкаў блакітныя: з якога ж натуральнага расліннага прадукта можна здабыць гэткую атрутліва-купарвасную фарбу?).

Памаўзлівыя вераб'і сваім чырыканнем прымушаюць у думках вярнуцца дадому. А вока заўважае яшчэ адзін салодкі напамінак пра родны кут, пра крэўны будзень: ЧАРГА! Неверагодна. Але... гэта ўсяго толькі чарга ў касу па білеты на агульны пляж, і яна хутка, увачавідкі знікае.

Можна і Камароўку згадаць, глянуўшы на шчыльныя шэрагі размаітых трантаў, але вобраз далёкага мінскага базара адступае перад жывым аблічам рэальнага рынка.

Блішчаць россыпы біжутэрыі; гронкамі звісаюць дыхтоўныя торбы з пахкай натуральнай чорнай дрыготкай секундная стрэлкай).

І чаго яшчэ толькі ні пабачыш: венгерскія лялькі, мініяцюрныя гліняныя глечыкі, крохкія ажурныя букецікі са шкла... Насценных талерак асабліва багата. А белая фарфоравая скрыпка — зусім як сапраўдная — мабыць, адна-адзіная на ўвесь белы свет. Затое гіпсавая дуля на падставачцы, складзеная з далікатных пальцаў, вылеплена, відаць, масавым тыражом, таму і кідаецца ў вочы з вітрын, быццам галоўны сувенір: «Прывітанне з Венгрыі, сябры!»

Зазіраць за парог ці нават проста спыняцца ля вітрын ніякавата: тут жа немаведама адкуль выскоквае гаспадар і ці то запрашае, ці то пытаецца: «Тэшэ?» (аналагічна пытанню польскіх прадаўшчыц: «Прошэ?»). Праз невялікія паўзы «тэшэ» будзе паўтарацца, пакуль ты, з адчуваннем, нібыта цябе цягнуць за руку, не выйдзеш з крамы ці не адступіш ад вітрыны.

Вось мая калежанка кратае нейкі кошык — і побач узнікае ветлівы дзядок: «Біттэ, мадам!» Зразумеўшы, што мы той кошык не возьмем, пачынае адно за другім паказваць рознае пляценне: «Біттэ, мадам! Біттэ, мадам!»

Але мы не спяшаемся «ўступаць у рыначныя адносіны» і крочым па алеі да нейкага прылаўка з тэлевізарам, дзе тоўпяцца і смяюцца людзі — не надта гучна, затое да слёз. Толькі ж на чорна-белым экране зусім не смешная карцінка: буйным планам твар пажылой цёткі, а на ўзроўні падбародка то ўзнікае — то знікае дзіцячая галава. Хвіліна — і прычына агульнай весялосці зразумелая! Аказваецца, тут можна купіць майку, упрыгожаную на грудзях уласным фотапартрэтам пакупніка. Як, куды сядае кліент перад камерай, і не ўгледзіш, але тэлеманітор пакажа яго «візітную картку» ўсім. Дык і паказаў, як бабуля не можа ўтрымаць на каленях непаседлівае малое...

І раптам за спіною звернуты да некага спалоханы голас: «А ты не знаешь, сколько это стоит???!» Цяпер ужо наша чарга пагыгыкаць: шкада, што навокал ніхто, апроч нас, тую рэпліку не зразумеў.

НАЎРАД ЦІ мы нечым асаблівым адрозніваліся ад тамтэйшага люду. Ля гасцінічнага ліфта са мною віталіся немцы (відаць, у іх пакуль яшчэ прынята казаць «гутэн морген» чалавеку, якога бачыш на сваім паверсе, хай сабе першы і апошні раз). Ужо ў Будапешце нярэдка прыпынялі мадзьяркі — пыталіся дарогу на перон, удакладнялі час. Аднойчы ў гастраноме зусім старасвецкая бабуля не магла знайсці на пачку пячэння цану — прасіла памагчы...

Канешне, цяжка сярод людзей без ведання іхняй мовы. Ды выручалі «мовы міжнацыянальных зносін»: можна было паразумецца або па-англійску, або скарыстаўшы пару нямецкіх слоў, тым больш, нямецкая ды англійская густа ўжываюцца ў рэкламе, на шыльдах. (Між іншым, і родная беларуская дапамагла аднойчы разабрацца у надпісу «gumi cukorka»: гумка-цукерка, жавальная цукерка). Часцяком чулася ў Шыафоку і гаворка палякаў — не так турыстаў, як бізнесменаў. Нават ля нашага рэстарана нейкая пані разгарнула гандаль.

Мадзьяры, немцы, аўстрыякі, чэхі... Відаць, тут яны ў асноўным і складаюць «партрэт еўрапейскага курортнага натоўпу». Людзей многа: і дарослых, і юных, і малых. Дзеці не шкодзяць, не енчаць, не віскочуць. Дарослыя энергічныя, але не мітуслівыя. Не бразгаюць дзвярыма, не перагукваюцца на вуліцах ды ў гасцінічных калідорах. Не ходзяць, уткнуўшы рукі ў бакі ды расставіўшы локці. Не штурхаюцца і не наступаюць на пяты — «захоўваюць дыстанцыю» паміж сабой і да сябе падобнымі. На тварах — пачуццё чалавечай, дый уласнай, годнасці, у вачах спакой, разняволенасць, упэўненасць.

Паглядзеўшы на твары людзей, на іх узаемаадносіны і стаўленне да наваколля, я ўспомніла старамодны сэнс рускага слова «предупредительность». А яшчэ ўспомніла пра свайго дзеда: самога пабачыць ужо не давялося, а сямейныя расказы пра ягоную шляхетнасць чула з маленства. Дык вось, аднаго разу дзядуля не пусціў сваіх дзяцей у кіно. Вярнуў з паўдарогі дадому толькі за тое, што, выйшаўшы за парог, яны сустрэлі сябрукоў і з нейкай прычыны зарагаталі. Смяяцца вульгарна гучна, ды яшчэ на вуліцы, лічылася непрыстойным, таму дзеці атрымалі суровы ўрок выхавання.

Ну, а тут, на чужой зямлі, суайчыннікаў, як правіла, можна было пазнаць лёгка і здаля менавіта дзякуючы жыццярадаснаму рогату і крыклівай гамонцы. Можа, нахабнасць ды шумлівасць замяняюць камусьці з іх пачуццё ўласнай годнасці, маскіруюць закамплексаванасць? Гэтаксама як захапленне вонкавым аблічам кампенсуе ўнутраную абмежаванасць або пуставатасць, замяняе клопат пра душу і духоўнасць?..

Не ідэалізую я ні тамтэйшых людзей, ні тым больш іхняе цяперашняе жыццё, у якім не ўсё ладна. Але не магу не захапіцца людзьмі, якія прыязджаюць адпачываць — і ўмеюць гэта рабіць, не раздражняючы іншых, і аддаюцца гэтаму цалкам, не замінаючы адпачываць тым, хто побач. Яны не зыркаюць зайздросным вокам па баках, не вылузваюцца са скуры, каб прадэманстраваць сярод белага дня вячэрні макіяж, залатыя бразготкі, дарагую сукенку. Яны не маскіруюцца, не фальшывяць, не хочуць здавацца лепшымі, чым ёсць ад прыроды, таму незалежна ад узросту, ад камплекцыі, ад фігуры апранаюцца як мага прасцей і зручней. Адпачываюць! Жыццю радуюцца, бліжняга свайго шануюць.

З далёкіх і блізкіх дарог

Святлана БЕРАСЦЕНЬ

УСЯГО ГАДЗІНА РОЗНІЦЫ...

Працяг. Пачатак у нумары за 14.09.90 г.

СЯРОД люду на шыафокскіх вуліцах вылучаліся хіба што модніцы-мадзьяркі, якія фарсілі скуранымі боцікамі — вузкімі, высокімі, зашнураванымі даверху, але з адкрытым носікам. Вылучаліся і цыганы.

Вечарам у цыганак пачыналася самая работа. Яны сноўдалі вакол рэстаранаў, пакуль не паказваўся хтось з афіцыянтаў і не прапускаў цыганку ў службовыя дзверы. Праз колькі часу яна вынырвала ўжо з параднага ўваходу і шмыгала да людзей на тэрасе. Цыганкі насілі невялікія свежыя ружы, згорнутыя ў характэрны тугі букецік. Часам падыходзілі і да нас, калі мы сядзелі купкаю ля гасцініцы. Выцягнуўшы некалькі ружачак з агульнага скрутку, цыганка звярталася да кагосьці з мужчын (аднаго разу прытупаў з кветкамі малы гадоў двух, маці ж назірала збоку, трымаючы ў руках ладны ахапак «таварў»). Вельмі хутка пераканаўшыся, што патрапіла, мабыць, на групу глуханямых, кабета шнуравала далей. Неяк, праўда, адбыўся і «дыялог» — гэта калі побач была Жужа і штосьці патлумачыла цыганцы. А мужчынам сказала: «Она хотела, чтобы вы купили дамам цветы, но я объяснила, что вы уже покупали».

Дарэчы, ад гіда я даведалася, што венгерскія цыганы жылі некалі кампактна ў прыгранічны, потым іх разагналі па ўсёй краіне. І вось займаюцца цяпер усялякім бізнесам, гандлююць, прынамсі, кветкамі, апошнім часам адкрываюць магазінчыкі. Жывуць вельмі заможна, лепей за іншыя нацыянальныя групы насельніцтва, сцвярджала Жужа. Колькасць цыганоў у Венгрыі расце, іх цяпер тут 25 працэнтаў ад усіх... Можна толькі здагадвацца, якія праблемы мела на ўвазе наша суразмоўніца, гаворачы, што і ў яе краі, на жаль, ёсць праблемы міжнацыянальных адносін.

Шматлікія рэстаранныя ансамблі музыкаў складаюцца, як правіла, таксама з цыганоў. Заробак у іх і тут добры.

Шпацыруючы па вечарах, мы нярэдка затрымліваліся каля каларытнага рэстаранчыка пад адкрытым небам — паслухаць ансамбль цыганоў. Наведнікі гаманілі, вячэралі, дыхалі вольным паветрам, запрашалі саліста сыграць ля свайго століка... Музыканцкі квартэт складалі дзве скрыпкі, спецыфічныя венгерскія цымбалы ды кантрабас. Смуглявыя хлопцы выглядалі эфектна ў сваіх яркіх кашулях — чырвонай, сіняй, бэзавай... Іграліздорава! Яшчэ ж выходзілі і танцоры ў мадзьярскіх строях. А то адным разам было: пачуўся перастук капытоў — пад'ехаў вазніца, прыпыніў коней насупраць рэстарана, павітаўся з музыкамі са свайго фурманскага ўзвышша, прыслухаўся... І давай гэтак артыстычна, прыгожа шчоўкаць пугаю ў такт!

Пад гукі «Чардаша» ды мадаўска-румынскага «Жаўранка» я намагалася ўспомніць, а ці ёсць хоць нешта падобнае да фальклорных рэстаранаў у нас на Беларусі? Праўда, абдзеленыя мы пагодлівым кліматам. Але праўда і тое, што каларытныя народныя полькі, кадрылі, беларускія вальсы і песні цудоўна гучаць не толькі на пленэры ці ў хаце, а і ў мураваных сценах.

Між іншым, музычная атмасфера Шыафока цудоўна суіснавала з цішынёй (адносная, вядома, бо нішто гэтак не трывожыла начную цішыню, як антымузыка машынных матораў і тармазоў). Нас не душылі рокам на ўвесь квартал, не прымушалі на пляжы слухаць які-небудзь шлягер. Для ўсіх разам гучалі, бадай, толькі царкоўныя званы.

Пашчасціла мне пачуць і харавыя спевы — гэта ўжо на паўвостраве Ціхань, дзе паўдня былі з экскурсіяй. Сама тая вандроўка на паўночны бераг Балатона пакінула ў памяці мноства маляўнічых дэталяў: краявіды прыазёрнага гарадка, кірмаш рамёстваў, незвычайная чырвоная глеба пад зялёнымі карункамі вінаграднікаў.

Асаблівае ўражанне — царква XVIII стагоддзя, пабудаваная ў знак выгнання рымлянаў. Мы патрапілі туды на нядзельную службу. Да алтара вялі высокія прыступкі, і шматлікія прыхаджане пазіралі міжволі знізу ўверх. Маліліся ды спявалі ўсе: старыя, маладыя, падлеткі. Здавалася б, усё, як у касцёле, але ж не: пяянне было надта своеасаблівае, самабытнае, у духу народных венгерскіх мелодый. Тыя ж лада-інтанацыйныя асаблівасці, тая ж рытміка — сінкопы.

Вось дык мудры народ — мадзьяры! Ставяць храм у гонар выгнання рымлянаў — і ганарацца захаванымі рэшткамі рымскіх збудаванняў; моляцца ў тым храме паводле рымска-каталіцкага абраду — і малітвы пяюць на матывы сваіх песень...

ЛЕДЗЬ не забылася расказаць пра тое месца, дзе музыка гучала для нас штодня: рэстаран. Пад акампанемент просценькага электронна-клавішнага інструмента праходзілі нашы вячэры. Гучала не абы-што: мелодыі з аперэт І. Кальмана, тэмы з інструментальных твораў І.-С. Баха ды В. Моцарта, з балетаў П. Чайкоўскага і... з папулярнага савецкага пасляваеннага песеннага рэпертуару. Да ўсяго высветлілася, што пажылы музыкант, які граў для нас, умеў і сёе-тое гаварыць па-руску. Таму што пабываў калісьці ў савецкім палоне...

Рэстаран, дзе мы харчаваліся тройчы на дзень, быў зусім побач з атэлем. Меню за ўсе дні не паўтарылася, хоць, відавочна, давялося кухарам пакруціцца: сёння прадукты ў Венгрыі, асабліва ў курортнай зоне, дарагія. Мо таму замест свежай садавіны-гародніны давалі нам, за малым выключэннем, кансерваванае ды размарожанае, замест кавы — сурагат, замест кампотаў ці мінералкі — запацелы шкляны збан водаправоднай вадкасці, араматызаванай хлоркаю. Сусед па століку загадку прыдумаў: што, маўляў, ён зробіць, як вернецца дадому? Ніхто не адгадаў. А ён, аказваецца, уяўляў сабе, як дастане з халадзільніка бляшанку тушонкі, вываліць разам з тлушчам на талерку, адкрые кран, спусціць крыху ваду, каб халаднейшая пайшла, налье сабе шклянку і будзе ласавацца па-еўрапейску! Балазе, наша вада таксама з хлоркай...

Але тым не менш, ад ежы сусед не „адмаўляўся і на якасць яе не скардзіўся. Усё было смачна, пікантныя прыправы, чарадзейныя соусы з перцам-папрыкай падаграваді апетыт. Далікатная салямі, добры сыр, хрумсткія роглікі, мяккае марожанае, нятлустая сакавітая свініна, духмяны рыс, рассыпістая фасоль, крамяныя шампіньёны, экзатычныя птушыныя вантробкі, свойскі булён з клёцкамі... Лепш адзін раз пакаштаваць!

Цікава, што ў нашай групе была і вегетарыянка, але яна, здаецца, таксама не наракала на меню. І ў Шыафоку, і ў Будапешце, і ў падарожных рэстаранах атрымлівала вегетарыянскі абед: афіцыянта папярэджвалі, ён стараўся дагадзіць кліентцы — і ніякіх пытанняў. Уяўляю сабе аналагічную сітуацыю ва ўмовах роднага грамхарчу...

З МІНСКА мы ад'язджалі ў разгар сесіі Вярхоўнага Савета БССР, нашпігаваныя апошнімі грамадска-палітычнымі навінамі. Львоў яшчэ й паддаў самай рознай спажывы мыслівым людзям. Здавалася, што Венгрыя ўжо як ніхто «накормліць» савецкіх журналістаў уражаннямі ад свежых палітычных падзей — ва ўсякім разе, цікавай інфармацыяй... Дарма здавалася. Бо палітыка ў зоне адпачынку — моветон! Хаця... На кожную дробязь нашага загранічнага побыту, як бы тут больш мудрагеліста мовіць, — пападаў водбліск вялікага палітычнага жыцця.

А іначай што значыць мода на савецкую сімволіку, калі ў парках, у турысцкіх цэнтрах прадаецца ўсё: ад акцябрацкіх зорачак да мініяцюрнага бюста Леніна, ад гарэлкі пад новаю «перабудовачнай» мянушкай да маек з перабудовачнымі клішэ на грудзях? Што значыць, трохколерны германскі сцяг, пачэплены да пляжнага тэнта, пад якім уладкаваліся ціхмяныя маладыя немцы? А «вуснапалітычны» гумар нашай групы, якая б скукожылася без свежаспечанага парламенцкага фальклору, тыпу «прашу прасесці» ды «уключыце шастой мікрафон»? Нарэшце, гэты дзіўны гасцінічны радыёпрыёмнік, які штодня вымушаў слухаць толькі Венгрыю ды Чэха-Славакію і раптам прынёс на сваёй хвалі «Свабоду»? Станцыя перадала навіны з жыцця народных дэпутатаў СССР, паведаміла пра летнія маршруты высокапастаўленых асоб і загаварыла пра «ўсюдыісных польскіх гандляроў», чые таварныя аперацыі ўсё больш трывожаць краіны Еўропы. Аказваецца, нават у Вене прывезеныя польскімі грамадзянамі савецкія прасы дэстабілізуюць унутраны рынак. І Еўропа, маўляў, са страхам пытаецца: «А што будзе, калі гэтаксама і рускія пойдуць?»

Вось ён, корань палітыкі: эканоміка, рынак! І гэта ўжо не жартоўная выснова. Бо калі глядзець на Венгрыю як на адну з першых дзяржаў колішняй сацыялістычнай садружнасці, што рэальна звярнулася да рынкавай сістэмы гаспадарання, дык можна заўважыць і галоўную «дзейную асобу» сённяшняй венгерскай палітычнай сцэны. Гэта ... форынт.

(Працяг будзе).

Музыка, грай!

Знакі часу?

На тэму дня

АБЫЯКАВАСЦЬ

Гэтыя думкі прыходзяць да мяне ўсё часцей. Прыходзяць на аснове пастаянных назіранняў, прытым не проста выпадковых, а ўсё больш спакойна аналітычных.

Мы ўжо прывыклі да стэрэатыпнага меркавання, што ўсе недахопы ў развіцці культурных працэсаў нараджаюцца ад няўвагі да іх з боку начальнікаў-чыноўнікаў. Маўляў, на гэтую галіну ў нас выдзяляецца мізэр дзяржаўнага бюджэту, развіццём нацыянальнай культуры ніхто не займаецца, яна пушчана на самацёк...

З першым пасылам ніхто спрачацца не будзе, а вось з другім цяжка пагадзіцца. Я ведаю ў Беларусі дзесяткі карпатлівых працаўнікоў, якія з апошніх сіл аддаюць сябе культуры. І ведаеце, на каго яны часцяком крыўдуюць? На нас з вамі.

Давайце прызнаемся, што колькасць культурных мерапрыемстваў у нас за апошнія гады рэзка ўзрасла, і, што важна, ладзяцца яны па-сапраўднаму сур'ёзна. Сёлета толькі за паўгода адбыліся вечарыны аўтэнтычнага фальклору і І Рэспубліканскі фестываль беларускага народнага танца, шырокія рэспубліканскія выставы ганчарства і музычных інструментаў, свята духавой музыкі... Як кажуць, дай Бог нам гэта ўсё спажыць.

Дык вось, тыя, хто прымаў непасрэдны ўдзел у арганізацыі гэтых мерапрыемстваў, крыўдуюць... на нас з вамі — звычайных гледачоў. Мы ого-го як на словах любім сваю нацыянальную культуру, калі паслухаць нас з трыбун, а што на самай справе? А на справе мы абыякавыя да сваёй роднай і знявечанай культуры. Перабольшваю? Вось вам факты, а яны, кажуць,—рэч упартая.

Мінулай зімой сенсацыяй па Мінску пракацілася чутка: у Доме літаратара праходзяць вечарыны аўтэнтычнага фальклору ўсіх абласцей рэспублікі. Але адбылося дзіва: зала пастаянна была не запоўненай, і каб яшчэ не заглядалі людзі, так сказаць, па абавязку — студэнты інстытута культуры і філфака універсітэта, вучоныя-фалькларысты... Няцяжка ўявіць, перад якой пустой залай паказвалі б сваё майстэрства бабулі і дзядулі, што прыехалі да нас за сотні кіламетраў.

Непаўторны рэспубліканскі фестываль духавой музыкі, які праводзіўся ў парку імя М. Горкага беларускай сталіцы, таксама праходзіў пры пустых лаўках, пад пошум ветру ў вяршалінах старых ліп.

Прывяду яшчэ некаторыя факты. «ЛіМ» пісаў пра беларускі «Гэлап» — службу вывучэння грамадскай думкі, што на пачатку гэтага года створана пры РНМЦ культуры. Гэта фірма на аснове апытання можа даць адказы на самыя набалелыя пытанні: адносіны людзей да роднай мовы і літаратуры, БНФ, нацыянальна-дэмакратычнай партыі, нацыянальнай сімволікі і нацыянальных меншасцяў... Мы пісалі, што асноўныя праблемы для «беларускага Гэлапа» — фінансавыя, бо арганізацыя гаспадарча-разліковая, і спадзяваліся, што цікавасць да яе работы праявяць, а гэта значыць, і дапамогуць найперш нашы творчыя саюзы і аб'яднанні. «Хто падтрымае «беларускую службу Гэлапа»? Гэтым пытаннем заканчвалася наша публікацыя. І што? Не азваўся ніхто! Аказалася, служба такая ў рэспубліцы нікога не цікавіць...

У мінскім парку імя М. Горкага з 1984 года стаяць маляўнічыя драўляныя фігуры вядомага народнага майстра М. Ерафеева, ад майстэрства якога наведнікі ў захапленні. Але скульптуры пачалі гніць, і пра гэта з болем гаварыў у сваім артыкуле на старонках «Вячэрняга Мінска» дырэктар парку І. Яновіч, задаваў пытанне: хто дапаможа ці параіць, як захаваць скульптуры?

— Думаў закідаюць мінчане мяне пісьмамі, — гаворыць І. Яновіч, — не адаб'юся ад іх. А — не атрымаў ані воднай паштоўкі...

У апошні дзень Свята славянскага пісьменства і культуры ва ўрачыстасцях у Вязынцы бралі ўдзел аўтарытэтныя нашы калектывы. І, будучы там, я з горкім сумам зрабіў для сябе вывад, што не славутыя канцэртныя калектывы цікавяць сёння людзей, што за канцэртам сочыць толькі пятая частка іх, астатнія робяць круізы каля ларкоў і павільёнаў.

У дзень адкрыцця ў Мінску мемарыяльнай дошкі ў гонар Кірылы і Мяфодзія на вуліцы Бакуніна таксама давялося назіраць тужлівы малюнак. На перасячэнні Ленінскага праспекта і вуліцы Леніна стаялі купкамі маладыя прыгожыя дзяўчаткі ў доўгіх расквечаных спадніцах і яркіх блузках, з вяночкамі на галовах. Здавалася, ніхто не пройдзе міма іх, абавязкова прыпыніцца. Праспект віраваў, але — людзі пішчом плішчыліся ў ГУМ, а на нашых дзяўчатак азіраліся ледзь не зласлівa: маўляў, стаяць тут, замінаюць...

Да згаданых Дзён славянскага пісьменства рэдакцыя газеты «Звязда» надрукавала арыгінальны і змястоўны спецвыпуск «Слова». Кошт выдання невялікі — адзін рубель, і тыраж для рэспублікі, улічваючы маштабнасць свята і колькасць гасцей, нязначны — усяго 50 тысяч. Здавалася, яго расхопяць імгненна. Але ўжо ці не трэці месяц цікавы і маляўнічы спецвыпуск марнее ў кіёсках «Саюздруку».

— Паступіла ў продаж 600 штук, недзе 150 прадалі, 100 спісалі, астатнія ляжаць мёртвым грузам,—сказала мне прадаўшчыца кіёска «Саюздруку», што ў падземным пераходзе на плошчы Леніна ў Мінску.—Не ведаю, што і рабіць...

Што з намі адбываецца? Чаму душа наша так апусцела? Ды гэта ўжо другая тэма. А пакуль што... Паназірайце за нашымі культурнымі буднямі. Ці не пужае вас гэтая абыякавасць? Што з намі будзе заўтра?

Вячаслаў ЛАПЦІК.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Пятру Шасцерыкову з прычыны напаткаўшага яго горa — смерці брата МІХАІЛА.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Рыгору Яўсееву з прычыны напаткаўшага яго горa — смерці брата ПЯТРА.

Саюз пісьменнікаў БССР выказвае глыбокае спачуванне пісьменніку Леаніду Шырыну з прычыны напаткаўшага яго горa — смерці МАЦІ.

Лёс помніка архітэктуры

«Дрэмле памятка дзён...»

«Нельга без болю глядзець на архітэктурны помнік першай палавіны мінулага стагоддзя ў г.Косава Івацэвіцкага раёна. Палац значна пашкоджаны. Як добра было б аднавіць яго, нешта падбудаваць і адрамантаваць ды стварыць, скажам, музей»... У апошні час падобныя пісьмы, адрасаваныя ў Івацэвіцкі райвыканком і Брэсцкі аблвыканком, сталі паступаць асабліва часта. Зразумела цікаўнасць людзей да аднаго з помнікаў нашай гісторыі, іх заклапочанасць яго лёсам...

Ён і сёння ўражвае сваёй велічнасцю і строгасцю архітэктуры. Так і здаецца, што вось-вось пачуецца цокат падкоў, іржанне коней і цяжка праімчыць міма атрад рыцараў у даспехах сярэднявякоўя. Але яны, гэтыя сцены, ніколі не бачылі крыжакоў, не чулі звону рыцарскіх мячоў. Усяго паўтары сотні гадоў велічнаму гмаху, узведзенаму ў псеўдагатычным стылі па праекце члена Пецярбургскай Акадэміі мастацтваў Марконі. Атрымаў ён заказ зрабіць праект будучага палаца ад буйнога землеўладальніка Пуслоўскага ў другой чвэрці XIX стагоддзя.

Вырас палац на ўзвышшы, ля падножжа якога былі прыгожыя азёры. Яшчэ і сёння старажылы помняць, як пяшчотнічалі на сонцы тут ружы і цюльпаны, як шумелі лістотай рэдкія пароды дрэў, завезеныя з Італіі і Амерыкі, Бліжняга Усходу. Непаўторнае афармленне мелі шматлікія пакоі, у якіх захоўваліся рэдкія кнігі і старажытныя рукапісы.

Распарадзіўся граф абнесці частку палаца і парку трохметровай каменнай сцяной. Хутка гаспадары абанкруціліся, і тады палац пачаў пераходзіць з рук у рукі. У гады першай сусветнай вайны палац абрабавалі, а праз тры дзесяцігоддзі ён згарэў. Доўга з'ядаў агонь унікальнае аздабленне пакояў, мэблю, кветкі і дрэвы.

Сёння, гледзячы на будынак, кампазіцыя якога ўласціва класіцызму, на зубчастыя завяршэнні шматгранных высокіх вежаў, зробленых у стылі гатычнай старадаўнасці, на ўсе гэтыя рэшткі, якія і цяпер уражваюць сваімі памерамі і экзотыкай дэкаратыўных элементаў, міжволі думаеш пра тое, які б помнік мелі мы, каб у 44-м не было дапушчана вандалізму. Даводзіцца толькі шкадаваць, што здарылася гэта перад самым вызваленнем раёна, у маі 1944 года, ужо тады, калі нямецка-фашысцкія акупанты, не вытрымаўшы націску нашых войск, рыхтаваліся пакінуць Косава...

Неабходна зрабіць усё, каб Косаўскі палац паслужыў яшчэ не толькі сённяшняму, але і будучым пакаленням беларусаў,— такі лейтматыў у згаданых пісьмах. На працягу апошняга дзесяцігоддзя ішлі размовы пра аднаўленчыя работы, але не знаходзілася смельчака, які б рызыкнуў фінансаваць іх. Ды свет, як кажуць, не без добрых людзей. Відаць, шмат перадумаў пра лёс палаца старшыня калгаса імя Суворава, а цяпер кіраўнік калгаса-аграфірмы «Беларусь» Уладзімір Міхайлавіч Рымша, які, нягледзячы на шмат якія гаспадарскія клопаты, рашыўся.

Трымаю ў руках незвычайны дакумент. Гэта дагавор, па якім Беларускае спецыялізаванае навукова-рэстаўрацыйнае вытворчае аб'яднанне «Белрэстаўрацыя» Міністэрства культуры БССР абавязуецца выканаць праектна-даследныя работы, а калгас-аграфірма «Беларусь» аплаціць кошт выкананых работ у адпаведнасці з прыкладзеным каштарысам. Тут жа ўказваецца сума — 60754 рублі...

Галоўны архітэктар Брэсцкіх майстэрань Інстытута «Белспецпраектрэстаўрацыя» Уладзімір Казакоў размову з намі пачаў з ухвалення высокага прафесійнага майстэрства тых, хто паўтара стагоддзя назад узводзіў палац у Косаве, адзначыў выдатную якасць работы як муляраў, так і тынкоўшчыкаў. Затым ён паведаміў, што група архітэктараў прыступіла да комплексных навуковых даследаванняў. Вывучаецца архітэктура, вышукваюцца крыніцы, якія падкажуць тую абстаноўку, што існавала ў палацы да знішчэння.

— Такіх дакументаў у нас — кот наплакаў: некалькі здымкаў ды паштовак,— гаворыць У. Казакоў. — Гэтага мала, каб вярнуць помніку былую прыгажосць. Будзем звяртацца да польскіх улад, у прыватнасці, кіраўнік групы гісторыкаў С. Адамовіч збіраецца паехаць у Кракаў, каб знайсці нешта ў архівах. Мы звяртаемся да ўсіх тых, хто хоць што-небудзь захаваў з матэрыялаў па гісторыі палаца, яго афармлення, хто помніць, як ён выглядаў знешне і знутры. Гэта дапаможа нам зрабіць палац такім, якім ён быў.

«Будынак жа даволі загадкавы, шмат у ім цікавага»,— з такімі словамі архітэктар спыняецца ў невялікім памяшканні і пляскае ў далоні. Гук падхопліваюць сцены. Уладзімір Нахімавіч ударае па сцяне рукою — і зноў у памяшканні нібы ажывае камертон.

Рэстаўратары выказалі здзіўленне вентыляцыяй былога палаца, якая служыла некалі, па іх вызначэнні, адначасова як для праветрывання, так і для абагрэву пакояў. Паказалі пакоі паміж першым і другім паверхамі, якія размешчаны па абодва бакі фасаду, але чамусьці маюць усяго адзін уваход.

— Яшчэ б гадоў дзесяць прайшло і ўжо ніхто не змог бы дапамагчы палацу,— гаворыць У. Казакоў. — Разбураецца цэгла, лушчыцца тынкоўка... Вельмі важна, хто пасля гатовага праекта возьмецца за работу. Добра, калі ў дапамогу будаўнікам-рэстаўратарам будзе падключана якая-небудзь падрадная арганізацыя. А яшчэ лепш, калі б знайшліся выканаўцы з-за мяжы, якія б зрабілі ўсё і хутчэй, і больш якасна.

М. РЫМАЧ.

г. п. Івацэвічы.



Фасадны бок палаца.

Фота М. ГАРМАША.

НА ЭКРАНЕ БЛАКІТНЫМ

З 24 ПА 30 ВЕРАСНЯ

25 верасня. 21.00

СПАДЧЫНА

Размова пойдзе пра «белыя плямы» ў гісторыі Беларусі.

26 верасня. 21.15

ТЭАТР І ЧАС

Парыжскі тэатр «Лабрадор» у Мінску.

Спектакль французскай трупы пастаўлены па дакументальнай прозе П. Сіхроўскага «Нарадзіцца вінаватым — нарадзіцца ахвярай» па інтэрв'ю дзяцей нацыстаў і дзяцей іх ахвяр—яўрэяў.

Размову з рэжысёрам-пастаноўшчыкам Стэфаніяй Лоік і акцёрамі вядзе журналіст Мая Гарэцкая.

28 верасня. 18.00

ПАКАЗВАЕ ГРОДНА

На прынёманскіх прасторах.

Літаратурна-мастацкі часопіс.

Гледачы пазнаёмяцца з самадзейным паэтам Я. Мацвеевым з Наваельні, са спявачкай з вёскі Ахонава Н. Бурак і пабываюць на вялікім свяце «Дзятлаўскае падвор'е», якое было запісана ва ўрочышчы Рыбакі.

29 верасня. 13.15

ПОЛАЦКІ КАЛЕЙДАСКОП

Да 500-годдзя Ф. Скарыны.

У перадачы бяруць удзел філолаг з Лондана Джэймс Дзінглі, нашчадак Ф. Скарыны Стэнлі Скарына з Канады, беларускія пісьменнікі. Гледачы стануць удзельнікамі літургіі ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры.

29 верасня. 16.50

ЛІТАРАТУРНАЯ БЕЛАРУСЬ

Развагі аб этычных праблемах творчасці, палеміка наконт сучаснага літаратурнага працэсу і грамадска-палітычнай сітуацыі ў рэспубліцы.

Свае новыя вершы прачытае народны паэт Беларусі П. Панчанка.

30 верасня. 19.35

У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ

Вобраз Ф. Скарыны — асветніка і першадрукара славянскіх народаў у выяўленчым мастацтве Беларусі — тэма чарговага выпуску тэлечасопіса. Перадача пазнаёміць з выстаўкай беларускіх мастакоў, прысвечанай юбілею знакамітага суайчынніка. Прагучаць вершы Ф. Скарыны.

30 верасня. 23.25

СТУДЫЯ «РЭЙ»

Дзяржаўны канцэртны аркестр Беларусі запрашае.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА, Уладзімір ЯГОЎДЗІК — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы: Вячаслаў ЛАПЦІК — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62; бухгалтэрыя — 23-73-37.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Намеснік галоўнага рэдактара Мікола ГІЛЬ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Анатоль ВЯРЦІНСКІ, Уладзімір ГІЛЕП, Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.